ДУК «Шаркаўшчынская ЦБС»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Гісторыя арганізацый і прадпрыемстваў г.п. Шаркаўшчына

## *Уводзіны*

*Шаркаўшчынскі раён – адміністрацыйная адзінка ў складзе Віцебскай вобласці. Размешчаны ў паўночна-заходняй частцы Віцебскай вобласці. Мяжуе з Браслаўскім, Міёрскім, Глыбоцкім і Пастаўскім раёнамі.*

*Утвораны 15 студзеня 1940 года. У 1962 годзе быў рэарганізаваны, у 1966 – адноўлены. Раённы цэнтр – гарадскі пасёлак Шаркаўшчына, размешчаны за 210 км ад Віцебска і 195 км ад Мінска. Працягласць тэрыторыі з захаду на ўсход 60 км, з поўдня на поўнач – 30 км.*

*Шаркаўшчынскі раён – сельскагаспадарчы раён. На тэрыторыі раёна маецца шэраг арганізацый і прадпрыемстваў, якія ствараюць добрыя ўмовы для жыццядзейнасці жыхароў раёна.*

*Прамысловасць раёна прадстаўлена УКП ЖКГ Шаркаўшчынскага раёна, асноўным відам дзейнасці якой з'яўляецца цеплаэнергетыка. Акрамя таго, на тэрыторыі раёна маецца філіял "Шаркаўшчынскі кансервавы завод ПУП "Полацкая універсальная база", які выпускае віно палепшанай якасці, мясныя кансервы, кандытарскія вырабы, белабулачныя вырабы, паўфабрыкаты, мяса.*

*Раён вядзе актыўную знешнеэканамічную дзейнасць. ПТУП "Камплект-М" вырабляе і пастаўляе паддоны драўляныя, вечкі да паддонаў у Літву і Нямеччыну. ПТУП "Аіда" аказвае транспартныя паслугі. УАЗ "Шаркаўшчынская цэнтральная раённая бальніца" ажыццяўляе экспарт медыцынскіх паслуг. Індывідуальныя прадпрымальнікі пастаўляюць на экспарт прадукцыю дрэваапрацоўкі. УП "Брызант-рэсурсы" пастаўляе на экспарт мінеральныя глебагрунты.*

*Матэрыял аб гісторыі ўтварэння арганізацый і прадпрыемстваў будзе карысным для работнікаў установаў культуры, настаўнікаў, вучняў пры правядзенні краязнаўчых мерапрыемстваў у арганізацыях і ўстановах.*

# Аптэкі раёна

У аптэчную сетку раёна ўваходзяць тры сельскія аптэкі ў аграгарадках Іёды, Германавічы і Лужкі, цэнтральная аптэка №102 г.п. Шаркаўшчына і 20 аптэчных пунктаў.



Аптэка ў г.п. Шаркаўшчына была адкрыта ў 1936 годзе і да гэтага часу знаходзіцца па адрасу: перавулак Народны, дом 6.



З 2004 года і па сённяшні дзень загадвае аптэкай Свілёнак Наталля Раманаўна, якая закончыла ў 1992 годзе медыцынскі ўніверсітэт і па размеркаванню была накіравана ў Шаркаўшчыну.

Іншай прафесіі я для сябе і не ўяўляю, – кажа Н.Р. Свілёнак. – Атрымліваю задавальненне ад працы, задавальненне ад таго, што мая работа і дзейнасць усяго калектыву накіравана на лячэнне людзей, выратаванне іх жыцця. У вольны ж час, каб крыху адхіліцца ад некаторых праблем, люблю на ўласнай машыне не спяшаючыся праехаць па аўтатрасе, развеяць сумны настрой. Апошнія пяць год, як чалавек веруючы, са сваімі сябрамі мы здзяйсняем паломніцтвы па святых месцах нашай рэспублікі, пабывалі ва Украіне, еўрапейскай частцы Расіі і Сібіры. Вось і зараз чакаю чарговага водпуску, каб адправіцца ў падарожжа, пабачыць хараство і веліч праваслаўных храмаў, манастыроў, цэркваў, дакрануцца рукой і сэрцам да святых, намоленых месц. Такое захапленне цалкам разумеюць муж Сяргей Фёдаравіч і сыны Аляксей з Андрэем. Яны ж з вялікім нецярпеннем чакаюць майго вяртання дадому, бо разам мы – шчаслівая і дружная сям’я.

У 2003 годзе ў аптэцы быў зроблены капітальны рамонт. Рэканструкцыя аптэкі вялася з выкарыстаннем сучасных будаўнічых матэрыялаў і па сучаснай тэхналогіі. Зараз у аптэцы ўстаноўлена сучаснае аптэчнае абсталяванне.Усе лекавыя прэпараты раскладзены на паліцах па фармакалагічных групах. На бачным месцы размешчаны стэнд, дзе знаходзяцца лекі, якія выпускаюць айчынныя прадпрыемствы. У аптэцы можна набыць касметычна-парфумерныя сродкі, лекавыя травы, прадметы догляду за хворымі, дзіцячы асартымент, оптыку.



У цэнтральнай аптэцы № 102 першай катэгорыі Шаркаўшчынскага раёна працуюць прафесіяналы сваёй справы, жанчыны, якія заўсёды сустрэнуць вас з усмешкай.

Сярод іх – маладая, актыўная і спагадлівая да чужога гора Анна Райкевіч.

– Родам я з Германавіч, — расказвае пра сябе дзяўчына. — З 10 класа вучылася ў Лужаснянскай гімназіі для здольных і таленавітых дзяцей з сельскай мясцовасці Віцебскай вобласці. Пасля яе заканчэння паступіла ў Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт на фармацэўтычны факультэт. Выбар мой звязаны з тым, што яшчэ ў школе любіла ўрокі хіміі і біялогіі. У Шаркаўшчыне працую з 2013 года, і мне мая праца падабаецца. Сярод плюсаў дастойны заробак, сяброўская атмасфера ў калектыве, дзе мне заўсёды дапамогуць, падкажуць. За гэта я ўсім вельмі ўдзячна, асабліва загадчыцы нашай аптэкі Наталлі Раманаўне Свіленак за дапамогу, парады і падтрымку. Пачаўшы працаваць, зразумела, што вучоба – гэта адно, а на практыцы многае па-іншаму.

Лічу, што ў нашай працы важнымі якасцямі з'яўляюцца ўменне знаходзіць кантакт з людзьмі, ветлівасць, акуратнасць, адказнасць, а таксама нам трэба многа чаго памятаць.

З маленства ўсім сэрцам любіла музыку, таму скончыла музычную школу па класе скрыпка. Зараз у вольны ад працы час чытаю, вышываю бісерам, люблю італьянскую кухню, асабліва выпечку. Ёй не рэдка частую сваіх калег па працы.

– Наша Анна — святло ў акенцы, — характарызуе яе бухгалтар Марына Уладзіміраўна Странчэўская. — У нашым калектыве яе любяць і паважаюць. Бо яна ў нас добрая, разумная, вясёлая і проста прыгожая дзяўчына. Акрамя сваіх непасрэдных абавязкаў, яна займаецца ў нас прафсаюзнымі справамі, адказна выконвае розныя даручэнні. Гэтай добрай дзяўчыне мы жадаем аднаго – шчасця і здароўя.

Наведвальнікам аптэкі заўсёды дапамогуць вопытныя правізары: Барадзіна Ларыса Алегаўна, Бацвінёнак Святлана Мікалаеўна, Булкіна Жана Мікалаеўна.



У штат аптэкі ўваходзіць 15 чалавек.




Улічваючы малую плошчу аптэкі і вялікі наплыў наведвальнікаў, было вырашана адкрыць у 2013 годзе ў Шаркаўшчыне яшчэ адну аптэку. Размясцілася яна на першым паверсе стаматалагічнай паліклінікі. У ёй даволі поўны асартымент лекаў, які папаўняецца на працягу тыдня.

Абсталявала кропку Віцебскае ўнітарнае прадпрыемства “Фармацыя”. Гэта трэцяя па ліку дзяржаўная аптэка ў Шаркаўшчыне і шостая – у раёне.




У 2015 годзе будынак быў закрыты на правядзенне рамонтных работ. Для задавальнення патрэб насельніцтва памяшканне аптэкі вырашана было адкрыць у будынку камбіната бытавога абслугоўвання.

У кароткія тэрміны ў фае КБА зманціравалі і абсталявалі зручнае памяшканне аптэкі № 325 пятай катэгорыі.



Яе загадчыцай цяпер працуе Таццяна Падоба.

На ўрачыстым адкрыцці аптэкі прысутнічалі старшыня райвыканкама Мікалай Ірынархавіч Баговіч, старшыня раённага Савета дэпутатаў Уладзімір Серафімавіч Шпец, намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Дзіслававіч Далецкі, загадчыца цэнтральнай аптэкі № 102 Наталля Раманаўна Свілёнак і дырэктар КБА Вольга Аляксандраўна Далецкая. Пасля сімвалічнага пераразання чырвонай стужкі яны азнаёміліся з асартыментам лекаў, якія маюцца тут для патрэб насельніцтва.

Кіраўніцтва раёна падкрэсліла, што ў дадзенай аптэцы створаны належныя ўмовы як для загадчыцы, так і для пакупнікоў. У параўнанні з былой аптэкай, якая размяшчалася ў старой паліклініцы, тут пашырылася агульная плошча, больш чым ў два разы павялічана гандлёвая зала. Павялічыліся і вітрыны, на якіх размешчаны не толькі лекі, а і сродкі асабістай гігіены, касметыка.

– У нашых аптэках, у тым ліку і ў гэтай, маецца камп’ютарнае праграмнае забеспячэнне “Беларуская аптэка”, — кажа нам загадчыца цэнтральнай аптэкі № 102 Наталля Раманаўна Свілёнак. — Яго сэнс заключаецца ў тым, што цяпер любыя лекі, якія маюцца ў наяўнасці, заносяцца ў камп’ютарную базу. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе без прамаруджвання адшукаць патрэбныя, каб не марнаваць час загадчыцы і пакупніку. Дарэчы, гэта праграмнае забеспячэнне з’явілася ў нас у першых сярод райцэнтраў Віцебшчыны.

**Ветэраны аптэчнай службы Шаркаўшчынскага раёна**:

Юшкевіч Ганна Сяргееўна, загадвала аптэкай з 1975 г. па 1996 г.
Нітава Эмілія Пятроўна
Кухальская Тамара Іванаўна
Овінава Ірына Іванаўна
Горава Ганна Усцінаўна
Цітовіч Людміла Аляксееўна
Садоўская Таіса Янаўна
Курушка Тамара Мікалаеўна

**Спіс літаратуры**

1. Ананіч, А.  Малады сучаснік: фармацэўт цэнтральнай аптэка № 102 Анна Райкевіч / А. Ананіч // Кліч Радзімы. – 2015. – 22 крас. (№ 21). – С.3.

2. Барадзіна, Л. Больш утульнай стала аптэка / Л. Барадзіна // Кліч Радзімы. – 2003. – 15 кастрычніка (№ 81). – С.4.

3. Райчонак, С. Чалавек і яго справа: загадчыца цэнтральнай аптэкі № 102  / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2014. – 31 студзеня (№ 4). – С.2.

4. Райчонак, С. У Шаркаўшчыне адкрылі новую аптэку  / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2016. – 29 кастрычніка (№ 82). – С.1.

# ГУ «Шарковщинский районный архив»

Сотрудники белорусских государственных архивов отмечают свой профессиональный праздник 6 октября. Накануне этой даты мы поговорили с директором районного архива Татьяной Владимировной Тонконог:

В 1999 году в Шарковщине с целью обеспечения сохранности документов субъектов хозяйствования, которые обеспечивали соблюдение социально-экономических прав граждан, был создан районный архив по личному составу. Ежедневно нам приходится решать разнообразные задачи, среди которых – собрать и сохранить документы по истории Шарковщины и района, трудовые истории граждан, помочь им в поиске необходимой информации.



В районном архиве внедрена в практику работа с обращениями граждан заявительного принципа «одно окно», упрощена процедура оформления архивных справок, получения иных документов, создан удобный график работы. Обратившимся даются консультации, оказывается помощь в составлении заявлений. Основные вопросы, интересующие граждан при обращении в архив, касаются подтверждения трудового стажа и размера заработной платы. От квалифицированного исполнения запросов социально-правового характера зависят судьбы конкретных людей. В работе мне помогает ведущий архивист с шестнадцатилетним стажем Валентина Петровна Гайдель. В преддверии праздника поздравляю своих коллег, профессионалов архивного дела, желаю здоровья, благополучия и успехов в нужном обществу труде.



**Список литературы**

1. Ананич, А. День архивиста / А. Ананич // Кліч Радзімы. – 2017. – 6 сентября (№ 71). – С. 2.

## РКЦ №4 в г.п. Шарковщина отделения ОАО «Белагропромбанк» г.Глубокое




После образования в 1967 году и по 1977 год отделение банка, именуемое в то время как “Шарковщинское отделение Госбанка”, находилось в деревянном здании, расположенном по улице 17 Сентября. Коллектив отделения, состоящий из 27 человек, возглавлял Барбачёв Г.П. Можно сказать, что именно отсюда начинается как история отделения, так и трудовая деятельность коллектива Банка в Шарковщине.





В 1976 году под руководством Римко Е.С. началось строительство нового двухэтажного здания отделения Госбанка по ул. Маяковского, 6.

Здание введено в эксплуатацию в 1977 году. Переезд в новое здание осуществлён 1 августа 1977 года. В отделении в то время работало 27 человек, 1 специалист с высшим образованием.





Коллектив отделения работал молодой, в основном женский, 72% в возрасте до 30-ти лет.

С февраля месяца 1981 года коллектив возглавил Селицкий Иван Иосифович, работал управляющим по октябрь 2000 года.



В восьмидесятые годы большое внимание уделялось наглядной агитации. В целях освещения актуальных вопросов в области денежного обращения, кредитования и финансирования, организации экономической учебы, социального соревнования в отделении было изготовлено и оформлено 20 стендов наглядной пропаганды, которые систематически обновлялись цифровой информацией.

Итоги соцсоревнования между коллективами Шарковщинского и Браславского отделений Госбанка, стенды «Ветеран труда», «Ударники коммунистического труда», «Лучшие по профессии». Газета «Госбанковец», «Комсомольский прожектор» – всегда освещали работу и жизнь отделения.

В коллективе на протяжении многих лет поддерживался интерес к движению за коммунистическое отношение к труду. Так как звание «Ударник коммунистического труда», обязывало трудиться еще лучше и увлекать за собой своих товарищей.

Соревнованее за звание «Лучший по профессии» завоевало большой авторитет. Соревнование по профессии вызывало творческую активность, чувство гордости за свою профессию, за свой коллектив.

В 1985 году звание «Лучший по профессии» присвоено главному бухгалтеру Язмер Софии Рафаиловне. Она систематически выполняла соцобязательства. Являлась Ударником коммунистического труда.



С целью повышения морально-нравственного уровня работников в отделении ежемесячно выпускалась стенная газета «Госбанковец».

В стенной печати отражалась жизнь и дела коллектива, выполнение социалистических обязательств и другие вопросы.

В 1984 году выпущено 13 номеров стенной газеты и 5 «Молний». Каждый номер стенной газеты выпускался под определённым девизом – «Банк и выполнение продовольственной программы», «Ритм четвертого года пятилетки», «Планете – чистое небо», «Итоги радуют и вдохновляют» и другие. На протяжении трех лет редактором стенгазеты являлась экономист кредитного отдела Курилович В.И.







Широкое развитие в коллективе получило соцсоревнование за успешное выполнение задач, стоящих перед системой Госбанка в свете требований XXVI съезда партии. Отделение неоднократно награждалось переходящим вымпелом за высокие показатели в соцсоревновании.

1985 год. Физкультура – залог здоровья. В целях повышения работоспособности и производительности труда ежедневно в 15.00 в течение 15 минут работники занимались производственной гимнастикой.





1984 год. Все молодые работники Госбанка, знакомятся с традициями отделения, с лучшими работниками, отличниками Госбанка и ветеранами труда. Посвящение молодежи в банковские служащие проводится в торжественной обстановке с вручением наказов, трудовых книжек и первой зарплаты. Молодому работнику Кожан В.А. 17 декабря 1984 года в присутствии всего коллектива торжественно вручен «наказ» управляющим отделения Селицким И.И.

В коллективе установилась добрая традиция – поздравлять своих сотрудников с днём рождения. 1 сентября 1985 года.





*Коллектив отделения накануне праздника –*
*Международного женского Дня 8-ое марта.*
*6 марта 1998 года.*




*Празднование 500-летия Шарковщины.*
*10 октября 2003 года.*

С 2000 года и по настоящее время отделение Банка возглавляет Сивицкая В.Е., под руководством которой здание сначала обновляется в 2004 году, а затем и вовсе преображается в 2008 году.



Так, после завершения начатого в августе 2007 года капитального ремонта с модернизацией, отделение банка становится практически неузнаваемым, приобретает современный вид, в сдержанном классическом виде.






Пройдя через различные участки работы, опытный руководитель уделяет большое внимание улучшению показателей работы отделения, правильной организации труда работников, созданию здорового морально-психологического климата в коллективе.

Заслуги Валентины Евгеньевны замечают и чтят не только в Банке. К примеру, в 2008 году Витебским облисполкомом она была удостоена почетного звания «Женщина года», став лауреатом в номинации «Деловая женщина».

Чистота и порядок прежде всего. И не только на рабочих местах, но и вокруг здания. Стало уже традицией каждую пятницу проводить «санитарный день».



Сотрудники банка успевают везде. Наводим порядок не только в банке, но и на подшефной ферме в СПК «Жвиранка».



В 2004 году в Витебском филиале ОАО «Белагропромбанк» прошел слёт ветеранов банка.



Продукция клиентов «Белагропромбанка».



Сельскохозяйственная техника, приобретённая за счет кредитных ресурсов ОАО «Белагропромбанк».



В 2009 году за счёт кредитов банка приобретены 3 агрегата по внесению минеральных удобрений «Роса», которые сразу же получили второе название «Лунаход». Эти агрегаты уже трудятся на полях района на посевной 2009 года.




В сентябре 2008 года прошла презентация открытия отделения банка, с участием начальника филиала Жингеля О.В., заместителя председателя Шарковщинского райисполкома Боговича Н.И. с приглашением клиентов банка.





Приятно работать в обновлённом здании банка. Созданы все условия для результативной работы. Предусмотрено, чтобы удобно было работать не только работникам, но и клиентам.






В настоящее время банком активно проводятся всевозможные акции, среди которых успешно проходят: детская сберегательная программа «Расти большой», рекламная игра «Подари мечту!».



Помимо суровых трудовых будней, работники активно и с радостью участвуют в различных спортивных мероприятиях районного и областного масштабов. В 2006 году отделение приняло участие в районной лыжне, а также в областном туристическом слёте работников ОАО «Белагропромбанк», проходившем в г. Городок. В 2008 году команда под звучным названием «Компас» представляла отделение на областном туристическом слете ОАО «Белагропромбанк» в г. Ушачи.



Наконец, кроме официальных мероприятий, работники отделения с охотой самостоятельно организовывают экскурсионные поездки в различные уголки страны. Например экскурсия в Браслав в 2005 году и путешествие на теплоходе по браславским озерам в 2008 год.



3 июля 2010 года в рамках празднования великого праздника Дня освобождения Республики Беларусь от немецко-фашистских захватчиков – Дня Независимости в г. п. Шарковщина проходила ярмарка - выставка организаций и предприятий поселка и Шарковщинского района. Отделение ОАО «Белагропромбанк» в г. п. Шарковщина также приняло участие в проведении этого праздничного мероприятия. Специалисты отдела розничных услуг активно предлагали интересующимся гражданам банковские продукты. Наиболее востребована была информация о предоставлении кредитов гражданам, осуществляющим ведение личных подсобных хозяйств. Участникам ярмарки вручалась памятные сувениры – флажки, шары, фликеры, а маленькие участники получали сладкие подарки – шоколад от Банка.



Ясную морозную субботу 12 февраля 2011 года весело и незабываемо провели сотрудники РКЦ №4 в г. п. Шарковщина отделения ОАО «Белагропромбанк в г. Глубокое, приняв активное участие в ежегодном районном празднике «Белорусская лыжня». Суровые погодные условия не мешали выступать нашим спортсменам. Бороться в спортивных конкурсах пришлось с соперниками более чем из 20 команд. В перерывах между конкурсами, участники могли насладиться горячим питанием – солдатской кашей, ухой и ароматным чаем. И пусть в этот раз мы не стали призерами, зато заряд бодрости, веселого настроения и приятных впечатлений команда получила на всю рабочую неделю.

Будьте активны – поддерживайте здоровый образ жизни, заряжайте оптимизмом и хорошим настроением своих коллег и клиентов.





**Спіс літаратуры**

1. Ананич, Е. День рождение с Белагропромбанком!: [акция] / Е. Ананич // Кліч Радзімы. – 2015. – 21 студзеня (№ 4). – С. 3.

2. Ананич, Е. Желаем финасовой стабильности / Е. Ананич // Кліч Радзімы. – 2015. – 3 студзеня (№ 1). – С. 2.

3. Банк вчера и сегодня: летопись  Белагропромбанка. – Шарковщина, 2013. – 40с., ил.

# ЦБУ №224 филиала №216 ОАО СБ «Беларусбанк» г.Полоцк

Філіял з'яўляецца часткай старэйшай і самай буйнейшай крэдытна-фінансавай установы ААБ "Беларусбанк", лідара сярод банкаў краіны па спектару прадстаўляемых паслуг. Яго багатыя традыцыі бяруць пачатак яшчэ ў царскай Расіі, калі імператар Мікалай I выдаў указ аб заснаванні ашчадных кас. Цяперашні "Беларусбанк" краіны "вырас" з дзяржаўных ашчадных кас, якія былі ўтвораны пастановай Саўнаркома 26 снежня 1929 года. У нашым раёне такая каса пачала працаваць у жніўні 1944 года. Вось ужо звыш сямі дзесяцігоддзяў абслугоўвае ўстанова жыхароў раёна. Калісьці зусім невялікая, зараз яна ператварылася ў сучасны банк з шырокім спектарам паслуг як традыцыйных так і самых навейшых.

Шаркаўшчынская ашчадная каса № 6495 утворана другі раз у 1966 годзе ў сувязі з узнаўленнем раёна. З 17 жняўня па 23 верасня на пасады былі прызначаны загадчык, галоўны бухгалтар, інспектар-рэвізор, кантралёр і старшы касір. Першым загадчыкам стаў Мефодзій Васільевіч Забела. Ашчадныя касы ў раёне адкрываліся пры паштовых аддзяленнях. З 1 верасня 1996 года ў раёне былі створаны 15 аддзяленняў. Пашырэнне функцый і новыя падыходы да арганізацыі банкаўскага абслугоўвання прывялі да неабходнасці павелічэння колькасці новых пасад. У 1985 годзе штат работнікаў склаў 26 чалавек, у 1995 годзе – 49, у 2009 годзе – 54.

У 1969 годзе ручная апрацоўка дакументаў на прыём плацяжоў насельніцтва была заменена абслугоўваннем на касавым апараце КІМ у 1999 годзе былі ўсталяваны першыя камп'ютары Рабатрон 16/6.

Першая машына УАЗ была атрымана ў снежні 1984 года. З ліпеня 1995 года філіял № 224 Акцыянернага ашчаднага банка Беларусбанк пачаў праводзіць разлікова-касавае абслугоўванне юрыдычных асоб, першымі кліентамі сталі бюджэтныя арганізацыі раёна.

У студзені 1999 года здадзены ў эксплуатацыю новы будынак банка. Пачаўшы ад ашчадных кас, Беларусбанк і цяпер захаваў прыярытэтным накірункам у сваёй дзейнасці работу з насельніцтвам. У раёне тысячы ўкладчыкаў давяраюць свае грошы менавіта ашчаднаму банку, кожны пяты жыхар з'яўляецца крэдытаатрымальнікам, кожны другі ўладальнік пластыкавай карткі абслугоўваецца ў Беларусбанку.

У сярэднім штодзень у цэнтры банкаўскіх паслуг праводзіцца больш за 400 аперацый па ўкладах, каля 700 аперацый па прыёму камунальных плацяжоў,каля 100 валютна-абменных аперацый, 350 чалавек здымаюць грошы па пластыкавых картках. Робіцца больш за тысячу аперацый па безнаяўных разліках пластыкавай карткай. У склад уваходзяць 1 гарадское і 4 сельскія аддзяленні. Кліентамі банка з'яўляюцца 190 прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў. Шматгадовыя адносіны звязваюць банк з бюджэтнымі арганізацыямі раёна, якія на 60% фарміруюць рэсурсную базу банка з унітарным прадпрыемствам меліярацыйных сістэм, РВУ "Шаркаўшчына райгаз", ДБУ – 26, ДРБУ – 131.

За апошнія гады дзелавыя партнерскія адносіны склаліся ў банка з райспажыўтаварыствам, ПМК-68, УКП ЖКГ.

На 2012 год у Банку працавала 40 спецыялістаў. Каля 50% складае моладзь з вышэйшай адукацыяй, 25 чалавек працуюць у банку звыш 10 год. Сярэдні ўзрост калектыву 39 гадоў. Штогод прадстаўнікі Банка аказваюцца ў ліку ўзнагароджаных на ўзроўні абласнога ўпраўлення, але і галоўнага банка. Становяцца пераможцамі конкурса "Лепшы банкаўскі работнік".

ВЕТЭРАНЫ БАНКА

Раіса Генадзьеўна Грэкава
Валянціна Леанідаўна Міронава
Ларыса Іванаўна Чарнецкая
Людміла Анатолеўна Шальц
Алімпіада Палікарпаўна Целюкоўская
Ірына Казіміраўна Марозава
Лілія Міхайлаўна Цітовіч
Яніна Баніфацыўна Трызна
Яўгенія Станіславаўна Бабчонак

**Спіс літаратуры**

1. Ананич, Е. Широкий спектр услуг / Е. Ананич // Кліч Радзімы. – 2015. –3 студзеня (№ 1). – С. 2.
2. Райчонак, С. Адказныя адносіны да справы [А. М. Сяліцкая] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2015. – 11 красавіка (№ 29). – С. 1.
3. Райчонак, С. Вопытны кіраўнік [Г. І. Бондар] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2015. – 20 мая (№ 40). – С. 1.

# Филиал «Шарковщинское дорожное ремонтно-строительное унитарное предприятие № 131» КУП «Витебскоблдорстрой»

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР ад 11 кастрычніка 1957 года і рашэння выканкама Маладзечанскага аблсавета дэпутатаў працоўных ад 11 лістапада гэта ж года з 15 снежня 1957 года для рамонту і ўтрымання найбольш важных абласных дарог былі створаны пяць міжраённых дарожна-эксплуатацыйных участкаў з падпарадкаваннем іх абласному аддзелу аўтатранспарту і шасейных дарог. Так, у Шаркаўшчынскім раёне была арганізавана ДЭУ-131. У яго “ведении” знаходзілася 207 кіламетраў дарог. Сярод іх аўтадарогі Турманс – мяжа Літоўскай ССР – Браслаў – Шаркаўшчына (72 км), Друя – Міёры – Шаркаўшчына – Глыбокае (102 км), Пліса – Падсвілле (8 км), а/д Докшыцы – Глыбокае – пад’езд да ст. Круляўшчызна (7 км), а/д Шаркаўшчына – Болкалы – Германавічы (18 км). Маладзечанскім аблсаветам у той час было ўстаноўлена, што абласныя дарогі, перададзеныя ў «ведение» дарожна-эксплуатацыйных участкаў, павінны будавацца, рамантавацца і ўтрымлівацца за лік выдзеленых на дарожнае будаўніцтва вобласці сродкаў мясцовага бюджэту. У той час на балансе арганізацыі быў вось такі вытворчы арсенал: ГАЗ-51, трактар ДТ-54, грэйдэр, 4 коні, 4 веласіпеды і пішучая машынка. Першым начальнікам арганізацыі стаў С.З. Васільеў. З 1967 па 1981 гады яе ўзначальваў цяперашні паважаны ветэран Браніслаў Феліксавіч Быкаў, які шмат зрабіў у плане яе станаўлення. Па яго ўспамінах, у ДЭУ-131 працавала 30 чалавек, а аб’ёмы выконваемых работ – каля 130 тысяч рублёў на год. Асфальту не было, толькі гравійныя работы і ўручную. Тэхнікі таксама, практычна, не было, замест грэйдэра быў “прас”. Па ўспамінах ветэрана ў кар’еры машыны загружалі гравіем 4 жанчыны, а калі прыйшоў першы пагрузчык, то яны спалохаліся, што ім не будзе работы. І ужо ў пачатку 70-х гадоў пачаў папаўняцца машынна-трактарны парк, стала прыходзіць тэхніка. З 1986 па 1994 гады арганізацыю ўзначальваў Віктар Арсеньевіч Цыунэль, пад кіраўніцтвам якога быў пабудаваны асфальтабетонны завод, які зараз выпускае 25000 тон асфальту ў год.

У 1989 годзе калектыў ДРБУ-131 стаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва прадпрыемстваў прамысловасці, сферы абслугоўвання насельніцтва і будаўнічых арганізацый. За справаздачны год работнікамі арганізацыі быў выкананы гадавы план па агульнаму аб’ёму работ на 122,1%, павялічыўшы аб’ём работ за год на 20,4%. План капітальнага рамонту выкана на 107,2 %, план па прыбытку выканан на 2,2 разы. За высокія дасягненні калектыву прысуджана першае месца. А як усё пачыналася? ДРБУ-131 вырасла літаральна за 2-3 гады дзякуючы своечасовай падтрымцы райкома партыі і райвыканкама. Так з Рыбінска (Яраслаўская вобласць) было прывезена тры каткі, бо новая тэхніка гэта самае неабходнае для павелічэння магутнасці арганізацыі.

Зараз ДРБУ-131 абслугоўвае 280 кіламетраў дарог. Не толькі рамантуе, укладвае асфальт, але і будуе новыя. Летась было заасфальтавана 29 кіламетраў дарог. Пабудавана гравійка даўжынёй два кіламетры да вёскі Праўдзінскае. Стаіць задача правесці такую ж работу на ўчастках да вёсак Ямна, Жукі Горныя.

Поспех безумоўна радуе. Аднак ён дасягнуты безумоўна і таму, што ў ДРБУ-131 працуюць кваліфікаваныя работнікі. Адным з такіх з'яўляецца трактарыст Леадор Мацвеевіч Федарэнка, якога добра ведаюць і паважаюць у ДРБУ-131. Ён выдатна ведае сваю справу, таварыскі, безадмоўны, а калі трэба – прынцыповы. А такія якасці заўсёды ў пашане.





У 1990 годзе лепшым работникам ДРБУ-131 адзначаны Іван Іванавіч Аніська, вядомы і паважаны чалавек у арганізацыі. І гэта недарэмна. Справа ў тым, што ён тут вельмі неабходны чалавек. Іван Іванавіч трактарыст-бульдазерыст, робіць разгрузку гравію. Зараз Іван Іванавіч заняты разгрузкай гравію на асфальтным заводзе ля вёскі Беляі, добра спраўляецца з абавязкамі. Таму ў час свята аўтамабіліста і дарожніка за пастаяннае выкананне і перавыкананне норм, а таксама адказнасць І.І. Аніська быў названы адным з лепшых рабочых і ўзнагароджаны.

У 2006 годзе на пярэдадні 50 гадовага юбілею ў мікрараёне ДРБУ-131 створаны вельмі прыгожы куточак. Належная дызайнерская думка, падмацаваная матэрыяльнымі сродкамі і адказнасцю кіраўнікоў будаўнічых арганізацый, радуе вока гасцей, якія прыязджаюць у Шаркаўшчыну з боку Глыбокага. Літаральна на вачах мяняецца і тэрыторыя ДРБУ-131. Летась "апрануўся ў новае адзенне" адміністрацыйны будынак, а сёлета вельмі многае зроблена па добраўпарадкаванню.



На 2007 год МТП арганізацыі налічвае 47 адзінак тэхнікі. Гэта магутныя МАЗы і каткі, грэйдэры, асфальтаўкладчык. Працуюць сродкі малой механізацыі – вібрапляцоўкі, кустарэзы, паветрадуныя ўстройствы для ямачнага рамонту, кампактныя абразіўна-адразныя механізмы.

У сучасных умовах у арганізацыі ўкаранёны новыя тэхналогіі – устройствы паверхневай апрацоўкі на бітумных эмульсіях, ямкавы рамонт з прымяненнем сучасных матэрыялаў. Аб'ёмы выконваемых работ складаюць каля 6,5 млрд. руб. у год. На балансе арганізацыі – 535, 4 км дарог, з якіх 153,6 км. – з асфальтабетонным пакрыццём. Сёлета арганізацыя перавыканала прырост аб'ёмаў у параўнанні з мінулым годам. У грашовым вырашэнні гэта 5,4 млрд. рублёў замест 3,3 млрд. у 2006 г.

Гэтым самым ДРСУ-131 стала першай у вобласці па асноўнаму вытворчаму паказчыку.

Пастаянна ў арганізацыі працуе 96 чалавек – ветэраны і моладзь. Летам, часова, бяруць людзей на сезон.

Філіял "Шаркаўшчынскае ДРБУ-131 КУП Віцебскаблдарбуд" з'яўляецца сапраўдным флагам дарожнага будаўніцтва ў раёне, ды і ў вобласці, уплывовай і паважанай арганізацыяй, якую працяглы час узначальвае цудоўны чалавек і кіраўнік Віктар Віктаравіч Багінскі, інтэлегентны, кампетэнтны і паважаны ў калектыве і раёне.

Гэта арганізацыя займаецца будаўніцтвам, рамонтам і ўтрыманнем аўтамабільных дарог. У лістападзе 2007 года ДРБУ-131-юбіляр, арганізацыя адзначае сваё 50-годдзе. Тут – спрыяльны для плённай і выніковай работы мікраклімат, у аснове якога шчыры клопат пра чалавека працы, рабочых, спецыялістаў, стварэнне для іх годных умоў працы і адпачынку, атмасферы адказнасці і дзелавога энтузіязму, што згуртоўвае людзей і робіць іх сапраўдным калектывам аднадумцаў. Хутка споўніцца 20 год, як у арганізацыі працуе інжынерам па арганізацыі працы (а таксама ўзначальвае прафсаюзны камітэт) Святлана Уладзіміраўна Цітовіч, у працоўнай кніжцы якой усяго толькі адзін запіс аб прыняцці на работу.



Калектыў – гэта асноўнае багацце і каштоўнасць, дарагі скарб арганізацыі. Звання “Ганаровы дарожнік Беларусі”, удастоены начальнік ДРБУ-131 В.В. Багінскі, кваліфікаваны і граматны спецыяліст. Адказнасцю вызначаюцца і ветэраны, залаты фонд арганізацыі, трактарыст М.І. Чарноў, 34 гады ў арганізацыі, дарожны майстр С.Ф. Янушкевіч, дарожны рабочы Ю.В. Заброцкі, прараб У.Б Дрэмач, машыніст экскаватара У.С. Шамшур. Прадстаўлены да ўзнагароджання Ганаровай граматай КУП “Віцебскаблдарбуд” вадзіцель І.В. Рыжы. Таксама вадзіцель В.Ч. Ластоўскі – на добрым рахунку. Заслужаным аўтарытэтам карыстаюцца ветэраны працы – галоўны бухгалтар К.А. Жандарава, В.П. Багінская, А.А. Захараў і іншыя. А.М. Казаневіч, які працуе і цяпер, машыніст грэйдэра У.А. Раханскі, вадзіцель С.Г. Шаблоўскі таксама людзі, адданыя прафесіі. Вельмі адказна да абавязкаў адносіцца наш малады дарожны майстр Іван Бабоўскі.

Вельмі развіты сацыяльныя льготы для ўступаючых у шлюб, калі дзіця нарадзілася ці гора ў сям’і. Да Дня пажылых людзей кожны з ветэранаў атрымаў па 100 тысяч рублёў, да юбілеяў і круглых дат – па 50.

Таксама кіраўніцтва ДРБУ-131 выдае беспрацэнтную пазыку на будаўніцтва жылля на два гады, якая з’яўляецца добрым падспор’ем. У завяршальнай стадыі будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчы цэнтр пры арганізацыі. Вялікі ўклад уносяць дарожнікі ў выкананне праграмы адраджэння сяла.

Так, адна з асноўных задач – добраўпарадкаванне ў аграгарадках (зараз – гэта ў Іёдах і Пяліках) дарог, пад’ездаў, пляцовак, тэрмасушылак. Усё гэта клопат дарожнікаў. Да юбілею арганізацыі прафкам аформіў альбом, дзе паказана жыццё калектыву – у фотаздымках і паслаў на конкурс на лепшую прафарганізацыю.

На 2009 год у ДРБУ-131 працуе каля сотні чалавек. На гэты момант на балансе арганізацыі знаходзіцца 543 кіламетры дарог. Працяглы час калектыў працуе пад кіраўніцтвам В.В. Багінскага. Усе ведаюць Віктара Віктаравіча, як адказнага і граматнага кіраўніка. Раённае кіраўніцтва не раз адзначала яго заслугі ў справе добраўпарадкавання рэгіёна. ДРБУ-131 за 9 месяцаў бягучага года асвоіла 5,6 міліярда рублёў. Арамантаваны аўтадарогі Шаркаўшчына – Ляднікі – Васюкі – Вялікае Сяло – Старое Сяло, Дзісна – Шаркаўшчына, пад’езды да вёсак Наваселле, Якубова, Дворнава. Дарожнікі займаюцца добраўпарадкаваннем райцэнтра. Сёлета адрамантаваны вуліцы Савецкая, Халаева, Вадап’янава. Шаркаўчане і госці гарадка змаглі ацаніць роўнае асфальтавае дарожнае пакрыццё. Супрацоўнікі ДРБУ-131 асфальтуюць пад’езды да “прэзідэнцкіх” дамоў. Сёлета дарожнікі вялікія сілы кінулі на добраўпарадкаванне Наваселля, Вялікага Сяла і Дворнава. Брыгада працуе на будаўніцтве жывёлагадоўчай фермы ў СВК “Жвіранка.” Праведзены рамонт тэрыторыі мехдвара і дзвюх ферм у Дворнава. Пакладзены асфальт на мехдвары ў Вялікім Сяле, малочна-таварных фермах у Старым Сяле і Наваселлі. Наводзіцца парадак каля школ, магазінаў і іншых сацыяльных аб’ектаў аграгарадкоў. Заасфальтавана тэрыторыя зернесушыльных комплексаў у СВК “Жвіранка” і КУВСП імя Маркава.

Акрамя таго шаркаўшчынскія дарожнікі працавалі на добраўпарадкаванні Віцебска, Наваполацка, Лужасна.

У арганізацыі шмат увагі ўдзяляецца фізкультурнай рабоце. Абсталявана спартыўная зала, дзе вечарамі праводзяць час дарожнікі і іх сем'і. Нядаўна каманда ДРБУ-131 пад кіраўніцтвам Ігара Бабоўскага прыняла ўдзел у абласных спартыўных спаборніцтвах, якія праводзіць КУП "Абладарбуд". Шаркаўчане занялі 1-е месца ў більярдзе, 2-е – у валейболе, 3-е – у перацягванні каната. Ігар Бабоўскі названы лепшым футбалістам турніру.

Гонар кожнага калектыву – яго людзі. У ДРБУ-131 працуе шмат вадзіцеляў. Сярод лепшых – Іван Рыжы, Сяргей Шаблоўскі, Аляксей Другакоў, Віктар Бараноўскі, Мікалай Клопаў. Ведаюць сваю справу рабочыя Андрэй Кулеш, Міхаіл Латышонак, Мікалай Шарак, Павел Мурзіч, Іван Кудрын, Уладзімір Раханскі, Казімір Андруковіч.

Адказна адносяцца да справы галоўны інжынер Вячаслаў Гарбузаў, дарожны майстар Уладзімір Правіла, механік рамонтнага участка Андрэй Курачонак.

Не забываюць у калектыве і ветэранаў, якія прысвяцілі працы лепшыя гады жыцця. Па 36 гадоў адпрацавалі Зігмунд Казіміравіч Бучынскі, Арсеній Архіпавіч Захараў, Валянціна Пятроўна Багінская, больш 30 гадоў – Мікалай Мікалаевіч Чарноў, Іван Іванавіч Аніська, 27 гадоў – Вальдэмар Браніслававіч Руткоўскі. Ветэранаў працы рэгулярна запрашаюць на святы ў арганізацыю.

У 2010 годзе ДРБУ-131 займалася капітальным рамонтам участка дарогі Дзісна-Шаркаўшчына, там ёсць 6-кіламетровы грунтовы ўчастак.



Так выглядаў участак дарогі Дзісна—Шаркаўшчына



А такі ён зараз

Сёлета заасфальтавалі два з паловай кіламетры, работы працягваюцца. У гарадскім пасёлку часткова адрамантавана дарожнае пакрыццё па вуліцах Чырванаармейская, Чырвоная Горка, Паўднёвая, Вадап'янава, Школьная, Камсамольская, Савецкая, Максіма Горкага і іншых. Вялі работы па рамонту тэрыторый каля райгаза, пошты, аўтастанцыі. Вялікі аб'ём работ праведзены па асфальтаванню пад'ездаў да фермаў, мехдвароў у будучых аграгарадках Буеўшчына, Шыці, Верацеі. Аказвае платныя паслугі насельніцтву, калі неабходна заасфальтаваць пад'езд да дома, двор. Сёлета, дарэчы, выручка ад дадзенага віду паслуг склала 750 мільёнаў. А ўсяго мы асвоілі, з улікам кастрычніка, 8 мільярдаў рублёў, што на 154 працэнты больш, чым у мінулым годзе.

Адным з асноўных абавязкаў арганізацыі з'яўляецца падтрымка дарог у належным стане. У раёне 557 кіламетраў сельскіх дарог, з іх 170 з асфальтабетонным пакрыццём, 310 гравійных і 76 грунтовых. З апошнімі, асабліва ў перыяд міжсезоння, вядома, узнікаюць праблемы. Галоўнае, праводзіць усе неабходныя работы своечасова. Стараемся па-магчымасці, наколькі дазваляюць сродкі сачыць за станам дарог, падсыпаць, грэйдзіраваць.

У арганізацыі налічваецца 47 адзінак тэхнікі, якая штогод абнаўляецца, летась атрымалі новы асфальтаўкладчык, сёлета новы каток, МАЗ, у дастатковай колькасці маюцца сродкі малой механізацыі: кустарэзы, бензапілы і іншае.

На дадзены момант у калектыве працуюць 83 чалавекі. Вопыт прадстаўнікоў старэйшага пакалення сумяшчаецца з лепшымі якасцямі моладзі. Дарэчы, вядзецца работа па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, за свае сродкі. Цякучасць кадраў у ДРСУ-131 малая, высокі ўзровень заработнай платы. Вядома, гэтыя грошы дастаюцца няпроста. У летні перыяд пра выхадныя усе забываюць, каб нехта пайшоў летам у водпуск — такога не бывае. Зімой, канешне, спакайней, у хлопцаў з'яўляецца час наведваць нашу спартыўную залу з сучаснымі трэнажорамі, сталом для тэніса, більярдам. Дарэчы, каманда спартсменаў ДРСУ-131 пад кіраўніцтвам Ігара Бабоўскага пастаянна займае высокія месцы на абласных спартакіядах сярод дарожнікаў. Вось і сёлета яны вярнуліся пераможцамі. Не забываюць у арганізацыі і пра сваіх ветэранаў, у любы момант яны могуць звярнуцца за дапамогай. На прафесійнае свята, на Дзень пажылых людзей арганізуюцца падарункі. Віншаванні прымаюць і юбіляры, у кастрычніку адсвяткаваў юбілей Іосіф Андрэевіч Рэдзька, у снежні свята будзе ў Зыгмунда Казіміравіча Бучынскага. Яны, як і шэраг іншых нашых ветэранаў, адпрацавалі ў арганізацыі многія гады.

У гэтым годзе ДРБУ-131 стала лепшым у раённым конкурсе-аглядзе па добраўпарадкаванню вытворчай тэрыторыі.



*старшыня райвыканкама М. В. Морхат віншуе В. В. Багінскага*

За кошт уласных сродкаў была заасфальтавана тэрыторыя, адрамантавана адміністрацыйнае памяшканне, на тэхніку паглядзець не сорамна, плюс малыя архітэктурныя формы, кветнікі. Вядзецца праца па пераводу майстэрнь на газавае ацяпленне.

Таксама ДРСУ-131 ямачным рамонтам, бо пасля зімы дарогі ў нашых кліматычных умовах патрабуюць пэўнага касметычнага рамонту.

Мінулая зіма была частая на рэзкія перапады тэмператур, пераходы ад маразоў да адліжных дажджоў. А асфальт, як вядома, гэтага не любіць. Таму на рамонт асабліва пашкоджаных дарог райцэнтра былі кінутыя работнікі ДБУ-13.





Так у сакавіку 2011 года быў праведзены ямачны рамонт па вуліцы Чырванадворская. З работнікаў, якія яшчэ не задзейнічаны на асноўных работах, было створана два звяны. Адно зараўнівае больш буйныя ямы. Для гэтага на месцы ямак выразаюцца карты (квадраты), іх засыпаюць халоднай сумессю СОМС і ўтрамбоўваюць. За адну змену брыгада такім чынам рамантуе 40-50 квадратных метраў пашкоджанага пакрыцця.

Іншае звяно працуе з вадкай сумессю – эмульсіяй, залівае меншыя ямкі. Праца на дарогах гарадскога пасёлка будзе працягвацца 6-8. На сёння правялі ямачны рамонт на дарогах па вуліцах Савецкай, 7 верасня.

У 2011 годзе супрацоўнікі ДРСУ-131 таксама займаліся абслугоўваннем аўтадарогі Шаркаўшчына – Дзісна. Яно ж укладвае асфальт на гравійным участку гэтай дарогі. На сёлета запланавана пакласці паўтара кіламетра.




*на асабліва пашкоджаных участках даводзілася ўкладваць асфальтавае пакрыццё на некалькі дзясяткаў метраў*



*дарожны майстар Міхаіл Буйка*

Дарога і сапраўды старая, тэхніка па ёй ходзіць цяжкая, таму дарожнае пакрыццё моцна разбураецца. І ўвогуле, пажаданы тут быў бы, канешне, капітальны рамонт. Але дадзеная дарога не адносіцца да рэспубліканскіх, на ўтрыманне якіх дзяржава выдзяляе значнае фінансаванне. Таму на яе не так проста адшукаць сродкі. Цяпер арганізацыі дадзены ўчастак 2 кіламетры, зроблена 250 метраў у Юзэфова, кіламетр тут, перад Вялікім Сялом, і кіламетр у канцы ўчастка. З таго часу, як пачалі класці асфальт на гравійцы, павялічылася на гэтым накірунку колькасць машын.

На ўчастку тым днём працавалі Іван Калтыжанкоў на асфальтаўкладчыку, Казімір Андруковіч і Васілій Рылаў – на двух катках, дадатковыя работы выконвалі дарожны рабочы Сяргей Бейнаровіч і вадзіцель Сяргей Навуменка.



*у кабіне катка Казімір Андруковіч*

Іван Калтыжанкоў працуе ў ДРБУ-131 шэсць гадоў, а на сваім сучасным асфальтаўкладчыку ўжо чацвёрты сезон. Вядома, такая тэхніка запатрабавана, займаецца ўкладкай асфальту яна не толькі на дарогах раёна, але выязджае на абласныя дарожныя будоўлі (горад Віцебск, Браслаўскі, Верхнядзвінскі раён).



*машыніст асфальтаўкладчыка Іван Калтыжанкоў пра сваю тэхніку адклікаецца добра і адносіцца да яе адпаведна*

З надыходам лета для дарожнікаў пачынаецца гарачы перыяд, прастойваць не даводзіцца. Вось і пасля заканчэння гэтага ўчастка запланаваны выезд на аб’екты ў Наваполацк.



*Іван Калтыжанкоў, Сяргей Бейнаровіч,*
*Казімір Андруковіч, Сяргей Навуменка.*

Адказна рыхтуюцца дарожнікі і да зімовага перыяду кіламетраж абслугоўваемых дарог у вясенне-летне-асенні перыяд – звыш 550 кіламетраў, а па зімоваму ўтрыманню – 185 кіламетраў дарог і ўсе збудаванні на іх.

Па падрыхтоўцы да зімы былі выдадзены адпаведныя загады: аб замацаванні вадзіцельскага саставу, машын і механізмаў па дыстанцыях на гэты перыяд, аб стварэнні дарожна-патрульнай службы, аб арганізацыі дзяжурстваў. Зацверджаны спіс адказных асоб за зімовае ўтрыманне дарог, праведзена атэстацыя раскідвальнікаў пясчана-солевай сумесі, вызначана патрэбнасць у асноўных расходных матэрыялах, неабходных для ўтрымання аўтадарог зімой і ўстойлівага функцыянавання арганізацыі ў зімовы перыяд. На выпадак раптоўнага пагаршэння метэаўмоў (завеі, галалёд) створаны двухмесячны запас расходных матэрыялаў, нарыхтавана неабходная колькасць вешак, калкоў і снегазатрымліваючых шчытоў, створаны пастаянны двухтыднёвы запас гаруча-змазачных матэрыялаў.



*надзённыя задачы абмяркоўваюць інжынер па тэхніцы бяспекі З. С. Фяцковіч і вадзіцель пескараскідвальніка У. І. Маркевіч.*

Для работы ў зімовы перыяд падрыхтаваны 20 адзінак спецыяльнай тэхнікі – тры аўтагрэйдары, сем МТЗ-82 і адзін Т-150 з лапатамі, тры пагрузчыкі, раскідвальнікі двух тыпаў. Такой колькасці тэхнікі дастаткова для зімовага ўтрымання дарог, не дапускаючы збояў у руху транспарта. Дарожныя рабочыя і механізатары забяспечаны спецвопраткай і абуткам, абсталяваны належным чынам і спецмашыны для перавозкі людзей.



*грэйдары на лінейцы гатоўнасці*



*усяго праз некалькі хвілін навясныя лапаты могуць быць загрэгатаваны з МТЗ-82*

У ДРБУ-131 працуюць адказныя і добрасумленныя работнікі. Сярод якіх можна адзначыць Уладзіміра Раханскага, Анатоля Казаневіча, Івана Кудрына, Мікалая Пяцько, Уладзіміра Маркевіча. Яны не першы год паказваюць узоры добрасумленнасці на зімовых дарогах.

Зімой у адзіночку арганізацыя працаваць не можа. Дарогі – гэта ўзаемасувязь з насельніцтвам. У ДРБУ-131 маецца неабходная інфармацыя з райспажыўтаварыства, аўтастанцыі, метэастанцыі, РАНС, РАУС аб руху аўталавак, рэйсавых аўтобусаў, набліжэнні непрадбачаных прыродных катаклізмаў, аварыях на дарогах. Згодна з ёй і працуюць машыністы і трактарысты. Адпраўляецца, напрыклад, аўтобус або аўталаўка ў 6 ці 8 гадзін, значыць работнікі проста абавязаны да гэтага часу расчысціць дарогу, пад'езды да аўтобусных прыпынкаў і месцы развароту. Іншага не дадзена, бо кожная наша недапрацоўка можа выклікаць абгрунтаваную скаргу пасажыра ці пакупніка.

А акумуліруе інфармацыю і накіроўвае работу па расчыстцы і ўтрыманню дарог у зімовы час Алена Кісель дыспетчар па зімоваму ўтрыманню дарог. І са сваімі абавязкамі яна спраўляецца паспяхова. Аператыўныя зносіны з дзяжурнымі спецыялістамі, механізатарамі і машыністамі, кругласутачнае дзяжурства ў святочныя дні і найбольш непагодлівыя дні з'яўляюцца гарантам таго, што з пастаўленымі на зімовы час задачамі калектыў ДРБУ-131 справіцца паспяхова.



*дыспетчар па зімоваму ўтрыманню дарог*
*Алена Кісель*

На 2012 год у «Шаркаўшчынскім ДРБУ-131» КУП «Віцебскаблдарбуд», працуе 71 чалавек. На балансе дадзенай арганізацыі знаходзіцца 555,7 км. мясцовых аўтадарог, з іх – 170,9 км з асфальтабетонным пакрыццём, 315,3 км з гравійным, 67,3 маюць грунтова-палепшанае пакрыццё. Таксама адказвае ДРБУ-131 за 46 мастоў. Дарэчы, сёлета арганізацыя адзначае 55-гадовы юбілей. Урачыстае мерапрыемства з нагоды юбілейнай даты і прафесійнага свята адбылося 25 кастрычніка.

За 9 месяцаў 2012 года ўласнымі сіламі арганізацыі выкананы аб'ём работ на суму 10134 млн. рублёў (рост у параўнанні з адпаведным перыядам 2011 года 142 працэнты), выручка складае 10 836 млн. рублёў. Па праграме дарожных работ філіялам засвоена 3500 млн. рублёў, што складае 35 працэнтаў ад агульнага выкананння. Па ўтрыманні дарог за гэты год выканана работ на суму 2368 млн. рублёў. У зімні перыяд асноўныя работы вяліся па своечасовай ачыстцы пакрыцця дарог і мастоў ад снегу, у летні перыяд – па ямачным рамонце асфальтабетонных пакрыццяў, рамонтнаму прафіліраванні гравійных дарог, абкашванні ўзбочын і паласы адводу, замене і афарбоўванні элементаў добраўпарадкавання дарог. Па рамонтных работах засвоена 931 млн. рублёў. Адрамантавана 4,7 км аўтадарог. На а/д Буеўшчына-Лонскія-Свілы, Лужкі-Чырвоная Гара выкананы рамонт гравійнага пакрыцця. На а/д Дзісна-Шаркаўшчына праведзена павярхоўная апрацоўка. Аварыйным рамонтам адрамантавана 2,9 км гравійных дарог. З верасня вядзецца капітальны рамонт участка а/д Дзісна-Шаркаўшчына.

На іншых аб'ектах засвоена 6634 млн. рублёў. Дапамагалі сёлета шаркаўчане добраўпарадкаваць вуліцы Глыбокага, калі горад рыхтаваўся да Дня пісьменнасці. Работ выканана на 2051 млн. рублёў.



*работнікі філіяла заняты на добраўпарадкаванні вуліц Глыбокага*

Работнікі філіяла былі задзейнічаны на добраўпарадкаванні тэрыторыі пры будаўніцтве МТФ у Пашках (выкананы работы на 1081 млн. рублёў) і МТФ Карасі Глыбоцкага раёна. Праводзілі работы па ўкладцы асфальту і добраўпарадкаванні на тэрыторыі новай цэнтральнай раённай бальніцы (1469 млн. рублёў).



*падчас укладкі асфальтавага пакрыцця на тэрыторыі новай раённай бальніцы*

Удзельнічалі ў рэканструкцыі скрыжавання вуліц Маладзёжная і Калініна ў горадзе Наваполацк (1025 млн. рублёў). А таксама прымалі ўдзел у здачы футбольнага стадыёна (асфальтаванне дарожак). Платных паслуг насельніцтву па добраўпарадкаванні двароў было аказана на 62,8 млн. рублёў.

Вясной гэтага ж года, пасля знікнення снегу і льду, на вуліцах гарадскога пасёлка тэхніка і працаўнікі ДРБУ-131 праводзілі рамонт найбольш пашкоджаных пасля зімы ўчасткаў дарог. На рамонце дарог у гарадскім пасёлку была занята адна брыгада ў колькасці 4-5 чалавек. Выкананы ямачны рамонт, засыпаны глыбокія ямы халоднай сумессю СОМС. Рамонтныя работы праводзяцца на найбольш праблемных участках вуліц Энгельса, Маякоўскага, Кірава, Чырвонаармейскай, Вакзальнай, Чырвоная Горка.



Вясной 2013 года брыгада рабочых ДРБУ-131, якую ўзначальвае майстар Ігар Уладзіміравіч Бабоўскі з дапамогай тэхнікі і спецыяльных прыстасаванняў праводзілі ямачны рамонт асфальта-бетоннага пакрыцця па дарозе Германавічы – Лужкі, асабліва па яе адрэзку паміж Бялянамі і Ахваткай. Стан дарогі на дадзеным участку адзін з найгоршых у раёне. Такі нездавальняючы стан дарожнага палатна пакінула ў гэтым месцы пасля сябе зацягнуўшаяся зіма. Наогул, неспрыяльныя ўмовы надвор’я вясной, калі на працягу сутак тэмпературны рэжым з адмоўнага ноччу павышаецца да высокай адзнакі днём, самым дрэнным чынам уплываюць на асфальта-бетоннае пакрыццё праезных частак вуліц і дарог. Але, тым не менш, рабочыя скарыстоўваць усе магчымасці, наяўныя сродкі і матэрыялы, каб праезд па гэтай і іншых дарогах не ператвараўся ў пераадоленне паласы перашкод.



*ямачны рамонт дарогі праводзяць*
*работнікі ДРБУ-131*

У 2013 годзе ганаровым званнем "Чалавек года Шаркаўшчыны" адзначаны машыніст аўтакрана ДРБУ-131 Мікалай Васільевіч Клопаў.



Як лётчык не можа пражыць без блакітнага неба, так і ён не ўяўляе ніводнага дня без руля аўтамабіля.

Любоў да тэхнікі Мікалаю Васільевічу прывіў бацька Васіль Мікалаевіч, працаваў ён вадзіцелем у ДБУ-26 на старэнькім ГАЗ-51. Так і сын, адслужыўшы ў арміі, уладкаваўся ў гэту арганізацыю вадзіцелем бензавоза. А з 2006 года працуе машыністам аўтакрана ў ДРБУ-131.

Сваёй Мікалай Васільевіч ганарыцца і паважае яе.

Гэта не проста работнік са званнем "Чалавек года Шаркаўшчыны", гэта аўтарытэт для маладых працаўнікоў, прыкладны сем'янін, надзейны сябра і памочнік у любой справе.

**2017 год**

Кастрычнік багаты на прафесійныя святы. У апошнюю нядзелю месяца традыцыйна адзначаюць Дзень аўтамабіліста і дарожніка. Сёлета гэта свята прыпадае на 29 кастрычніка.



*Амаль 30 год за рулём МАЗа працуе Сяргей Шаблоўскі*

Асноўнай спецыфікай дзейнасці філіяла камунальнага ўнітарнага прадпрыемства “Віцебскаблдарбуд” дарожнага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 131 з’яўляецца капітальны рамонт і ўтрыманне дарог. Работнікі службы абавязаны падтрымліваць у належным стане пад’язныя шляхі да кожнага, нават маланаселенага, пункта. Асабліва зімою, калі трэба своечасова падвесці падсыпку дарог пясчана-салянай сумессю, ачысціць ад снежных сумётаў. З гэтымі і іншымі абавязкамі паспяхова спраўляюцца спецыялісты і рабочыя ДРБУ № 131, якое ўзначальвае Вячаслаў Васільевіч Гарбузаў — дэпутат раённага Савета дэпутатаў.

— На сённяшні дзень на нашым прадпрыемстве працуюць 52 чалавекі, — кажа Вячаслаў Васільевіч. — Працягласць дарог па раёне складае 559 кіламетраў.



*Электрагазазваршчык Сяргей Носка*

Старшыня прафсаюзнага камітэта ДРБУ № 131 Святлана Уладзіміраўна Цітовіч, напярэдадні прафесійнага свята – Дня аўтамабіліста і дарожніка – Ганаровыя граматы і Падзякі камунальнага ўнітарнага прадпрыемства “Віцебскаблдарбуд” атрымалі галоўны інжынер філіяла Аляксандр Мадэставіч Станько, дарожны майстар Міхаіл Вікенцьевіч Буйка, вадзіцелі Аляксей Міхайлавіч Другакоў, Іван Вячаслававіч Рыжы і электрагазазваршчык Сяргей Рышардавіч Носка.

**Спіс літаратуры**


1. Бурэц, А. Патрыёт сваёй работы: [М.В. Клопаў] / А. Бурэц // Кліч Радзімы. – 2013. – 26 кастр. (№ 86) – С.1.
2. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 сю, іл.
3. Райчонак, С. Аснова дзейнасці – будаўніцтва дарог / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2013. – 26 кастр. (№ 86). – С.2.
4. Терпилко, А. Завершено строительство дорог / А. Терпилко // Кліч Радзімы. – 2014. – 25 кастр. (№ 85). – С.2.

# УК «Шаркаўшчынская дзіцячая школа мастацтваў»

Дзіцячая музычная школа была адкрыта ў Шаркаўшчыне 1 жніўня 1969 г. Яе арганізатарам і дырэктарам стаў Іван Казіміравіч Курто, які пасля заканчэння Маладзечанскага музычнага вучылішча быў накіраваны на работу ў Шаркаўшчыну. Школа мела тры аддзяленні: фартэпіяна, баян, акардэон. Акрамя Івана Казіміравіча, працавалі яшчэ два выкладчыкі: Галіна Мікалаеўна Прасаловіч і Аляксандр Аляксандравіч Ашла. Першы набор склаў 60 вучняў.

У станаўленне музычнай школы значны ўклад унеслі таксама яе выкладчыкі Вячаслаў Міхайлавіч Дунаеўскі (клас баяна), Мечыслаў Эмануілавіч Касцюк.

Паступова адкрываліся новыя аддзяленні: духавое (1978), скрыпкі (1981), мастацкае аддзяленне (1994), аддзяленне харэаграфіі (1995). У 1994 г. музычная школа была пераўтворана ў школу мастацтваў.

На мастацкім аддзяленні працуюць 3 выкладчыкі: член Беларускага саюза мастакоў Віктар Фёдаравіч Крук (загадчык аддзялення), Арсеній Іванавіч Пяткевіч, Марына Пятроўна Ліпская.

У раёне дзейнічае яшчэ адна школа мастацтваў – у Лужках. Кіруе ёй Юрый Ціханавіч Пазяйчук.

Усяго ў абедзвюх школах займаюцца 244 вучні па наступных спецыяльнасцях: фартэпіяна, струнна-духавыя і народныя інструменты, жывапіс і малюнак, тэатральнае мастацтва. Калектыў выкладчыкаў складаюць 24 чалавекі. У школах створаны 3 аркестры, 2 харавыя калектывы, фальклорны ансамбль, квартэт выкладчыкаў, ансамбль «Шаркаўшчынскія музыкі».

Многія выпускнікі музычнага аддзялення Шаркаўшчынскай школы мастацтваў сталі цяпер выкладчыкамі гэтай або іншых школ Беларусі. Шмат хто працягвае вучобу ў вышэйшых і сярэдніх музычных навучальных установах краіны. Сярод выпускнікоў мастацкага аддзялення школы ёсць студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў, Віцебскага педуніверсітэта, Беларускага універсітэта культуры (мастацкія аддзяленні), Віцебскага тэхналагічнага універсітэта.

За гады існавання Шаркаўшчынскай школы мастацтваў адукацыю тут атрымалі амаль 400 выпускнікоў.

## Спіс літаратуры

1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с., іл.

2. Райчонак, С. Палітра талентаў школы мастацтваў / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2017 год. – 3 чэрвеня (№44). – С.3.

# З гісторыі шаркаўшчынскага вытворчага ўчастка глыбоцкага малочна – кансервавага камбіната

Да 1939 года будынак малаказавода, які знаходзіцца на вуліцы 17-е Верасня, належыў пану. У народзе прадпрыемства называлі “польска млечарня”. Завод быў невялікі, складаў, прыкладна, трэцюю частку ад сучаснага. Пасля вызвалення Беларусі ад белапалякаў і ўсталявання савецкай улады, прадпрыемства стала дзяржаўным. Тут выраблялі масла, сыр, марожанае (звычайна па святах). Машын было мала, малако прывозілі на конях у флягах. Амаль кожны ў той час меў карову, таму попыт на малако быў значна меншы. Больш запатрабаванай з’яўлялася малочная прадукцыя, асабліва масла. Яго выраблялі каля дзвюх з паловай тон у дзень. Для гэтага патрабавалася шмат работнікаў. Працавалі 70 – 80 чалавек, значную частку складала моладзь. Завод славіўся сваім галандскім сырам, іншай высакаякаснай прадукцыяй.

У 1971 годзе быў пабудаваны Глыбоцкі малочна-кансервавы камбінат. Міёры, Браслаў і Шаркаўшчына сталі для яго сыравіннай зонай. Паступова завод у Шаркаўшчыне скараціў выраб малочнай прадукцыі, а потым і зусім прыпыніў. Прадпрыемства ператварылася ў вытворчы ўчастак, які толькі прымаў малако, ахалоджваў і адпраўляў у Глыбокае, чым займаецца і зараз.

30 год пасаду начальніка завода займала Наталля Іванаўна Арсоба.

Яна закончыла Пінскі мяса-малочны тэхнікум і пачала працаваць майстрам, потым інжынерам, а ў студзені 1976 года ўзначаліла прадпрыемства. У 2006 годзе пайшла на заслужаны адпачынак, але яна ніколі не забывае пра сваё былое месца работы, наведае супрацоўнікаў якія з задавальненнем кожны раз яе сустракаюць.

З 2008 года кіраўніком участка з’яўляецца Людміла Эдуардаўна Латышонак.



Пасля атрымання вышэйшай адукацыі працавала галоўным бухгалтарам, а потым была прызначана начальнікам Шаркаўшчынскага вытворчага ўчастка. Добразычлівая, справядлівая да свайго дружнага і згуртаванага калектыву, які складаецца з 19 чалавек.

Усё сваё працоўнае жыццё адпрацавалі на заводзе: Зоя Антонаўна Сарокіна, Аліна Антонаўна Зубовіч, Клеапатра Іпалітаўна Красоўская, Соф'я Міхайлаўна Базарэвіч, Іван Іванавіч Лаўрыновіч, Марыя Іванаўна Кавалеўская, Леанід Міхайлавіч Арыстаў, Сяргей Міхайлавіч Шаблоўскі, Генрык Усцінавіч Калтан, Мікалай Батвеевіч Латышонак, Марыя Чаславаўна Басікірская і інш.

Неаднаразова работнікі завода ўзнагароджваліся граматамі і прэміямі. У 2011 годзе ААТ "Глыбоцкі МКК" святкаваў сваё 40-годдзе. На ўрачыстасць, прысвечаную гэтай даце, былі запрошаны работнікі Шаркаўшчынскага ўчастка; некаторыя атрымалі ўзнагароды.

**Спіс літаратуры**

1. Арсоба, А. Вытворчы ўчастак у Шаркаўшчыне / А. Арсоба // Кліч Радзімы. – 2012. – 8 лютага (№ 11). – С.2.

2. Бурэц, А. Важнае звяно / А. Бурэц // Кліч Радзімы. – 2007. – 8 лістапада (№ 96). – С.2.

3. Корсак, Э. Адна з самых вопытных работнікаў участка / Э. Корсак // Кліч Радзімы. – 2000. – 18 лістапада (№ 98). – С.2.

# Прыватнае кааператыўна-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Шаркаўшчынскі кансервава-агароднінасушыльны завод»

Галоўнае на тэрыторыі нашага раёна прадпрыемства ў 1957 годзе адкрывалася як “Шаркаўшчынскі кансервава-агароднінасушыльны завод”, які праз год пачаў працаваць на поўную магутнасць. Пад’язныя шляхі і тэрыторыя прадпрыемства яшчэ ў той час былі не замошчаны і не добраўпарадкаваны.

Завод пачынаў сваю дзейнасць без складскіх і падсобных памяшканняў. У лютым 1958 года пастанаўленнем Праўлення шаркаўшчынскага райспажыўсаюза было прынята рашэнне “У сувязі з увядзеннем у эксплуатацыю сушыльнага завода назначыць яго дырэктарам Канстанціна Юльянавіча Бондара, бухгалтарам – Людмілу Паўлаўну Барсук. І ўжо ў 1968 годзе акрамя сушанай бульбы, з якой і пачыналася вытворчасць, завод выпрацоўваў кансервы пладова-агароднінныя, сокі пладова-ягадныя, безалкагольныя напоі, кісель, пюрэ сульфіцыраванае.

Свой сённяшні выгляд завод набыў у перыяд кіраўніцтва Барыса Аркадзьевіча Гарадзецкага. Ён узначальваў завод з 1976 па 1988 год, менавіта ў гэты перыяд былі пабудаваны склады гатовай прадукцыі, ангар, цукеркавы і сокавы цэхі, лабараторыя, значна павялічыўся кансервавы цэх, заасфальтавалі тэрыторыю завода.

У 1999 годзе, нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, быў пабудаваны цэх па выпуску мясных і мясараслінных кансерваў з прадукцыйнасцю 350 тубаў у год.

У 2002 годзе запушчаны ў эксплуатацыю цэх па разліву пладова-ягаднага віна праектнай магутнасцю 230000 дал у год. Зараз на заводзе выпускаецца 360 тысяч дал віна ў год.

— Сёння ў склад філіяла Шаркаўшчынскага кансервавага завода, акрамя непасрэдна тэрыторыі завода, уваходзяць транспартна-тэхнічны аддзел, аддзел грамадскага харчавання, 9 гандлёвых кропак, скотаўбойны цэх і цэх па перапрацоўцы мясных паўфабрыкатаў, — паведаміў дырэктар філіяла завода Сяргей Мікалаевіч Макаранка, які на працягу апошніх 5 гадоў узначальвае калектыў прадпрыемства. — У наш час філіял кансервавага завода ажыццяўляе выпуск пладовага віна палепшанай якасці і спецтэхналогіі. Вінная прадукцыя прадпрыемства рэалізуецца на тэрыторыі ўсёй Віцебскай вобласці. Акрамя гэтага, у невялікім аб’ёме на заводзе выпускаюцца мясныя кансервы, у склад якіх уваходзяць толькі натуральныя прадукты і спецыі, дзякуючы гэтаму мясная прадукцыя нашага прадпрыемства заваявала добрую рэпутацыю ў шаркаўчан і гасцей нашага раёна.

І хоць сёння філіял Шаркаўшчынскага кансервавага завода перажывае не лепшы свой перыяд, калектыў прадпрыемства не апускае рукі і робіць усё магчымае, каб завод пратрымаўся на плаву, паступова развіваўся, не спыняўся на дасягнутым, а прадукцыя заставалася канкурэнтназдольнай. Зараз калектыў завода налічвае 66 чалавек, рабочых і спецыялістаў, занятых на вытворчасці.Менавіта яны, галоўны капітал і патэнцыял філіяла кансервавага завода. У большасці сваёй гэта людзі, правераныя часам, гатовыя супрацьстаяць многім праблемам і цяжкасцям, надзейныя і адказныя работнікі і спецыялісты, на якіх і трымаецца сёння вытворчасць у Шаркаўшчыне.

Звыш трох дзясяткаў гадоў на кансервавым заводзе працуюць Вольга Пятроўна Латышонак, Мая Мікалаеўна Рафаловіч, Алена Казіміраўна Павучонак, Мікалай Мікалаевіч Хадасевіч, Галіна Мікалаеўна Кандрацьева.Немагчыма думаць пра будучыню завода і не ўспомніць нашых ветэранаў, людзей, якія не па чутках ведаюць, што 60 гадоў – гэта перыяд няпростай напружанай працы ўсяго калектыву. У ліку лепшых работнікаў нашага калектыву – Алена Валер’еўна Ластаўка, Кацярына Анатольеўна Сякерына, Таццяна Уладзіміраўна Цітовіч, Юлія Юр’еўна Барыла, Аляксей Генадзьевіч Рак, Валерый Рычардавіч Носка, Аляксей Уладзіміравіч Клакоўскі, Таццяна Уладзіміраўна Чупрова, Алена Яўгенаўна Малкова, Анафа Ісаеўна Буславічус, Марыя Васільеўна Сарокіна, Людміла Іосіфаўна Сапонька і многія-многія іншыя нашы працаўнікі.

За 5 месяцаў 2017 года на тэрыторыі завода выпушчана 128 тысяч дал пладова-ягаднага віна, што складае 117,4 працэнта да ўзроўню мінулага года. Выручка ад рэалізаванай прадукцыі за названы перыяд склала 5 мільёнаў 95 тысяч рублёў. Прыбытак ад рэалізацыі – 562 тысячы рублёў. Дастаткова стабільныя эканамічныя паказчыкі, надзейныя, адданыя сваёй справе рабочыя, кваліфікаваныя спецыялісты, якасная і дакладна структураваная сістэма кантролю якасці і вытворчасці ў цэлым – усё гэта дае падставы спадзявацца на тое, што 60 год – чарговая, але далёка не апошняя старонка ў гісторыі нашага філіяла Шаркаўшчынскага кансервавага завода.

**Спіс літаратуры**

1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512с., іл.

2. Райчонак,С. Шаркаўшчынскаму кансервава-агароднінасушыльнаму заводу – 60 гадоў / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2017. – 18 ліпеня (№ 52). – С.2.

# Шаркаўшчынскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі

Санітарна-эпідэміялагічная служба з’яўляецца адной з галоўных складаемых сістэмы аховы здароўя краіны. Дзейнасць дадзенай структуры бачна паўсюдна – яна выконвае важную ролю ў сферы працы, адукацыі, харчавання, адпачынку, уплывае на патрабаванні да будаўніцтва дамоў і прадпрыемстваў. Практычна ва ўсіх сферах спецыялісты санэпідэмслужбы маюць сваё важкае слова, пры гэтым у аснове іх работы – клопат пра здароўе людзей.



Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач раёна Уладзімір Леанідавіч Грашчанка паведаміў, што Шаркаўшчынскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі таксама мае сваю гісторыю развіцця:

На тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна, які быў утвораны ў 1940 годзе, санітарная служба пачала фарміравацца з моманту вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На пачатку 1945 года ў штаце санітарна-эпідэміялагічнай станцыі было 6 чалавек. Яны ажыццяўлялі нагляд за санітарным станам аб’ектаў, змагаліся з распаўсюджанымі ў той час інфекцыйнымі захворваннямі (сыпным тыфам, каростай, педыкулёзам, дыфтэрыяй і іншымі), праводзілі вакцынацыю мясцовага насельніцтва.

У 1962 годзе раён быў расфарміраваны. З 1962 па 1966 гады на яго былой плошчы санітарны нагляд праводзіўся спецыялістамі санаддзела Міёрскай раённай бальніцы. У 1966 годзе як адзіная адміністрацыйная катэгорыя раён быў адноўлены і 8 студзеня 1967 года была створана Шаркаўшчынская раённая санітарна-эпідэміялагічная станцыя. У 1994 годзе яна была перайменавана ў Шаркаўшчынскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі.

У склад Шаркаўшчынскага райЦГЭ сёння ўваходзяць санітарна-эпідэміялагічны аддзел, лабараторны аддзел і бухгалтэрыя.

Санітарна-эпідэміялагічны дабрабыт насельніцтва нашага раёна забяспечваюць 18 чалавек: 1 урач, 10 сярэдніх медыцынскіх работнікаў, з якіх 2 – маладыя спецыялісты, 2 – прадстаўнікі малодшага медперсаналу, 4 – адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу. Кожны з гэтых людзей звязаў сваё жыццё з высакароднай і гуманнай прафесіяй па ахове здароўя насельніцтва, прафесіяй няпростай і, разам з тым, вельмі патрэбнай і неабходнай. Яе асноўны сэнс – зрабіць жыццё чалавека больш бяспечным і абароненым.

Асабліва хочацца адзначыць заслужаных людзей з бясцэнным прафесійным і жыццёвым вопытам, якія аказалі значны ўплыў на станаўленне і развіццё санітарна-эпідэміялагічнай службы раёна. У іх ліку Аляўціна Андрэеўна Міларадава, Галіна Ігнацьеўна Баговіч, Надзея Андрэеўна Скарабагатава, Іна Міхайлаўна Цэвянкова, Валянціна Аляксандраўна Русецкая, Раіса Мікалаеўна Ананіч, Ганна Іванаўна Тарарака, Вольга Міхайлаўна Рачыцкая, Людміла Аляксандраўна Цімашэнкава, многія іншыя супрацоўнікі арганізацыі.

У калектыве Шаркаўшчынскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі 30 і больш гадоў працуюць памочнік урача-гігіеніста Святлана Анатольеўна Манкевіч, фельчар-лабарант Ганна Мамертаўна Юшкевіч, памочнік урача-эпідэміёлага Алена Сяргееўна Мацкевіч і інструктар-валеолаг Антаніна Мяфодзьеўна Курачонак.

У розныя перыяды часу значны ўклад у арганізацыю дзейнасці санітарнай службы раёна ўнеслі кіраўнікі: Яўгенія Трафімаўна Курыловіч (1952 – 1954), Марыя Ізраілеўна Вайштэйн (1955 – 1956), Марыя Сямёнаўна Мальцава (1957 – 1958), Антон Антонавіч Білый (1958 – 1959), Іна Міхайлаўна Цэвянкова (1959 – 1962), Леанід Акімавіч Раманоўскі (1967 – 1971), Аляксандр Іванавіч Козінцаў (1971 – 1973), Анатолій Герасімавіч Кандрацьеў (1973 – 1976), Георгій Дзмітрыевіч Шляхцічаў (1976 – 1986), Аляксандр Сцяпанавіч Буйніцкі (1986 – 2006), Павел Станіслававіч Камінскі (2006 – 2009), Валянцін Вячаслававіч Грэцкі (2009 – 2011), Уладзімір Леанідавіч Грашчанка (2012 – па сённяшні дзень).



*калектыў Шаркаўшчынскага райЦГЭ з галоўным дзяржаўным санітарным урачом раёна Уладзімірам Леанідавічам Грашчанка і ветэранам, былым кіраўніком арганізацыі Леанідам Акімавічам Раманоўскім*

**Спіс літаратуры**

1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с, іл.

2. Чарняўская, В. 90 год санітарна-эпідэміялагічнай службе Беларусі / В. Чарняўская // Кліч Радзімы. – 2016. – 4 лістапада. – С.2.

# Раённы Цэнтр рамёстваў

5 кастрычніка 2001 г. гасцінна расчыніў дзверы раённы Цэнтр раместваў, які ўзяў на сябе клопат аб захаванні і далейшым развіцці традыцыйных народных рамёстваў, характэрных для Шаркаўшчынскага раёна.

Адкрыццё Цэнтра рамёстваў – гэта крок да пошуку новых талентаў на Шаркаўшчынскай зямлі. І гэтыя таленты ёсць, бо майстры і кіраўнікі гурткоў імкнуцца не толькі самі плённа працаваць, але і перадаюць сакрэты свайго майстэрства дзецям.

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці Цэнтра рамёстваў з’яўляюцца зберажэнне і захаванне самабытнай мастацкай культуры, вывучэнне, адраджэнне і прапаганда рамёстваў і промыслаў у раёне, арганізацыя работы з дзецьмі, абслугоўванне насельніцтва праз выставы, гурткі, стварэнне ўмоў працы для майстроў.

Маецца філіял Цэнтра рамёстваў у в. Германавічы, а таксама створаны клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў “Талака”, які нядаўна пацвердзіў званне народнага.

У Цэнтры рамёстваў і яго філіяле аматары развіваюць 10 відаў традыцыйных рамёстваў.

Добра вядома за межамі нашага раёна імя Сяргея Рымдзёнка. Ён працуе загадчыкам філіяла, вядзе заняткі ў гуртках ганчарных вырабаў і глінянай цацкі.

Ганна Загорская – кіраўнік гуртка станочнага ткацтва, дзе займаюцца 12 дзяцей, якія авалодваюць тэхнікай ткацтва кілімаў, ручнікоў, сурвэтак.

Пачаў працаваць гурток ткацтва габеленаў. Ён налічвае 12 чалавек (кіраўнік Аксана Калеснікава).

У гуртку разьбы па дрэве “Бабраня” (кіраўнік Аляксандр Цітовіч) займаюцца 10 чалавек.

З задавальненнем дзеці (8 чалавек) наведваюць гурток выцінанкі “Дамавёнак” (кіраўнік гуртка Людміла Казіцкая). У пачатку года была арганізавана выстава “Казка з паперы” ў фае Цэнтра рамёстваў. Выстава работ Людмілы Казіцкай “Ажурныя фантазіі” экспанавалася ў Корніцкай бібліятэцы.

Пляценне саламяных вырабаў – цікавы і своеасаблівы від народнай творчасці. Кіраўнік гуртка “Саламяная кветка” (займаюцца тут 10 чалавек) Святлана Брэская імкнецца зрабіць гэты від творчасці даступным для дзяцей, яна вучыць іх правільна выбраць матэрыял, пазнаць уласцівасці саломкі, прывівае мастацкі густ, знаёміць з творчым вопытам старэйшых пакаленняў і нашых сучаснікаў у галіне саломапляцення.

Кіраўнік гуртка малявання дываноў (такіх, якія ствараў у свой час Я.Драздовіч) Людміла Мікалаеўна Маяк пераняла тэхніку выканання маляванага дывана ад вядомай майстрыхі Ганны Мікалаеўны Курыловіч, якая ўсё сваё жыццё займалася “маляванкай”. Людміла Мікалаеўна імкнецца адрадзіць гэты від народнай творчасці, прывіць любоў да яго. Свае лепшыя работы дзеці выстаўлялі ў час “Каляднага кірмашу” ў раённым Доме культуры.

З задавальненнем займаюцца дзяўчынкі рознага ўзросту ў гуртку фларыстыкі, які вядзе Святлана Заіка. Прыгожыя пано з сухіх кветак, арыгінальныя букеты з прыроднага матэрыялу, своеасаблівыя вазы з баршчавіка яны прадстаўляюць на выставе “Жывыя колеры”.

Усяго ў гуртках Цэнтра рамёстваў і яго філіяла ў Германавічах займаюцца больш за 100 чалавек.

Цэнтр рамёстваў вядзе актыўную выставачную дзейнасць. Ладзяцца выставы народных майстроў Шаркаўшчынскага і суседняга, Глыбоцкага раёнаў, гурткоўцаў Цэнтра рамёстваў.

Традыцыяй стала ў час Велікодных свят праводзіць выставу-конкурс “Яйка-пісанка”. Удзел у ёй прымаюць гурткоўцы Цэнтра рамёстваў, вучні школ раёна, а таксама выхаванцы школы мастацтваў аддзялення скульптуры. Пераможцы ўзнагароджваюцца граматамі і сувенірамі, вырабленымі ў ганчарнай майстэрні.

Выставачная зала Цэнтра рамёстваў у Шаркаўшчыне адзіная, таму, акрамя выстаў вырабаў народных майстроў, тут экспануюцца таксама і работы мастакоў.

Адметнай з’явай стала выстава мастакоў – удзельнікаў пленэра “Шляхамі Язэпа Драздовіча”, на якой было прадстаўлена амаль 30 твораў. Сярод іх работы А.Марачкіна, І.Марачкіна, М.Купавы, У.Сулкоўскага, В. Маркаўца, С.Цімохава, А.Цыркунова, І.Барадулінай, А.Шыенка і іншых сяброў Беларускага саюза мастакоў. У час правядзення выставы прэзентаваўся альбом-манаграфія “Язэп Драздовіч: жыццё і творчасць”. Гэтыя мерапрыемствы былі наладжаны да чарговага дня нараджэння дзядзькі Язэпа.

Прайшлі выставы ўшацкага мастака М. Казіцкага “Святло праваслаўя”, выстава лазерных копій работ М.К. Рэрыха “Рускі цыкл”, прадастаўленая Беларускім фондам Рэрыхаў.

Традыцыйнымі сталі ў цэнтры выставы работ выпускнікоў мясцовай школы мастацтваў, а цяпер студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі.

Цэнтр рамёстваў наладжвае таксама выставы на пляцоўках горада ў час масавых мерапрыемстваў. Адна з іх – выстава дзіцячага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Свет маіх захапленняў” у час раённага свята “Прыдзісенскія крыніцы”.

Добрай традыцыяй стала ў Шаркаўшчыне шанаванне памяці нашага слыннага земляка І.П. Сікоры. Наладжваюцца святочныя мерапрыемствы ў яго гонар. Адно з іх «Яблычны Спас – усяму час». Работнікі Цэнтра рамёстваў з’явіліся арганізатарамі правядзення конкурсаў-выстаў кулінарных вырабаў “Маладзільнае яблык” і букетаў “Шаркаўшчынскі вянок прыгажосці”.

Выставы-продажы сувенірных вырабаў арганізоўваюцца ў час святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь 3 ліпеня, а 25 снежня праводзіцца Калядны кірмаш.

Вялікая ўвага ўдзяляецца прапагандысцка-асветніцкай дзейнасці. Цэнтр рамёстваў праводзіць экскурсіі-лекцыі для вучняў школ, работнікаў культуры, жыхароў горада і раёна.

# Поспехі і творчыя пошукі шаркаўшчынскага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў “Талака”



31 студзеня ўдзельнікі клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў “Талака” раённага цэнтра рамёстваў разам з салістамі ўзорнага тэатра эстраднай песні “Маленькая фея” наведалі абласны цэнтр, каб прыняць удзел у праграме тэлеканала “Вячэрні Віцебск”.

Артысты “Маленькай феі” падрыхтавалі два нумары для выступлення на тэлебачанне. Галоўнымі героямі праграмы сталі  ўдзельнікі клуба “Талака”, якія ў чарговы раз падцвярдзілі званне “народны”. Народнае мастацтва Шаркаўшчынскага краю мае багатую гісторыю свайго развіцця, мноства таленавітых майстроў, якія і сёння працягваюць і памнажаюць старадаўнія рамесныя традыцыі. Так, заўсёды славілася шаркаўшчынская зямля сваімі тканымі вырабамі, маляванымі дыванамі, бондарствам, лазапляценнем і іншымі. Існавалі нават вескі Бондары, Лазоўка. З мэтай захавання і развіцця рэгіянальных асаблівасцяў традыцыйнай культуры ў кастрычніку 1987 года і быў створаны клуб народных майстроў “Талака”. У 1992 годзе клубу  прысвоена званне “народны”, якое праз кожныя 3 гады дастойна падцвярджалася.

З 2001 года клуб узначальвае Святлана Заіка. На сённяшні дзень клуб налічвае 34 майстры па розных відах творчасці, якія імкнуцца не толькі самаадданa працаваць, але і перадаваць свае майстэрства дзецям. У клубе аб’ядналіся людзі розныя па прафесіі, узросце, але аднолькава неабыякавыя да творчасці. Раскажам крыху пра кожнага з іх.

Пачнём з сямейнай пары Сяргея і Ганны Рымдзенкаў, якія з'яўляюцца сапраўднымі зоркамі народнага мастацтва. З 2001 года — члены Беларускага саюза майстроў. Самабытныя тканыя посцілкі і ручнікі Ганны добра вядомы не толькі шаркаўчанам, але і па ўсей Віцебшчыне. Ганчарныя вырабы Сяргея заўседы знаходзяць сваіх прыхільнікаў у час шматлікіх выстаў і кірмашоў народных рамёстваў. Яны з гонарам прадстаўляюць рэгіянальную народную культуру і ўпэўнена перамагаюць у час правядзення абласных і рэспубліканскіх конкурсаў.

Вольга Беласлудцава – прадаўжальніца справы Язэпа Драздовіча, Ганны Курыловіч, Людмілы Маяк. Ее маляваныя дываны, макаткі вядомыя па ўсім раене. Яна вядзе гурток "Маляванка", дзе 12 дзяцей вучацца працаваць з фарбамі, правільна выбіраць матэрыял, накладваць грунт і іншае.

Сапраўднай знаходкай для клуба з'яўляецца Ірына Груніна. Любая справа спорыцца ў яе руках — шые, вышывае, вяжа. Ее лялькі ў нацыянальным аддзенні кіраўніцтва раёна дарыць ганаровым гасцям і вязе ў якасці сувеніраў у час замежных камандзіровак. Пасля выхаду на пенсію Ала Леднік пачала займацца аплікацыяй з саломкі. Лік яе работ ідзе на сотні. Разьбой па дрэве займаецца Яўген Ананіч. У яго добра атрымліваюцца скарбонкі, дэнкі, вазы аздобленыя неаметрычнай разьбой, а таксама драўляныя лыжкі і цацкі.

Такія прыгожыя вязаныя сурвэткі, якія робіць Алена Дзехцяр, яшчэ трэба пашукаць. Знаходзячыся на заслужаным адпачынку яна ні хвіліны не сядзіць без справы.

Маляўнічыя краявіды нашлі адлюстраванне ў творах самадзейных мастакоў Уладзіміра Мікалаевіча Маяка, Генадзя Аляксандравіча Невярковіча, Яўгена Вітальевіча Ліпскага.

Увогуле ўсе майстры імкнуцца плённа працаваць і шчодра дзеляцца сваімі творчымі знаходкамі з усімі аматарамі мастацтва.

Клуб "Талака" актыўны ўдзельнік шматлікіх раённых мерапрыемстваў. У час выстаў праводзяцца майстар-класы, выраб сувеніраў рукамі майстра. З самага пачатку існавання клуба праводзілася выстава-конкурс "Яйка-пісанка" з гульневай праграмай і правядзеннем абраду. Падобным чынам праходзіць свята Каляды. Гэтыя два мерапрыемствы з'ядналі майстроў і прыцягваюць да сябе новых маладых выканаўцаў. Свае навыкі і ўменні майстры клуба перадаюць дзецям у час заняткаў гурткоў: ганчарства, гліняная цацка, аплікацыя з саломкі, ткацтва на кроснах, ткацтва паясоў, вязанне, разьба па дрэве, саломапляценне і іншае.

Наперадзе новыя пошукі і настойлівая карпатлівая праца, без чаго немагчыма сапраўднае творчае майстэрства.

— Мы вельмі задаволены, што нашу творчасць дастойна ацэньваюць, — адзначыла Святлана Заіка. — Гэта многа значыць для нас. Асабліва прыемна, што ёсць аматары, якім цікавы нашы вырабы. Ганаровае званне "народны" падцвярджаем не ўпершыню, але кожны раз усё роўна для нас гэта хвалюючы момант.

# Ольга Белослудцова возрождает традиции народного искусства и передает свои знания ученикам



С огоньком в глазах и задором в сердце
И в десять лет, и в семь, и в пять
Все дети любят рисовать.
И каждый смело нарисует
Все, что его интересует.
Все вызывает интерес:
Далекий космос, ближний лес,
Цветы, машины, сказки, пляски…
Все нарисуем! Были б краски,
Да лист бумаги на столе,
Да мир в семье и на земле.

Районный центр ремесел в Шарковщине давно известен местным жителям. Учреждение начало работу в 1997-м году, и с тех пор добилось значительных успехов. Основное направление деятельности на протяжении многих лет неизменно — это популяризация белорусской и наших национальных традиций.

Вот уже десять лет работает здесь руководителем кружка по рисованию «Маляванка” Ольга Белослудцева. Родилась героиня нашего рассказа в Володарской области Республики Казахстан. В 1995 году ее семья переехала в Шарковщинский район. Красота нашей белорусской природы, впитав в себя все краски весеннего пробуждения, летней свободы, осенней грусти и зимней свежести, помогли воображению девочки ощутить эту удивительную природную гармонию. Со 2-го класса она полюбила рисование. Во многих творческих школьных конкурсах Оля принимала активное участие. Но лучших результатов на районном и областном уровне добилась благодаря рисованию. Поэтому к концу одиннадцатого класса определилась с выбором и учебного заведения, и будущей профессии. Оля поступает в Мирский государственный художественный профессионально-технический колледж. Практику проходит в нашем районном центре ремесел, куда в 2008 году возвращается на постоянное место работы.

Сегодня «маляваныя дываны» известны по всей Витебской области. Это картины большого размера, написанные на домотканом холсте или мешковине черного либо темно-коричневого цвета масляными красками. Из истории известно, что традиция рисовать ковры на счастье стала популярной в 1920-е годы. Героиня рассказа нашла свое видение работ и удачно сочетает прошлое и современность, а неповторимый живописный язык превратил «маляванки» в ее любимое искусство.

Любит также декор и роспись деревянных срезов, которые, попав в ее руки, превращаются в великолепные поделки и милые магнитики. Ольга любит свою работу. В каждый рисунок, каждое изображение вкладывает частицу своей души, в каждом произведении выражает свой внутренний мир.

То, чему научилась, хочет передать детям. На занятия после уроков к ней спешат дети в возрасте от 6 лет и старше. В начале она всегда беседует с детьми, чтобы узнать в каком ребята пришли настроении. От этого зависит не только желание рисовать, но и выбор цветовой гаммы, которую выберет ученик. Чтобы развить детское творчество, она показывает им работы известных художников. Обучает различным техникам рисования. Ей по душе нетрадиционные техники, которые открывают широкий простор для детской фантазии, дают ребенку возможность увлечься творчеством, развить воображение, проявить самостоятельность и инициативу, выразить свою индивидуальность.



Нетрадиционные техники рисования являются замечательным способом создания маленьких шедевров. Оказывается можно создать соленую картинку, а ладошка может превратиться в голубого слоника. Серая клякса может стать деревом, а морковка с картошкой могут удивить необычными узорами. Например, с детьми младшего возраста можно использовать рисование пальчиками, ладошками, печать из ниток, картофеля или морковки. С детьми среднего возраста можно попробовать отпечатки листьев, масляную пастель плюс акварель, рисование ватными палочками и другие. Каждая из этих нетрадиционных техник — это маленькая игра для ребенка. Их использование позволяет детям чувствовать себя в творчестве раскованнее, смелее, непосредственнее. Эти техники развивают воображение, дают полную свободу для самовыражения. Летом дети выходят на улицу и рисуют пейзажи.



Есть среди ее учеников одаренные дети — это Виктория Богович и Виолетта Ананич, обе учащиеся средней школы № 1.

— Эти девочки — большие умнички, — говорит Ольга. — Они трудолюбивы, ежедневно посещают занятия. Сами интересуются искусством, придумывают новые стили, сочетают несочетаемое. Приглашаю детей на свои занятия в кружке «Маляванка», которые проходят с 15.00 до 17.00.

## Спіс літаратуры


1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с., іл.

2. Чарняўская, В. Праз творчасць да новых перамог [пераможца конкурса свята “Дрэва жыцця - 2017” Я. Ананіч] / В. Чарняўская // Кліч Радзімы. – 2017. – 22 ліпеня (№ 58). – С.2.

3. Чарняўская, В. Як святкавалі Вялікдзень нашы продкі?: [святочная праграма ў Цэнтры рамёстваў] / В. Чарняўская // Кліч Радзімы. – 2017. – 6 мая (№ 36). – С.6.

# З гісторыі “Шаркаўшчына - Райгаз”




Пачалося ўсё у 1965 годзе, калі 1 верасня ў вёсцы Лужкі ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны была ўстаноўлена першая чатырохкамфорачная пліта Брэсцкага заводу газавай апаратуры. Мантаж газабалонных установак, дастаўку газа да 1970 года па раёну выконвала Глыбоцкая эксплуатацыйна-мантажная кантора па газіфікацыі. Начальнікам якой быў Васілій Сяргеевіч Лісіцын.

У сувязі з пяцігадовым планам газіфікацыі БССР у Шаркаўшчынскім раёне са студзеня 1970 года быў створаны майстарскі ўчастак Глыбоцкай ЭМК па газіфікацыі, які ўзначаліў па накіраванню райкама партыі пасля дэмабілізацыі з радоў Савецкай Арміі Раман Віктаравіч Паўловіч. У гэты час былі газіфікаваны 72 кватэры, а ўстанова размяшчалася ў брыгадзе “Рассвет” саўгаса “Шаркаўшчынскі” на вуліцы Кірава. Тут жа, у прыстасаваным складзе, захоўвалася 30 газавых балонаў абменнага фонду. Газ дастаўляўся Глыбоцкім гаргазам з вялікімі перабоямі.

З прыходам газу ў калгасы і саўгасы з 1970 года пачалі будаваць невялікія склады для захоўвання балонаў і дастаўкі газу для абанентаў сваіх гаспадарак. Слесары-газавікі дастаўлялі балоны і газавае абсталяванне на бартавых машынах, трактарах і гужавых павозках.

Функцыянальнымі абавязкамі работнікаў майстэрскага ўчастка былі прыём заявак па спецыяльна асобнавыдзеленаму нумару 2-15-04, мантаж газабалонных установак і прафілактычныя работы.

Мянялася і месцазнаходжання ўчастка. У канцы 1970 года ён размяшчаўся на вуліцы 17-е верасня, потым – у будынку бібліятэкі і ўпраўлення сельскай гаспадаркі. З 1973 па 1974 – па вуліцы Савецкай у будынку ЦСУ. У 1974 годзе Глыбоцкая ЭКМ выдзеліла для ўчастка вагон-дом, які быў устаноўлены па вуліцы Энгельса, 87, дзе меркавалася пачаць будаўніцтва базы.

Афіцыйнае распараджэнне райвыканкама аб адводзе зямельнага ўчастка па вуліцы Энгельса, 87 для будаўніцтва рампы для захоўвання балонаў на 840 штук і базы гаргаза было атрымана ў верасні 1975 года. Пасля яго заканчэння ў маі 1976 года арганізацыі перададзена старая машына тыпу “клетка” для дастаўкі балонаў. Газ з Полацкай газанапаўняльнай станцыі дастаўляўся аўтабазай.

У жніўні 1977 было завершана будаўніцтва адміністрацыйна-вытворчага будынку, а ў кастрычніку ўчастак быў перайменаваны ў цэх звадкаванага газу. Начальнікам зацверджаны Раман Віктаравіч Паўловіч, намеснікам – Пётр Аляксандравіч Краснікаў.

У калектыве газавікоў створаны ўмовы для паспяховай работы: ёсць майстэрні з наборам неабходных станкоў і прыбораў, цёплы гараж для рамонту аўтатэхнікі, крытыя стаянкі, бытавыя памяшканні. Кожны работнік мае камплекты неабходных інструментаў і прыстасаванні.

Вялікая ўвага надаецца добраўпарадкаванню тэрыторыі. Пасаджаны сад з дзевяці сартоў польскіх яблынь, закладзена плантацыя з амерыканскіх п'яніц, акультураны вадаём, дзе ў вольны час работнікі і іх дзеці ловяць рыбу, фантан-каскад з альпійскай горкай, разбіты прыгожыя газоны і кветнікі.



*Галоўны інжынер Канстанцін Матэленак (справа) і кладаўшчык Андрэй Юдыцкі*

Праца занятых у гэтай галіне людзей надзвычай важная для грамадства. Ад іх дзейнасці залежыць бесперабойнасць работы ўсіх галін народнай гаспадаркі і камфортнасць жыцця грамадзян.

У Шаркаўшчынскім філіяле "Браслаўгаз" працуюць 38 чалавек. Прадпрыемства ажыццяўляе бесперабойнае і безаварыйнае забеспячэнне прыродным і звадкаваным газам жыхароў нашага раёна. Арганізацыя таксама займаецца рамонтам і тэхнічным абслугоўваннем аб'ектаў газаразмеркавальнай сістэмы і газаспажывання, забяспечвае газам камунальна-бытавыя прадпрыемствы і жылы фонд.

— Агульная працягласць сеткі, па якой падаецца прыродны газ, складае 90 кіламетраў, — кажа нам дырэктар прадпрыемства Эдвард Эдвардавіч Вялічка. — Прыродны газ падведзены больш чым да 2000 абанентаў. З кожным годам колькасць домаўладанняў, да якіх падводзіцца прыродны газ, павялічваецца. Прыкладна 8000 абанентаў карыстаюцца звадкаваным газам у балонах, якія дастаўляецца спажыўцам спецтранспартам. На абслугоўванні арганізацыі маецца прыкладна 300 ацяпляльных катлоў.

За справунасцю абсталявання і бесперабойнай падачай прыроднага газу карыстальнікам назірае спецыяльна створаная аварыйная выратавальная служба. Дзякуючы яе работнікам пазаштатных сітуацый на газапровадзе ў нас няма.

У цяперашні час сярод насельніцтва раёна праводзім рэгістрацыю ўстановак, якія працуюць на звадкаваным газе. Складаем двухбаковыя дамоўленасці з іх карыстальнікамі. Гэта, у першую чаргу, накіравана на бяспеку нашых грамадзян. Спецыялісты арганізацыі праводзяць увесь патрэбны комплекс работ па замене балонаў і кантролі за правільным карыстаннем газавай устаноўкай. Таксама сочым за справунасцю газавых пліт, выпісваем рэкамендацыі па іх замене, калі тэрмін эксплуатацыі закончаны. Нярэдка ўзнікаюць спрэчныя сітуацыі. У такіх выпадках нашы спецыялісты праводзяць платную дыягностыку газавых пліт. У выніку іх поўнай справунасці дазваляем карыстацца плітамі на працягу яшчэ трох-чатырох год.



*Кантралёр Таццяна Белавус*

Штат работнікаў нашай арганізацыі вопытны і кваліфікаваны, хоць немалая яго частка – гэта маладыя спецыялісты. З лепшага боку зарэкамендавалі сябе прыёмшчыца заказаў Алена Міхайлаўна Неміровіч і кантралёр уліку прыроднага і звадкаванага газу Таццяна Генрыхаўна Белавус. Слоў удзячнасці за працу заслугоўваюць і іншыя члены калектыву.



*Прыёмшчыца заказаў Алена Неміровіч*

З нагоды Дня работнікаў нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці ўзнагароджаны шэраг працаўнікоў арганізацыі. Званне “Ветэран прадпрыемства” прысвоена вадзіцелю Ігару Львовічу Краснікаву. Ганаровай граматай УП “Віцебскаблгаз” узнагароджаны вадзіцель Андрэй Мікалаевіч Мілaрадаў. Падзяка УП “Віцебскаблгаз” уручана кантралёру Людміле Іванаўне Паўловіч. На Дошку гонару УП “Віцебскаблгаз” занесены кантралёр Таццяна Генрыхаўна Белавус. Ганаровай граматай філіяла “Браслаўгаз” узнагароджаны слесар аварыйна-аднаўленчых работ Уладзімір Віктаравіч Кобелеў. Падзякі філіяла “Браслаўгаз” уручаны прыёмшчыкам заказаў Леаніле Віктараўне Станюленіс, Леаніду Станіслававічу Лагуну і Андрэю Уладзіміравічу Жыжыкіну. На Дошку гонару філіяла “Браслаўгаз” занесены прыёмшчыкі заказаў Алена Міхайлаўна Неміровіч і Ірына Віктараўна Вялічка.

# З успамінаў Рамана Віктаравіча Паўловіча, былога дырэктара “Шаркаўшчына-райгаз”

Нарадзіўся я ў сялянскай сям’і на хутары Рэпішчэ Браслаўскага раёна. Мае бацькі зараблялі на жыццё тым, што шылі вопратку, абутак, а гэта па тых часах прыносіла ім добры прыбытак. Пасля заканчэння Іёдскай сярэдняй школы я непрацяглы тэрмін працаваў загадчыкам сельскага клуба ў вёсцы Слабодка, што на Браслаўшчыне. Справа гэта мне падабалася, бо з дзяцінства я іграў на баяне. А па тых часах, самі ведаеце, хлопец-музыкант быў зайздросным жаніхом для мясцовых дзяўчат. Менавіта дзякуючы першай сваёй прафесіі я і пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Аленай. Неўзабаве пасля тэрміновай службы ў войску ажаніўся з ёй.

Добра памятаю, як 2 студзеня 1970 года кіраўніцтва Шаркаўшчынскага раённага камітэта кампартыі прапанавала мне ўзначаліць газавую службу раёна. На той час мне было толькі 21 год, я нават не ведаў з чаго пачынаць. Але ў райкаме КПБ цвёрда сказалі: “Бярыся за справу, а вопыт прыйдзе з часам”. Вось так пакрысе і сам вучыўся новай справе, і вучыў сваіх падначаленых. Канечне, цяжка было пачынаць, бо тады ў маленькім памяшканні, дзе размяшчалася наша арганізацыя, быў самы мінімум мэблі — два пісьмовыя сталы і два крэслы. Але сумленныя адносіны да справы работнікаў арганізацыі, іх працавітасць прыносілі свае станоўчыя вынікі. Газіфікацыя Шаркаўшчынскага раёна звадкаваным газам прыйшлася на перыяд пачатку маёй работы. Паступова павялічвалася колькасць карыстальнікаў (абанентаў) газавых установак. Пашыраўся і штат супрацоўнікаў нашай арганізацыі.

У 2005 годзе згодна з дзяржаўнай праграмай у Шаркаўшчынскі раён быў падведзены прыродны газ. Асноўныя работы па пракладцы газапроваду прыйшліся на зіму, а яна ў той год аказалася надзвычай суровай. Глеба ў большасці месцаў прамярзала да двух метраў у глыбіню. Але, тым не менш, усе запланаваныя работы мы выканалі своечасова і якасна. Вясною 2005 года прыродны газ быў падведзены да карыстальнікаў.

38 год свайго жыцця я аддаў рабоце ў райгазе. Увесь гэты час з’яўляўся кіраўніком арганізацыі. За перыяд працы не было ні адной пазаштатнай сітуацыі, аварыйных выпадкаў ні ў прыватным сектары, ні на вытворчых аб’ектах. Прадпрыемства “Шаркаўшчынарайгаз” заўсёды з’яўлялася адным з лепшых у вобласці па вытворчых паказчыках, па эстэтычным утрыманні прылеглай тэрыторыі. Нават абласныя конкурсы калектываў мастацкай самадзейнасці, якія штогод праводзіліся сярод раённых арганізацый нашай галіны, заўсёды прыносілі нам перамогу або лідзіруючыя месцы.

З пазіцыі сённяшняга дня я цвёрда ўпэўнены, што ў маладосці абраная мною прафесія стала лёсавызначальнай. І нават калі б прыйшлося нанава пачаць сваё жыццё, я яго зноў бы прысвяціў працы ў галіне газазабеспячэння.

Гэта справа прыносіла мне задавальненне, а людзям – вялікую карысць. Мая спадарожніца жыцця, жонка Алена Антонаўна, працавала да выхаду на заслужаны адпачынак у райгазе. Сын, дачка і нявестка таксама працуюць у дадзенай галіне. Вось так і атрымліваецца, што агульны стаж работы ў газавай гаспадарцы ў нас складае больш чым сто год.

Раман Віктаравіч і цяпер цікавіцца жыццём і работай людзей, якія працуюць у газавай службе Шаркаўшчынскага раёна, часта наведваецца да сваіх былых калег, вядзе з імі размову. Ён вельмі ганарыцца, што пры выхадзе на заслужаны адпачынак пакінуў пасля сябе трывалую матэрыяльна-тэхнічную базу ўстановы, зладжаны калектыў супрацоўнікаў. Не забываюць і цяпер свайго былога кіраўніка работнікі арганізацыі. У будні і святы наведваюцца да Рамана Віктаравіча на сядзібу, віншуюць са святамі.

— Асабіста для мяне, падтрымка родных і блізкіх людзей з'яўляюцца своеасаблівым элексірам шчасця, здароўя і даўгалецця, — падзяліўся з намі такой думкай юбіляр. — Менавіта такія адносіны дапамагаюць спраўляцца са шматлікімі жыццёвымі цяжкасцямі.

**Спіс літаратуры**

1. Ананич, А. Еду в облгаз [финальный смотр-конкурс] / А. Ананич // Кліч Радзімы. – 2015. – 18 крас. (№ 31). – С.7.

2. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с., іл.

3. Райчонак, С. Каб агеньчык блакітны гарэў у дамах / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2016. – 3верас. (№ 71). – С.7.

4. Райчонак, С. У аснове працы – безаварыйнасць і бесперабойнасць / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2017. – 2верас. (№ 70). – С.3.

# Из истории Шарковщинского райпо

После объединения западной Беларуси в 1939 году было создано в 1940 году Шарковщинское районное потребительское общество.

В годы немецкой оккупации 1941-1944 годы потребительское общество не функционировало.

После освобождения территории Шарковщинского района от немецко-фашистских захватчиков началось восстановление и развитие потребительской кооперации на Шарковщинской земле.

В первые послевоенные годы в состав Шарковщинского союза потребительских обществ входило 5 сельпо: Ковшелевское, Пяликовское, Иодское, Германовичское, Шарковщинское.

После упразднения Плисского района к Шарковщинскому союзу потребительских обществ было присоединено Лужковское сельпо.

В 1947 году в г.п. Шарковщина имелось 6 магазинов из них 3 специализированных: по продаже хлеба, строительных ихозяйственных товаров и культмаг. На селе было 31 магазин и лавка.

Имелся солевый склад на 70 тонн, керосино-хранилище на 20 тонн, погреб 30 м. куб. и 3 общественно-складские помещения общей площадью 130 кв. м. Населению было продано в 1947 году товаров на сумму 9153000 рублей (в тех же ценах и денежной единицы).

Для доставки товаров в магазины имелось 2 грузовые бензиновые машины и 10 лошадей. однако эти автомашины были старые и в работе в году находились 93 дня и перевозили 40 тонн грузов, а остальное время находились в ремонте в ожидании его.

Сеть общественного питания представлялась одной чайной на 40 посадочных мест.

Райпотребсоюз занимался заготовительной деятельностью, выпуском продукции ширпотреба, выпечкой хлеба, заготовкой деловой древесины дров.

В хлебопечении было занято 5 человек и 1947 году выпечено 123 тонны хлеба из них 74 тонны из ржаной муки простого помола и 49 тонн из ячменной и овсяной. Расходовано 33 куб. м. дров.

В райпотребсоюзе имелся земельный участок в размере 25 га. Паши на которых выращивалось 14 га. зерновых, 3 га. картофеля, 0,3га. овощей. Урожайность зерновых составила 4,5 цнт. с гектара, картофеля 60 цнт. с га. Имелось 6 голов свиней мясо от забоя которых использовалось для приготовления блюд в чайной.

Работало в системе райпотребсоюза 135 человек.

Становление потребительской кооперации района проходило нелегко и не просто. Успехи достигались благодаря самоотверженному труду её работников и пайщиков.

В 1962 году Шарковщинский район был упразднён и его территория включена в состав Поставского, Глубокского, Миорского, Браславского районов. Аналогичным образом была разделена и потребительская кооперация. В 1966 году Шарковщинский район вновь был восстановлен в ранее существующих границах. Восстановлен и районный потребительский союз, председателем которого был избран Пахилко Виктор Анатольевич. (1966-1967г.).

Председатели районного потребительского союза (райпо):

Бутрамеев Михаил Григорьевич (1967-1974.);

Кондратенко Евгений Фомич (1974-1997);

Гукепшев Рашид Сагидович (1997-2002);

Билько Инна Михайловна (1997-2002.);

Сятковская Вера Владимировна (2003-2008.);

Кирилов Евгений Фомич (2008-2010);

Далецкий Александр Диславович (2010-2013);

Петрова Наталья Алексеевна(2013-2015).





На долю райспажыўтаварыства ў 2012 годзе прыходзілася 42,7 працэнта рознічнага тавараабароту ў раёне. З арганізацыяй гандлёвага абслугоўвання насельніцтва непасрэдна звязана яшчэ адна важная задача – нарыхтоўчая. Райспажыўтаварыства вядзе нарыхтоўку больш за 20 відаў сельскагаспадарчай, дзікарослай, другой сыравіны.

Штогод у мерапрыемтсвах міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” прымаюць удзел у выяздным гандлі работнікі “Шаркаўшчына Торг”. Па выніках праведзенага выязднога гандлю ў 2014 годзе занялі першае месца ў вобласці, прадаўшы тавараў на агульную суму 339 мільёнаў рублёў. Гэта даказвае, што наша харчовая прадукцыя высокай якасці і прыходзіцца па кішэні кожнаму пакупніку.

5 ліпеня 2014 года, адзначаўся Дзень кааперацыі, якому быў прысвечаны ўрачысты сход, на якім прысутнічалі лепшыя прадстаўнікі сістэмы раённага спажывецкага таварыства.

Сярод запрошаных гасцей былі намеснік старшыні праўлення Віцебскага аблспажыўсаюза Віктар Шуляк, кіраўнік справамі райвыканкама Вольга Малюгіна, дырэктар УП “Полацкая універсальная база” Ларыса Краўчыня і намеснік дырэктара дадзенага ўнітарнага прадпрыемства Алена Высоцкая.


Віктар Шуляк уручае Ганаровую грамату аблспажыўсаюза Вользе Альшэўскай

*Віктар Шуляк уручыў Ганароваю грамату аблспажыўсаюза прадаўцу аўтамагазіна Вользе Альшэўскай.*

Кіраўнік справамі райвыканкама Вольга Малюгіна ўзнагародзіла Ганаровымі граматамі раённага выканаўчага камітэта вадзіцеля Віктара Казлоўскага і бухгалтара Алену Шкель. Старшыня праўлення райспажыўтаварыства Наталья Аляксееўна Пятрова ўручыла граматы райспажыўтаварыства спецыялісту аддзела кадраў Аксане Івановай, вядучаму бухгалтару Леанідзе Тараракa, начальніку сектара якасці, стандартызацыі і сертыфікацыі Марыне Хайноўскай, нарыхтоўшчыку Ірыне Бягун, вядучаму бухгалтару аддзела нарыхтовак і знешнеэканамічнай дзейнасці Анне Сільвановіч, прадаўцу Надзеі Бурэль, спецыялісту па рабоце з пастаўшчыкамі Людміле Лабуць, калектыву міні-кафэ “Піцэрыя”.

Падзякамі таксама адзначаны намеснік начальніка планава-эканамічнага аддзела Святлана Шастакевіч, рахункавод сектара фінансава-разліковых аперацый Ірына Дулінец, нарыхтоўшчык Зінаіда Кавалёнак, вытворца мясных паўфабрыкатаў Валянціна Курэц, аператар ЭВМ Алена Шыдлоўская, прадавец Наталля Курачонак, грузчык аддзела арганізацыі гандлю Часлаў Казлоўскі, грузчык аддзела нарыхтовак Пётр Глымбоцкі.

У пачатку 2014 года быў праведзены конкурс прафмайстэрства, вынікі якога падвяла старшыня прафсаюзнага камітэта Эма Дудко. Імі сталі кладаўшчык гандлёва-размеркавальнага склада Ніна Пятрашка, прадавец магазіна № 135 аг. Більдзюгі Алена Далецкая, прыбіральшчыца ўніверсама “Родны кут” Ніна Туронак, нарыхтоўшчык аг. Германавічы Жана Высоцкая, кандытар Вольга Ваштаёнак, прадавец магазіна № 139 в. Пашкі Святла Бондар, начальнік кантрольна-рэвізійнага аддзела Ірына Якаўлева, выконваючая абавязкі галоўнага бухгалтара Жана Туронак, начальнік планава-эканамічнага аддзела Маіна Зіміна, першы намеснік старшыні праўлення райспажыўтаварыства Жанна Васюцёнак і кіраўнік арганізацыі Наташа Пятрова.



Узнагароджаныя Ганаровымі граматамі райспажыўтаварыства разам з кіраўніком арганізацыі Н. Пятровай (чацвёртая злева)

Спажывецкая кааперацыя мае немалаважную ролю ў жыцці краіны і аказвае станоўчы эфект на развіццё эканомікі. Традыцыйна Міжнародны дзень спажывецкай кааперацыі адзначаюць у першую суботу ліпеня. На ўрачыстым сходзе ў раённым цэнтры культуры да прысутных калег са словамі віншавання звярнулася дырэктар Полацкай універсальнай базы Ларыса Іванаўна Краўчыня. Потым Ларыса Іванаўна разам з дырэктарам кансервавага завода Сяргеем Мікалаевічам Макаранкам уручылі Ганаровыя граматы, Падзякі, грашовыя прэміі і, канечне ж, кветкі лепшым работнікам філіяла.





*загадчыца магазіна “Ваш выбар” Ірына Юльянаўна Ляскоўская*

З самага пачатку снежня святочнае афармленне большасці гандлёвых аб’ектаў нагадвае нам, што набліжаюцца Каляды і Новы год — самыя чаканыя і любімыя зімовыя святы. Мяняецца аблічча магазінаў, у гандлёвых залах вырастае цэлы лес ёлак, упрыгожаных навагоднімі цацкамі, усюды мішура, сотні навагодніх гірляндаў асвячаюць вуліцы, а прыгожа афармленыя вітрыны нагадваюць нам пра акцыі і разнастайныя скідкі.

Некаторыя прыемныя бонусы да свята жыхарам і гасцям нашага раёна падрыхтавалі таксама і работнікі спажывецкай кааперацыі. Як адзначыла падчас размовы з карэспандэнтам начальнік аддзела арганізацыі гандлю філіяла “Шаркаўшчынскі кансервавы завод” УП “Полацкая ўніверсальная база” Людміла Данілаўна Лагунёнак, даволі шмат прыемных сюрпрызаў прапануе сваім наведвальнікам магазін “Ваш выбар”, размешчаны насупраць рынку. На працягу ўсяго снежня ў гэтым гандлёвым аб’екце праходзіць акцыя “Тавар дня”, і ў залежнасці ад таго, які гэта дзень тыдня, прадугледжваецца продаж па зніжаных цэнах такіх тавараў, як пледы, карціны, сувеніры, дзіцячыя веласіпеды, цацкі, парфумерыя. Скідка на “Тавар дня” складае 10 працэнтаў.

У залежнасці ад пажаданняў пакупнікоў супрацоўнікі магазіна  камплектуюць і прыгожа афармляюць навагоднія падарункі да свята. Акрамя гэтага, у магазіне “Ваш выбар” ажыццяўляецца продаж складанабытавой тэхнікі (параваркі, кухонныя камбайны, электрамясарубкі) без гандлёвых надбавак (гэта значыць, па цэнах вытворцы). Напярэдадні Новага года “Ваш выбар” прапануе дзіцячыя карнавальныя касцюмы напракат.

У гэтым жа гандлёвым аб’екце ў пакупнікоў ёсць магчымасць набыць неабходны тавар у крэдыт, які выдаецца на 3 месяцы без працэнтаў і без першапачатковага ўзносу, на суму да 300 рублёў. Круглы год кожную пятніцу ў магазіне праходзіць акцыя “Дзень імянінніка”. Яе сутнасць у наступным. Пры пакупцы тавараў на суму звыш 50 рублёў імяніннік месяца пры прад’яўленні пашпарта атрымлівае скідку 15 працэнтаў.

У цяперашні час гандлёвыя прадпрыемствы, што ўваходзяць у сістэму спажывецкай кааперацыі, прымаюць заказы ад насельніцтва на выраб святочных тортаў і іншай кандытарскай прадукцыі. А міні-кафэ “Піцэрыя”, кафэ “Сустрэча” (Шаркаўшчына) і міні-кафэ “Міраж” (аграгарадок “Буеўшчына”) запрашаюць усіх жадаючых правесці навагоднія святы ў прадпрыемствах грамадскага харчавання. Прымаюцца заказы на абслугоўванне.

## 2017 год



*Калектыў магазіна "Журавінка"*

Прадаўцы ў магазіне "Журавінка" па выніках года прызнаны лепшымі. Дзяўчаты разам з загадчыцай магазіна заўсёды імкнуцца прадаставіць поўную інфармацыю пра тавар, строга кантралююць срокі рэалізацыі прадукцыі. Адметнымі рысамі калектыву з'яўляюцца аператыўнасць у рабоце, уважлівыя адносіны да людзей, ветлівасць і дабразычлівасць. Толькі на такіх умовах можа існаваць сучасны гандаль, і задаволены пакупнік абавязкова стане пастаянным наведвальнікам гандлёвай кропкі.

# “Ганна” – новы магазін кулінарыі ў Шаркаўшчыне








12 лютага прыемным падарункам для шаркаўчан стала адкрыццё ў цэнтры нашага гарадскога пасёлка  магазіна кулінарыі “Ганна” адкрытага акцыянернага таварыства  “Віцебская бройлерная птушкафабрыка

– Перад намі пастаўлены амбіцыёзныя задачы па расшырэнні сеткі прадаж, і сёння свой чарговы аб’ект мы адкрываем у вашым гарадскім пасёлку,- адзначыла у дзень урачыстага адкрыцця начальнік гандлёвага аддзела ААТ “Віцебская бройлерная птушкафабрыка” Святлана Гудзько. ”. Новы магазін  размяшчаецца  ў будынку райвыканкама, у памяшканні, дзе раней знаходзіўся буфет.Спадзяюся, шаркаўчанам спадабаецца новы гандлёвы аб’ект, адкрыты пры падтрымцы раённай улады.

У новым магазіне кулінарыі прадстаўлены шырокі асартымент прадукцыі уласнай вытворчасці ААТ “Віцебская бройлерная птушкафабрыка”: ахалоджанае і замарожанае мяса птушкі, паўфабрыкаты хуткага прыгатавання, шырокая лінейка гатовай прадукцыі, пачынаючы  ад сыравэнджаных і сыравяленых каўбас і рулетаў і заканчваючы паштэтамі  з субпрадуктаў – усё, што  дапаможа гаспадыні без прамаруджвання,  хутка і проста  прыгатаваць смачны абед . Акрамя гэтага, на вітрынах можна ўбачыць шырокі асартымент кандытарскіх вырабаў, прыправы, сокаў, напіткаў, гарбаты і кавы. Па традыцыі, у дзень адкрыцця “Ганна” рэалізавала для сваіх наведвальнікаў дэгустацыю гатовай прадукцыі ўласнай вытворчасці.

Метад продажу ў новым гандлёвым аб’екце — традыцыйнае абслугоўванне (праз прылавак). Магазін працуе ва ўсе дні акрамя нядзелі з 9.00 да 18.00, у суботу – з 9.00 да 14. 00. Прадукцыю Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі ў нашым гарадскім пасёлку рэалізуе прадавец 5 разраду Таццяна Туронак. А вы ўжо паспелі наведаць новы магазін “Ганна”?

**Спіс літаратуры**

1. Вучымся быць шчаслівымі: аб маладых прадаўцах магазіна аграгарадка Германавічы // Кліч Радзімы, -- 2011. – 4 ліпеня (№ 53). – С.11.

2. Кааперацыя – дзень сённяшні: кароткі нарыс з гісторыі спажывецкай кааперацыі раёна // Кліч Радзімы. – 2011. – 4 ліпеня (№ 53). – С .11.

3. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с. іл.

# Раённая газета “Кліч Радзімы”

Сямідзесяціголдзе – гэта ўзрост, з вышыні якога можна зрабіць асэнсаваныя вывады, падсумаваць зробленае, упэўніцца ў правільнасці выбранай тэматычнай накіраванасці. Заглянем у мінулае. Ваеннае ліхалецце, разбураная народная гаспадарка, пакалечаныя лёсы людзей… Менавіта ў такі цяжкі для беларускага народа час і было прынята рашэнне Шаркаўшчынскага райкама партыі аб выданні свайго друкаванага органа.

Першым рэдактарам “Сялянскай праўды”, пасля заканчэння курсаў па падрыхтоўцы партыйна-савецкіх работнікаў пры ЦК КПБ(б), стаў Фама Семуроў. Нялёгкімі аказаліся першыя крокі. Адсутнасць падрыхтаваных кадраў і паліграфічнай базы, транспарту, шмат іншых цяжкасцей даводзілася пераадольваць супрацоўнікам газеты, каб чарговы нумар, а тыраж складаў 500 экзэмпляраў і друкаваўся ў Глыбокім, своечасова даходзіў да чытача. Асноўная тэматыка – інфармацыя аб падзеях у краіне, прапаганда перавагі калектыўнага ладу жыцця.

“Калгасны шлях” – пад такой назвай газета пачала выходзіць з 1950 года і стала пераемніцай “Сялянскай праўды”. Да 1967 года газету рэдагавалі Будзько, Голубева, Гапееў, Вальдэмараў.

Найбольшы росквіт перыядычнага друку пачаўся з 1967 года пасля аднаўлення раёна. Рэдактарам быў зацверджаны Сяргей Канстанцінавіч Шынкевіч. У друкарні было ўстаноўлена даволі сучаснае на той момант паліграфічнае абсталяванне, адпаведную адукацыю мелі і творчыя работнікі. 4-палосная «Кліч Радзімы» даходзіла да чытачоў тры разы на тыдзень.

На жаль, з-за цяжкай хваробы ў росквіце творчых сіл пайшоў з жыцця Сяргей Канстанцінавіч, а справу яго прадоўжыў Ігар Канстанцінавіч Баразна. Затым на працягу 17 гадоў рэдакцыйны калектыў узначальваў Эдуард Аляксандравіч Корсак.

Сённяшні калектыў “Кліч Радзімы” дружны, зладжаны, які з перспектывай глядзіць у будучыню. Апошнім часам ён значна памаладзеў – сярэдні ўзрост творчых работнікаў складае каля 30 гадоў. Старэйшыя калегі імкнуцца перадаць маладым накоплены вопыт, а моладзь прынесла новае бачанне і ўспрынятцце жыцця, энергію і аптымізм, што патрэбна сёння як ніколі.



# З успамінаў былога адказнага сакратара газеты Віктара Сухарава

У 1963-м годзе былі аб’яднаны два раёны, калгасна-саўгасны парткам размяшчаўся ў Міёрах, а газета пад назвай “Сцяг працы” выходзіла ў Шаркаўшчыне. Рэдактарам газеты быў Аляксандр Гапееў. Намеснікам яго працаваў Аляксандр Агурцоў, а адказным сакратаром – Адам Бабскі, вельмі таленавіты журналіст, які ўвесь працоўны шлях прысвяціў журналісцкай справе. Свой багаты жыццёвы вопыт ён ахвотна перадаваў маладым карэспандэнтам. Сакратар вучыў, як трэба рыхтаваць матэрыялы ў газету, калі правіў заметкі ці замалёўкі, абавязкова даходліва тлумачыў, як лепш пабудаваць сказ, падабраць ці замяніць слова, даць загаловак. Загадчык аддзела пісьмаў Герман Кірылаў таксама быў таленавітым творчым работнікам. Ён закончыў факультэт журналістыкі БДУ. Спачатку працаваў сакратаром Шаркаўшчынскага райкама камсамола, а потым – у раённай газеце “Сцяг працы”. У 1965 годзе ён быў прызначаны намеснікам рэдактара полацкай газеты “Сцяг камунізму”. Затым працаваў уласным карэспандэнтам абласной газеты “Віцебскі рабочы”, карэспандэнтам полацкай шматтыражкі “Трудовая смена” вытворчага аб’яднання “Шкловалакно”. Асобнымі кніжкамі выдаў раман “Пах жыта”, аповесць “Піраміда”, зборнік апавяданняў “Падлетак”. У іх адлюстраваў ваенныя падзеі ў родных болкалаўскіх і шкунціцкіх мясцінах. Доўгі час фотакарэспандэнтам працаваў Пётр Баброўскі.

Асабіста я ў газету “Сцяг працы” прыйшоў са школы ў 1963 годзе, дзе выкладаў рускую мову і літаратуру пасля заканчэння філфака Магілёўскага педінстытута. Працаваў ва Улінаўскай і Стральцоўскай школах. Калі ў 1966 годзе аднавілі Шаркаўшчынскі раён, то сакратар райкама партыі Іраіда Аношка запрасіла мяне ў рэдакцыю газеты “Кліч Радзімы”, якую рэдагаваў вопытны журналіст Сяргей Шынкевіч. Пад яго кіраўніцтвам я працаваў адказным сакратаром аж да 1975 года. Пры маёй бытнасці карэспандэнтам была Яўгенія Бондар, карэктарамі – Зоя Знорка, а з 1966 па 1968 год – Тамара Даршчонак (Бабіч).

З 1973 года стала працаваць машыністкай Франя Казлоўская, адукаваная, старанная і адказная жанчына. Былі жанчыны наборшчыцамі і вярстальшчыцамі ў друкарні, але яны часта змяняліся. Намеснікам рэдактара працаваў Артур Карэнька, які пасля стаў рэдактарам браслаўскай газеты.

# З успамінаў Франі Казлоўскай

Я прыйшла працаваць у рэдакцыю пасля заканчэння сярэдняй школы на пасаду машыністкі. У рэдакцыі калектыў складаўся з маладых, але ўжо вопытных журналістаў. Адказным сакратаром быў Віктар Сухараў, затым змяніў яго Расціслаў Мележ, ад яго пераняла сакратарства Вера Кадушка (пасля яе запрасілі ў рэдакцыю газеты “Віцебскі рабочы”). Аддзел пісем узначальваў Фама Рамашка (шмат пісем дасылалі пазаштатныя карэспандэнты), ён пісаў дзіцячыя замалёўкі і выдаў кнігу “Жывы барометр” у дзяржаўным выдавецтве, сельгасаддзелам кіраваў Вячаслаў Смятанка, ад яго пасаду пераняў Віталій Мацук. У хуткім часе прыйшоў працаваць у рэдакцыю газеты брат рэдактара – Веніямін Шынкевіч, фотакарэспандэнтам уладкаваўся Іван Супранёнак.



У друкарні працаваў дружны калектыў, які згуртавала Марына Баравік. Ёй самой даводзілася не раз стаяць за друкарскай машынай, каб давесці газету да тых “кандыцый”, дзякуючы якім яна падабалася нашым чытачам. Журналісты і паліграфісты рабілі адну справу – выпускалі газету. Складаная была тады праца паліграфістаў. У катлах лінатыпаў плавіўся гарт – сплаў свінца, волава і сумры для адліўкі газетных радкоў, лінеек, прабельных матэрыялаў. Гэтая сумесь была шкоднай для здароўя. Вёрсткай газеты займаліся жанчыны. Гэта былі Марыя Няміра, Фаіна Зуй, Яўгенія Ляшко і многія іншыя. З 1982 па 1990 год лінатыпісткай працавала Галіна Бондар, разам з ёй Іна Касарэўская, Ала Кожух, друкаром – Галіна Шыман. Гэта была нялёгкая праца. Але многія з іх, у тым ліку і Бярнард Рачыцкі, які рыхтаваў гарт і шмат іншых пабочных работ выконваў, адпрацавалі аж да закрыцця друкарні.



Здаралася так, што ў тыя часы вёрстка газетнай паласы расцягвалася на некалькі гадзін і бывала, што плаўна пераходзіла з дзённай фазы ў вячэрнюю, а то і начную, бо гэты працэс быў вельмі складаны і працаёмкі. Былі і розныя казусы і няўдачы. І як бы там ні было, а газета выходзіла тры разы на тыдзень і чытач яе атрымліваў своечасова.

# З успамінаў Кацярыны Мар’янаўны Сосна

“Пачатак маёй журналісцкай дзейнасці адносіцца да 1983 года. Прыйшла ў рэдакцыю, дзе працавалі: рэдактарам – Сяргей Шынкевіч (рэдагаваў газету з 1966 па 1984 год), намеснікам рэдактара – Ала Панкратава, адказным сакратаром (пасля працы ў камсамоле) – Эдуард Корсак, загадчыкам аддзела пісьмаў Фама Рамашка, карэспандэнтамі Віталій Мацук, Таццяна Лазоўская, Мікола Воранаў (пісьменнік, з-пад пяра якога выйшлі раманы “Ветраны дзень”, “Перад адлігай”, “Маланка паліць жыта”, “Вадалазы”), фотакарэспадэнтам – Іван Супранёнак. Бухгалтэрыю вяла Таісія Полазава. Машыністкай працавала Валянціна Андрэйчык. Вазіў карэспандэнтаў на УАЗіку Ананій Буйчонак.

Першую газету падпісаў у якасці рэдактара 9 жніўня 1984 года Ігар Баразна. Месца галоўнага фінансіста заняла Рыма Бекманюк, а крыху пазней сакратара-машыніcткі – Марына Грыдзюшка.

З 1994 года рэдактарам раённай газеты “Кліч Радзімы” стаў Эдуард Корсак.

Разам з газетай у нагу крочыць раённае радыё. На працягу больш 30 гадоў выходзіць у эфір Барыс Войтаў.

У 1998 годзе на старонках раённай газеты сталі з’яўляцца заметкі пад подпісам Аляксандра Барылы. Рэдактар заўважыў яго журналісцкія здольнасці і запрасіў працаваць у рэдакцыю. Для нас ён быў проста Саша, які настойліва, самастойна (завочна) вывучаў журналісцкую справу. З верасня 2011 года ён узначальвае рэдакцыю раённай газеты “Кліч Радзімы”. Абнавіўся калектыў, уліліся маладыя здольныя журналісты, якія гатовыя адлюстраваць на старонках газеты ўсё тое, што цікавіць чытача. Рэдакцыйны калектыў, пачынаючы ад рэдактара і ўсіх творчых работнікаў да карэктара, бухгалтара, вадзіцеля – гэта адзіная каманда, якая дзейнічае дзеля адной мэты – выпуску газеты. Гэта патрабуе зладжанай дзейнасці ўсіх звёнаў рэдакцыйнага апарату і робіцца для чытача.



# Спрыяльная для творчасці атмасфера:
# з успамінаў андрэя бурца

Працаваць у “Кліч Радзімы” мяне накіравалі пасля тэрміновай службы ў арміі. Памятаю, як дэкан нашага факультэта, да якога я прыехаў за размеркаваннем, сказаў: “Ёсць месца карэспандэнта ў Шаркаўшчыне, згодны?” Я згадзіўся, а вярнуўшыся дадому, пачаў шукаць на карце, дзе ж гэта Шаркаўшчына знаходзіцца. Прыехаўшы ў гарадскі пасёлак на ранішнім цягніку, прайшоўся, прыглядаючыся, па вуліцах Шаркаўшчыны, адшукаў рэдакцыю, дзе ў кабінеце рэдактара мяне сустрэў Эдуард Аляксандравіч Корсак – энергічны, жартаўлівы мужчына. Пачуўшы, што журналісцкага стажу ў мяне няма, ён запэўніў, што з мяне зробяць сапраўднага карэспандэнта, а даведаўшыся, што я нежанаты, паабяцаў, што яшчэ і жэняць. Першыя крокі ў прафесіі не былі такімі ўжо простымі для мяне, памятаецца, як доўга сядзеў над матэрыяламі. Вельмі ж хацелася напісаць так, каб мае словы абавязкова знайшлі водгук у свядомасці чытача, каб чытаць мае матэрыялы было цікава, а часам няхай бы мае радкі і выклікалі ўсмешку, бо ўзняць чалавеку настрой – гэта таксама каштоўна.

Тыя 5 гадоў, што я працую ў рэдакцыі, далі мне важны вопыт работы са словам – падабраць трапны выраз, пісьменна і правільна пабудаваць фразу, каб данесці сваю думку пра чытача. Усё гэта не так ужо і проста, як можа здацца з першага погляду. А яшчэ работа карэспандэнта – гэта пастаянныя сустрэчы з людзьмі Шаркаўшчынскага краю, якія неслі шмат цікавага. Працаўнікі сяла, педагогі, прадстаўнікі самых разнастайных прафесій, мудрыя пражытымі гадамі пажылыя людзі, сустрэча з кожным, можа нават і невялікая па часе, давала нешта сваё. Грунтуючыся на ўсіх гэтых сустрэчах, магу сказаць, што людзі тут жывуць працавітыя, гасцінныя, любяць ужыць трапнае жартаўлівае слова.

Калі казаць пра калектыў, ён у нас невялікі, але дружны, тут кожны прафесіянал сваёй справы і пры неабходнасці падтрымае іншага. Увогуле, у рэдакцыі пануе дэмакратычная, спрыяльная для творчасці атмасфера. Яна была і пры Эдуардзе Аляксандравічы Корсаку, падтрымлівае яе і цяперашні рэдактар Аляксандр Іванавіч Барыла. З самага першага дня работы ў рэдакцыі я атрымаў творчую свабоду, вельмі патрэбную ў гэтай прафесіі.

# Пазаштатныя карэспандэнты – людзі высокага абавязку

Цяперашнія нумары раённай газеты складаюцца ў асноўным з матэрыялаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца штатныя карэспандэнты рэдакцыі. Перыядычна свае артыкулы дасылаюць нам вучні, якія ўваходзяць у школьныя гурткі юных журналістаў. Не парывае сувязі з "раёнкай" даўні яе сябра краязнаўца Клiменцій Арсеньевіч Кожан, публікацыі якога на гістарычную тэматыку заўсёды размяшчаюцца на старонках нашага выдання, уяўляюць цікавасць для чытача.

Пагартаўшы падшыўкі "Кліч Радзімы" перыяду 60-80-х гадоў, амаль у кожным нумары знаходзіш матэрыялы, аўтарамі якіх былі юныя карэспандэнты з навучальных устаноў, рабочыя і сельскія карэспандэнты арганізацый, прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў. Іх пісьмы друкаваліся пад рубрыкамі "У нашай школе", "З рэдакцыйнай пошты", "З вамі гутарыць юрыст", "Пісьмы нашых чытачоў", "Паведамляюць селькоры" і іншыя. Аб чым жа пісалі пазаштатныя карэспандэнты? Якую інфармацыю хацелі данесці яны да чытача? У іх допісах – школьнае жыццё, будні і святы калгаснікаў, патрабаванні працоўных, крытычныя сігналы, наогул, рэчаіснасць савецкага перыяду. Цікавыя матэрыялы прыходзілі ад вучняў Слабадской СШ (С. Зарэцкая), Іёдскай СШ (А. Ермаковіч, Ж. Лаўрыновіч), Лонскай васьмігодкі (Л. Пазняк). Чытачам газеты добра вядомы імёны Людмілы Лабачэўскай і Надзеі Брэскай. Дарогу на шырокую ніву творчасці адкрыла ім менавіта "Кліч Радзімы".

Цесную сувязь з нашым перыядычным выданнем трымалі сельскія карэспандэнты: В. Цітовіч – к-с імя Леніна, І. Кабранаў, Я. Калліннік, І. Шчэмелеў – с-с "Гарадзец", В. Манкевіч – к-с "Камсамолец", І. Лось, А. Бункевіч – к-с імя Калініна, Р. Заяц, М. Свідэрскі – к-с імя Фрунзе, Л. Бруйка, Р. Шпец, П. Жынгель – к-с "Маяк", В. Катовіч – к-с "Буравеснік", А. Якімовіч – к-с "Шлях Леніна", К. Крыўко – к-с "Прагрэс", Т. Мяцеліца – к-с імя Ільіча, А. Таўкінь – к-с імя Даватара, Т. Кабак – к-с "Камінтэрн", А. Ластаўка – к-с "Вялікае Сяло", А. Лонскі – с-с імя Маркава, М. Брэскі, Л. Чабатаронак і Р. Лысёнак – к-с "Іскра". Іх матэрыялы, замалёўкі, артыкулы з цікавасцю ўспрымалі чытачы, чэрпалі для сябе карысную інфармацыю. А яшчэ, у кожным сельгаспрадпрыемстве выдавалася свая сценгазета, аўтарамі артыкулаў якой былі звычайныя вяскоўцы. Так, у калгасе "Іскра" ў рэдкалегію ўваходзілі Іосіф Волк – брыгадзір, бухгалтары Соф'я Кішкурна і Галіна Касарэўская, трактарыст Л. Чабатаронак. Дарэчы, апошні быў не толькі перадавым механізатарам гаспадаркі і пазаштатным карэспандэнтам раённай газеты, ён яшчэ і выдатна складаў вершы, якія друкаваліся ў "Кліч Радзімы", пісаў сцэнарыі канцэртных праграм для Жукоўшчынскага СДК.

З 1973 года геаграфія селькораўскага руху значна пашырылася. Свае творы, вершы і малюнкі, сталі дасылаць у Шаркаўшчыну паэт і мастак з Петразаводска Пётр Касцюкевіч, выкладчык з Віцебска Пётр Сідараў, работнік бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР Леанід Верашчака і іншыя.

Падтрымлівалася цесная сувязь рэдакцыі з пазаштатнымі карэспандэнтамі. Для іх штогод праводзіліся раённыя злёты, сустрэчы, на якіх абмяркоўваліся пытанні двухбаковай узаемнай работы па ўзмацненні прапагандысцкай ролі газеты і далейшай яе сувязі з аўтарскім актывам. Для сельскіх карэспандэнтаў у гэтых мэтах пры рэдакцыі былі створаны і пазаштатныя аддзелы — ваенна-патрыятычнага выхавання, юрыдычны, школьны.

Заўважаць тое, што нябачна для іншых – асноўнае, што ставілі перад сабой у рабоце селькоры. Яны даносілі да чытача жыццёвую праўду натхнёна і ўдумліва. Кожны з іх пісаў не толькі пра гаспадарчае жыццё калгасаў і саўгасаў, прадпрыемстваў, але і глыбока ўнікаў у тагачасную перабудову вёскі, яе культуру, быт, псіхалогію чалавека.

**Спіс літаратуры**

1. Барыла, А. Сямідзесяцігоддзе газеты / А. Барыла // Кліч Радзімы. – 2014. – 6 снежня (№ 97). – С. 1.
2. Бурэц, А. Спрыяльная для творчасці атмасфера / А. Бурэц // Кліч Радзімы. – 2014. – 6 снежня (№ 97). – С. 2.
3. З успамінаў былога адказнага сакратара газеты Віктара Сухарава // Кліч Радзімы. – 2014. – 6 снежня (№ 97). – С. 2.
4. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с., іл.
5. Райчонак, С. Пазаштатныя карэспандэнты — людзі высокага абавязку / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2014. – 6 снежня (№ 97). – С. 3.

# Гісторыя Шаркаўшчынскага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства меліяратыўных сістэм

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР ад 12 снежня 1969 года №408 Міёрскае будаўніча-мантажнае ўпраўленне Віцебскага абласнога меліярацыйнага трэсту, якое знаходзілася ў пасёлку Клётаў Двор, было пераведзена ў г.п. Шаркаўшчына і перайменавана ў Шаркаўшчынскае будаўніча-мантажнае ўпраўленне (загад Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі ад 15 чэрвеня 1970года №297). Шаркаўшчынскае БМУ ўзначаліў Жэрнаклёў Іван Іванавіч.

У 1970 годзе ў БМУ працавала 348 чалавек, з іх 38 ІТР і служачых. У гэтым жа годзе былі пабудаваны адміністрацыйны будынак, тры шчытавыя трохкватэрныя дамы, распачата будаўніцтва аўтагаража на 25 машын і 18-ці кватэрнага жылога дома. Для нарошчвання аб’ёмаў выконваемых падрадных работ у прадпрыемства востра адчуваўся недахоп кадраў. Улічваючы гэта, вялікае значэнне ўдзялялася будаўніцтву жылля. За гады існавання арганізацыі пабудаваны цэлы пасёлак меліяратараў, здадзена 283 кватэры агульнай жылой плошчай каля 15 тысяч квадратных метраў, інтэрнат на 50 месц, рамонтная майстэрня, склады, дзіцячы садок, сталовая і магазін.

З лістапада 1971 года па верасень 1998 года калектыў меліяратараў узначальваў Альсевіч Эдмунд Антонавіч. У 1975 годзе Шаркаўшчынскае будаўніча-мантажнае ўпраўленне было перайменавана ў Шаркаўшчынскую ПМК-51 (загад ад 12.05.1975 г. №369.), асноўным відам дзейнасці якой было меліярацыйнае будаўніцтва. 1977 год стаў знамянальным для ПМК-51. Сярод аналагічных арганізацый трэста “Полацкводбуд” шаркаўшчынскія меліяратары занялі першае месца і другое месца – па рэспубліцы. У 1978 годзе на базе Шаркаўшчынскай ПМК-51 адбыўся семінар меліяратараў Беларусі.

На аб’екце “Беларусь” яны знаёміліся з вопытам работы на цяжкіх суглінках, была паказана тэхніка, якая выпускаецца айчыннымі заводамі. На семінары тлумачэнні давалі вучоныя навукова-даследчых інстытутаў, прадстаўнікі заводаў, што выпускаюць меліярацыйную тэхніку. У рабоце семінара прынялі ўдзел намеснік міністра БССР Л.І. Бервічавец, першы сакратар райкама партыі А.Г.Шманцар.

Меліярацыйныя аб’екты ПМК-51 у 70- ыя гады былі раскіданы па землях калгасаў імя Гагарына, імя Фрунзе, “Маяк”, “Свабода”, “Беларусь”,”Іскра”, саўгасе “Верацеі”.

Па выніках работы ў 1978 і 1979 гадах калектыў ПМК-51 быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

У 1988 годзе прадпрыемства выканала два гадавыя планы па ўводу магутнасцей. Планы выконваліся дзякуючы вопытным арганізатарам работ. Прыклады высокапрадукцыйнай працы паказвалі прарабы Іван Іларыёнавіч Смерцеў, Віталій Андрэевіч Язёнак, Мікалай Канстанцінавіч Зялёнка і многія іншыя работнікі.

З 15 па 24 жніўня 1989 года на аб’екце “Княж”, што на тэрыторыі калгаса “Свабода”, праходзілі рэспубліканскія спаборніцтвы машыністаў аднакоўшавых экскаватараў. Экіпаж Віталія Браніслававіча Бохана заняў трэццяе месца. Як вынік напружанай 10-дзённай працы – 7620 кубічных метраў грунту.

ПМК-51 з’яўляецца базавай гаспадаркай Шаркаўшчынскай сярэдняй школы №2. Таму меліяратары аказалі значную дапамогу пры яе ўзвядзенні.

**За перыяд дзейнасці арганізацыя змяніла некалькі назваў**:

У 1995 годзе Шаркаўшчынская ПМК-51 перайменавана ў Шаркаўшчынскае будаўніча-эксплуатацыйнае прадпрыемства меліяратыўных і воднагаспадарчых сістэм (загад ад 06 снежня 1995 года №206).

У 2001 годзе – у рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства меліяратыўных сістэм (загад ад 20 мая 2001г №176), у 2003 годзе – у Шаркаўшчынскае камунальнае ўнітарнае прадпрыемства меліяратыўных сістэм “Шаркаўшчынская ПМС” (загад ад 28 лютага 2003 года №109).

## ПМС: дзень сённяшні

З верасня 1998 года прадпрыемства ўзначальвае Дзіковіч Анатолій Сямёнавіч



На балансе Шаркаўшчынскай ПМС знаходзіцца каля 33 тысяч гектараў дрэніраваных плошчаў і 1,260 кіламетраў каналаў, кожны з якіх патрабуе належнага догляду. У калектыве працуюць 130 чалавек.

Асноўныя аб’екты 2007 года – ачысныя збудаванні ў гарадскім пасёлку і інкубацыйны цэх “Навінкі”. Наладжаны выпуск жалезабетонных агароджаў. Вядзецца будаўніцтва пад’езда да гідралагічнага заказніка Ельня.

У 2009 годзе будаўнічая брыгада была занята ўзвядзеннем малочна-таварнай фермы на 400 галоў у СВК “Княж”, будаўніцтвам трох жылых дамоў у рыбгасе “Навінка” Пастаўскага раёна.

Цэх па вытворчасці жалезабетонных агароджаў рэалізаваў прадукцыі на суму каля 260 млн. рублёў.



*На здымку: бетонныя агароджы*

У 2010 годзе меліяратары былі задзейнічаны ў рэалізацыі праграмы “Чыстыя палі”. Меліяратары ўбіраюць з палёў кусты, вядуць іх падчыстку і планіроўку.



Сіламі будаўнічай брыгады ўзведзена 6 дамоў у аграгарадку Васюкі: 2 цагляныя і 4 шчытавыя.



*На здымку:адзін з домікаў , пабудаваных у Васюках*

Вяліся работы па будаўніцтву інжынернай сістэмы камунікацый па вуліцы Юбілейная.



*укладваннем водаправоду па вул. Юбілейная займаюцца: галоўны інжынер Васілій Бягун, вадзіцель Мікалай Рабіза, рабочыя Пётр Бурэль, Аляксандр Машнюк, Максім Лонскі, Расціслаў Бураўскі*

На 2011 год ПМС выдзелена 1млрд. 370 млн. рублёў. Брыгада ПМС займаецца рэканструкцыяй меліярацыйнай сеткі ў ААТ "Агратэхсервіз", "Васюкі". Завершаны работы ў ААТ "Даватарскі" па ўкладанню дрэнажу і падчышчэнні на плошчы 80 га.



*на аб'екце ў ААТ "Агратэхсэрвіс" працуе брыгада меліяратараў у складзе прараба Івана Лазовіка, машыніста Уладзіміра Меньшэніна, памочніка машыніста Аляксандра Іваноўскага, брыгадзіра Дзмітрыя Суфіновіча, участковага механіка Мікалая Таўкіня, трубаўкладчыка Барыса Іванова, электрагазазваршчыка Яўгена Лазовіка.*

Праходзіць экспертызу праект па будаўніцтву меліярацыйнай сістэмы ў ААТ “Жвіранка”.

Працягваюцца работы па ўзвядзенню насоснай станцыі ў рыбгасе “Навінкі” Пастаўскага раёна і жылых дамоў у КУВСП імя Маркава.

Распачаты работы па аднаўленню гідралагічнага рэжыму на балоце Далбенішкі.

Вядзецца рамонт адміністрацыйнага будынку.

ПМС атрымала квоту на вылаў 700 кг рыбы на азёрах Алашкі і Картэя



## Лепшыя работнікі прадпрыемства 2011 года:

Машыністы аднакоўшавых экскаватараў **Мікалай Мяцеліца, Цімафей Шастакоў, Алег Мілевіч;**

Бульдазерысты: **Валерый Цітовіч, Ігар Радзецкі**;

Механізатары: **Віктар і Аляксандр Лук'янёнкі, Леанід Грыгаровіч**;

Вадзіцелі**: Леанід Невярковіч, Мікалай Рабіза**;

Каменшчыкі: **Віктар Туронак**,

Токар **Веніамін Альшэўскі**, рамонтнік **Ігар Дарафееў**;

Інжынерна-тэхнічныя работнікі: намеснік галоўнага бухгалтара **Марына Пучынская,** начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела **Тэрэза Таўкінь**, участковы механік **Мікалай Таўкінь**, прараб **Дзмітрый Шынкевіч**.

З добрымі паказчыкамі спрацаваў калектыў ПМС у 2012 годзе. Пры плане асваення 10 млрд. 290 млн. рублей фінансавых сродкаў скарысталі 12 млрд. 428 млн. Гэта склала 121% да гадавога плана і 165% да ўзроўню 2011 года.

### Асноўныя работы 2012 года:

- Будаўніцтва новых і рэканструкцыя старых меліяраваных сістэм на тэрыторыі ААТ "Васюкі", "Агратэхсервіса" і "Жвіранка";

Рэканструкцыя жывёлагадоўчых аб'ектаў у аграгарадку Лонскія;

Будаўніцтва цэха ў рыбгасе "Навінкі" Пастаўскага раёна;

Рамонт дарогі на Браслаўшчыну.

Памер заработнай платы за 2012 год склаў 367 долараў ЗША ў эквіваленце.

Асноўныя працоўныя рэсурсы **2013** года былі скіраваны на заканчэнне работ па будаўніцтву меліярацыйных сістэм у ААТ "Жвіранка", "Княж", "Даватарскі" і "Ельня-Агра."

У 2013 годзе ПМС па розных відах работ неабходна было асвоіць 17 млрд. 560 млн. руб. фінансавых сродкаў рэспубліканскага і абласнога бюджэту.

За 5 месяцаў 2013 года тэмпы росту аб'ёма падрадных работ саставілі 145%.

Асноўная каштоўнасць прадпрыемства – яго работнікі. За шматгадовую добрасумленную працу ў меліяратыўнай галіне, высокае прафесійнае выкананне службовых абавязкаў Дэпартаментам па меліярацыі і воднай гаспадарцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь узнагароджаны нагрудным знакам "Ганаровы меліяратар" дырэктар Шаркаўшчынскай ПМС Дзіковіч Анатолій Сямёнавіч,

машыніст экскаватара Мяцеліца Мікалай Серафімавіч, трактарысты Бука Казімір Усцінавіч, Грыгаровіч Леанід Яўгеньевіч, начальнік планава-вытворчага аддзела Таўкінь Тарэса Чаславаўна, участковы механік Таўкінь Мікалай Мікалаевіч.

Трактарыст Лук'янёнак Аляксандр Пятровіч занесены на раённую дошку Гонару.

На прадпрыемстве працуюць сямейныя дынастыі: Шынкевіч Аляксандр Міхайлавіч, трактарыст, яго сын Дзмітрый – прараб, паспяхова працуюць трактарыстамі браты Лук'янёнак Аляксандр Пятровіч і Віктар Пятровіч.

Поспехаў у рабоце дасягнулі і маладыя меліяратары: Седзюкевіч Дзяніс, Цітовіч Валерый, Кавальчук Аляксандр, Асетнік Аляксандр, Суфіновіч Дзмітрый, Мішута Віталій, Паляк Дзмітрый

Меліяратары!
Тварцы вы на зямлі
Меліяратары!
Зрабіць вы цуд змаглі.
За нівы хлебныя,
Лугі зялёныя
Пашана вам і слава на вякі!

## Яны стаялі ля вытокаў



**Альсевіч Эдмунд Антонавіч** нарадзіўся 6 сакавіка 1936 года ў вёсцы Дзмітрыеўшчына Глыбокскага раёна Віцебкай вобласці. Закончыў Залескую сярэднюю школу ў 1953 годзе. Працаваў у Карэліі ў леспрамгасе. Пасля службы ў арміі закончыў Друйскае сельскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча, дзе атрымаў спецыяльнасць машыніста экскаватара. Восем гадоў працаваў у Навадруцкай перасоўнай механізаванай калоне меліярацыі машыністам экскаватара. Завочна закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Больш за пяць гадоў працаваў прарабам Навадруцкай ПМК меліярацыі. У 1971 годзе прызначаны начальнікам Шаркаўшчынскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення (пазней – ПМК-51меліярацыі). Узначальваў калектыў меліяратараў 27 гадоў да 1998 года.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, нагрудным знакам “Ганаровы меліяратар”.

Прысуджана званне “Заслужанага работніка сельскай гаспадаркі”.

Памёр 6 сакавіка 2010 года.



**Эдуард Антонавіч Камінскі** ўсё сваё жыццё аддаў пачэснай і ганаровай справе – абнаўленню зямлі. На многіх сотняў гектараў пераўвільготненных плошчаў ён пакікуў след свайго экскаватара. Пракапаныя ім калектары ў спалучэнні з дрэнажнай сеткай бездакорна нясуць сваю службу, забяспечваючы багатыя ўраджаі, на былых неўрадлівых землях.

Экіпаж Эдуарда Антонавіча не раз выходзіў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве меліяратараў ПМК-51. Планавыя заданні заўсёды перавыконваў на 100%. Многа сіл і энергіі аддаваў моладзі, абучваў і выхоўваў іх прафесіі.

У 1984 годзе яму прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. За шматгадовую працоўную дзейнасць яму прысвоена званне “Заслужаны меліяратар БССР”.



**Эдуард Антонавіч Смулько** быў адным з першых, хто паднімаў цаліну. А з 1980 года пачаў працаваць на экскаватары Э-304 у ПМК-51. Там, дзе прайшоў ён са сваім аднакоўшавым, паабапал калектараў раскінуліся шырокія палі, на якіх наліваецца буйны колас. “Майстар- ювілір”, – так называюць яго таварышы. Планавыя заданні імкнецца заўсёды для яго кроўнай справай, пярвейшым і патрэбным абавязкам. Партрэт Э. А.Смулько ў 1991 годзе быў змешчаны на абласной Дошцы Гонару лепшых людзей вытворчасці. Памёр у 2013 годзе.



**Цімафея Васільевіча Шастакова** ў працоўным калектыве ПМК-51 ведаюць як майстра сваёй справы, рабочага з развітым пачуццём адказнасці. На аднакоўшавым экскаватары ён працуе не адзін дзесятак год. Таму і быў занесены ў 1991 годзе на Галерэю працоўнай славы раёна. Узнагароджаны Ганаровымі граматамі трэста “Полацкводбуд”, райвыканкама і адміністрацыі ПМК-51.



**Віктар Міхайлавіч Палоннікаў** працуе токарам у майстэрні ПМК-51 не адзін дзесятак год. Яму хапае майстэрства для таго, каб вытачыць складаныя дэталі. Узнагароджваўся Ганаровымі граматамі трэста ” Полацкводбуд”, адміністрацыяй ПМК-51. Хоць і знаходзіцца на заслужанным адпачынку,але знаходзіцца ў страі.

**Пётр Уладзіміравіч Курачонак** хутка авалодаў сакрэтамі работы на аднакоўшавым экскаватары. Ён карыстаўся заслужаным аўтарытэтам у калектыве. Зараз на заслужаным адпачынку.

**Пётр Пятровіч Грыдзюшка** працуе трактарыстам у калектыве меліяратараў. Ён займаецца транспартнымі работамі, падвозіць дрэнажныя трубкі, падчапляе тралер з бульдозерам, плугамі выроўнівае палеткі, каб потым на акультураных палетках можна было правесці сяўбу.

У нашым раёне меліярацыя праведзена на плошчы 42553 гектары



## 2015 год

Ад шчырай і добрасумленнай працы работнікаў сістэмы меліярацыі напрамую залежаць паказчыкі ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. Зараз у раёне забалочаныя землі асушаны на плошчы 43 тысячы 709 гектараў, і гэтыя ўчасткі даюць да 50-ці працэнтаў усёй сельгаспрадукцыі гаспадаркам нашага рэгіёну. За 2014 год прадпрыемствам забяспечана выкананне аб'ёму падрадных работ на суму 15 мільярдаў 898 мільёнаў рублёў. Выкананы работы па рэканструкцыі меліраяцыйных сістэм на плошчы 527 гектараў. З іх у ААТ “Даватарскі” – 153 гектары, ААТ “Ельня-Агра” – 189 гектараў. 185 гектараў рэканструявана ў Гарадоцкім раёне. Датэрмінова здадзена ў эксплуатацыю лесагаспадарчая дарога № 13 ДЛГУ “Дзісненкі лясгас” за вёскай Баравое Лужкаўскага сельсавета працягласцю пяць з паловай кіламетраў.

Меліяратары таксама займаліся падрыхтоўкай палёў для здабычы торфу на аб'екце Скураты.

# 2017 год




*прараб Іван Лазовік, галоўны інжынер Мікалай Дубоўскі, бульдазерыст Уладзімір Грыдзюшка і вадзіцель Уладзімір Савейка (злева направа)*

У маі шаркаўшчынскія меліяратары працавалі ў Докшыцкім раёне на будаўніцтве лесагаспадарчай дарогі для патрэб Бягомльскага лясгаса. Цяпер пачаўся сезон тэхнічнага ўходу за водаадводнымі каналамі. Толькі ў нашым раёне трэба правесці іх абкос працягласцю больш адной тысячы кіламетраў. Дадаткова, як і ў мінулыя гады, шаркаўчане будуць дапамагаць выконваць гэты від работы сваім пастаўскім калегам. У суседнім раёне плануецца абкасіць звыш двухсот кіламетраў водаадводных каналаў.




*На ўстройстве каналаў заняты экскаватаршчык Ігар Церахаў*




*Бульдазерыст Валерый Цітовіч праводзіць разраўноўванне кавальераў*

Гэта сезонныя работы, якія меліяратары праводзяць з вясны і да пачатку халадоў. Зімой жа работнікі прадпрыемства займаюцца нарыхтоўкай драўніны для патрэб жыллёва-камунальнай гаспадаркі і для грамадзян. Таксама яны вырабляюць палеты для прыватнага прадпрыемства "Камплект-М", заключаюць дамоўленасці на выкарыстанне энерганасычанай спецтэхнікі з сельгаспрадпрыемствамі раёна на вызначаных відах работ.

Як паведаміла начальнік планава-тэхнічнага аддзела арганізацыі Тэрэза Чаславаўна Таўкінь, зараз Шаркаўшчынскае ПМС зарэгістравана ў агульнадзяржаўным рэгістры вытворцаў работ і паслуг. Таму перыядычна на прадпрыемства дасылаюць прапановы на выкананне тых або іншых работ з іншых рэгіёнаў рэспублікі. Але ў дадзеным выпадку складаным з'яўляецца тое, што аб'екты знаходзяцца на вялікай адлегласці ад Шаркаўшчыны. Тым не менш, шаркаўшчынскія меліяратары не губляюць аптымізму, а ўпэўнена працуюць на карысць нашага раёна, вобласці і краіны.

**Спіс літаратуры**

1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512с., іл.

2. Райчонак, С. Новыя канктакты – перспектывы развіцця / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2015. – 6 чэрв (№ 45). – С. 2.

3. Райчонак, С. ПМС планы выконваюць. – Кліч Радзімы. – 2013. – 1 чэрв. (№ 45). – С. 2.

4. Райчонак, С. Працуюць, не губляючы аптымізму. – Кліч Радзімы. – 2017. – 3 чэрв. (№ 44). – С. 2.

# УАЗ “Шаркаўшчынская ЦРБ”

У 1939 годзе тэрыторыя нашага раёна была вызвалена ад польскай улады. Тады і былі зроблены першыя крокі ў арганізацыі аховы здароўя. Пачалі працаваць 2 бальніцы на 65 ложкаў: 40 ложкаў у райцэнтры і 25 у Германавічах. Адкрыліся ў Шаркаўшчыне амбулаторыя, у Ёдах – медпункт, у Більдзюжскім, Полаўскім, Каўшэлеўскім с/Саветах – фельчарска-акушэрскі пункт.

Медыцынская дапамога аказвалася насельніцтву бясплатна. У 1945 годзе ў раёне працавала 7 урачоў, 30 работнікаў сярэдняга медыцынскага персаналу. Акрамя раёна і 2-х сельскіх бальніц у Германавічах і Іёдах было адкрыта 6 фельчарска-акушэрскіх пунктаў.

У 1946 г. галоўным урачом Шаркаўшчынскага раёна прызначаюць Васілія Усцінавіча Заброцкага.

Пад райбальніцу ўлады выдзелілі сядзібу пана Федаровіча ў Базымполлі, які Васілій Усцінавіч прывёў у належны стан, арганізаваў 5 аддзяленняў: хірургічнае, радзільнае і інфекцыйнае, дзіцячае, тэрапеўтычнае. (фота старай бальніцы)

У 1949 годзе мелася 3 бальніцы на 70 ложкаў, 11 урачоў, 50 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу.

З кожным годам расшыралася сетка медыцынскіх устаноў, умацоўвалася іх матэрыяльная база. У 1955 годзе дзейнічала раённая бальніца, 3 урачэбныя ўчасткі, 9 ФАПаў-пунктаў. Працавалі 8 урачоў і 56 чалавек сярэдняга медыцынскаг персаналу.

У 90-х гадах XX стагоддзя сфера аховы здароўя прадстаўлена Шаркаўшчынскім тэрытарыяльным медыцынскім аб’яднаннем, у якое ўваходзяць цэнтральная раённая бальніца на 135 ложкаў, Германавіцкая ўчастковая бальніца на 25 ложкаў, Лужкаўская ўчастковая бальніца на 75 ложкаў, Іёдская сельская ўрачэбная амбулаторыя, 19 ФАПаў-пунктаў. Працуюць 37 урачоў, 188 работнікаў сярэдняга медыцынскага персаналу. 60% урачоў і столькі ж работнікаў медперсаналу маюць кваліфікацыйную катэгорыю.

У 1997 годзе пачата будаўніцтва новай цэнтральнай раённай бальніцы.

У канцы 2002 года ўвялі ў эксплуатацыю так званы пускавы комплекс бальніцы (дыягнастычны корпус, у якім размешчана паліклінічнае аддзяленне і аперацыйна-рэанімацыйны блок, інжынерныя сеткі).

З 2003 года, пасля таго, як аб'ект выключылі з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы, будаўніцтва на час спынілі.

У 2007 годзе выконваліся работы па будаўніцтве станцыі газазабеспячэння, у далейшым будавалі харчовы блок і палатны корпус .

З 2009 года ў Шаркаўшчыне пачалося будаўніцтва і вось у 2012 годзе мы бачым вынік.

Адкрыццё бальніцы па старой добрай традыцыі прымеркавалі да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Для мясцовых жыхароў гэты дзень стаў сапраўдным святам.

Ахова здароўя раёна прадстаўлена адкрытай у 2012 годзе цэнтральнай раённай бальніцай на 100 ложка-месцаў, паліклінікай на 220 наведванняў у змену, з дзённым стацыянарам на 10 ложкаў БСУ, УБ, У-3, 18 ФАПамі, у якіх працавалі 32 урачы і 172 работніка сярэдняга медыцынскага персаналу.



*Гэтым сімвалічным “залатым ключом” галоўны ўрач ЦРБ Станіслаў Стома адкрывае новую старонку ў ахове здароўя Шаркаўшчыны.*



Шаркаўшчынская ЦРБ абсталявана сучасным медыцынскім і інфармацыйным абсталяваннем: УГД, відэагастраскопам, каланаскопам. У бальніцы адкрыта кіслародная станцыя. З’явіліся новыя віды фізіятэрапеўтычнага лячэння: водалячэнне, цеплалячэнне, святлолячэнне.



Ва ўстанове працуюць такія дапаможныя службы, як:

- клініка-дыягнастычная лабараторыя;
- фізіятэрапеўтычны кабінет;
- кабінет медыцынскай рэабілітацыі;
- станцыя хуткай медыцынскай дапамогі.

Праводзяцца наступныя віды дыягностыкі:

- рэнтгеналагічная;
- ультрагукавая;
- функцыянальная;
- эндаскапічная.

Усе аддзяленні бальніцы абсталяваны сучаснай камп'ютарнай інфраструктурай. У цяперашні час штат бальніцы – 392 супрацоўнікі, з якіх 32 урачы

Звычайна ўсе "экскурсіі" па медыцынскай установе тут пачынаюцца з дзіцячага (педыятрычнага) аддзялення. Відаць, таму, што на другім паверсе левага крыла светлыя палаты, гульнявы пакой для маленькіх дзетак – з вялікай колькасцю цацак, шыкоўнай мэбляй і вялікім плазменным тэлевізарам. Не выключаецца і акалічнасць, што ў гэтым аддзяленні працуе сапраўдны "кветнік" маладых урачоў і медсясцёр, якімі кіруе вопытны і з вялікім стажам спецыяліст педыятрыі – Святлана Магалінская. Радзільны дом абсталявалі інкубатарам для нованароджанных.

**Хірургічнае аддзяленне** раённай бальніцы ўзначальвае Іван Вацлававіч Лаўрыновіч амаль чатыры гады. Загадчыкам быў прызначаны адразу пасля заканчэння Віцебскага дзяржаўнага медуніверсітэта. Пасада вельмі адказная, патрабуе высокага прафесіяналізму, навыкаў і вытрымкі. Нягледзечы на малады ўзрост, Іван Вацлававіч валодае ўсімі пералічанымі якасцямі.



І. В. Лаўрыновіч і П. Г. Качан здымаюць послеаперацыйныя швы ў пацыента

Сярэдні і малодшы медыцынскі персанал у хірургіі – галоўная апора для ўрача ў лячэнні пацыентаў.



*супрацоўніцы хірургічнага аддзялення: Ірына Набздорава, Іна Бельская, Марына Протас, Валянціна Сакалоўская, Тамара Зямец, Вольга Лапацкая і Святлана Лазука*

Пра медсясцёр і санітарак, на чые плечы ўскладзена нялёгкая задача выходжваць цяжкахворых людзей, у тым ліку і пасля складаных аперацый, расказана няшмат. Але менавіта ад якасці іх работы ў вялікай ступені залежыць не толькі фізічны, але і душэўны стан нашых пацыентаў, – паведаміў загадчык хірургічнага аддзялення Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы Іван Вацлававіч Лаўрыновіч. – Сярэдні і малодшы медыцынскі персанал у хірургіі – галоўная апора для ўрача.

У **жаночай кансультацыі** жанчын прыемнай усмешкай сустракаюць: акушэр-гінеколаг Анна Васільеўна Хвяцковіч, акушэры Ірына Іосіфаўна Сарай і Таццяна Сяргееўна Янушкевіч. Работнікі кансультацыі ўсе мясцовыя, не навічкі ў сваёй справе. А.В. Хвяцковіч пасля заканчэння Віцебскага медыцынскага інстытута вярнулася на сваю маленькую радзіму. І.І. Сарай закончыла Полацкае медвучылішча, некалькі гадоў працавала ў суседнім раёне, і ўжо 11 гадоў як у Шаркаўшчыне. Т.С. Янушкевіч пасля заканчэння Полацкага медвучылішча працавала акушэркай у бальніцы і завочна вучылася ў Віцебскім педуніверсітэце па спецыяльнасці біёлаг-эколаг. Аднак працягвае працаваць па ранейшай спецыяльнасці. Спецыялісты кансультацыі клапоцяцца аб жаночым здароўі. А, як вядома, ад здароўя жанчыны залежыць здароўе наступных пакаленняў. Як паведаміла Анна Васільеўна, ім за дзень даводзіцца прыняць да 30-40 пацыентак.

У акушэрска-гінекалагічным аддзяленні зараз ёсць палаты для сумеснага знаходжання маці і яе дзіцяці.



**Тэрапеўтычнае аддзяленне.**

Раіса Станіславаўна Рымчонак у 1989 годзе па размеркаванні трапіла на працу ў нашу раённую бальніцу, дзе спачатку працавала тэрапеўтам, а з 1993 года ўзначальвае тэрапеўтычнае аддзяленне цэнтральнай медыцынскай установы. Бачна, што гэта жанчына, якая цалкам аддае сябе любімай справе, у свой час беспамылкова абрала, няхай і нялёгкую, але і пачэсную і высакародную працу ўрача.



На працягу двух дзясяткаў гадоў урачом анестэзіёлагам-рэаніматолагам працуе Уладзімір Фёдаравіч Майсяёнак, які з 2002 года ўзначальвае **аддзяленне анестэзіялогіі і рэанімацыі** Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы. У гэтым годзе Уладзімір Фёдаравіч стаў адным з лаўрэатаў звання “Чалавек года Шаркаўшчыны-2017”.

Будучы ўрач нарадзіўся ў вёсцы Дворнава, закончыў школу, потым Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Пачынаў працаваць урачом-анестэзіёлагам Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы, потым на працягу двух гадоў павышаў кваліфікацыю ў клінічнай ардынатуры на базе Віцебскай інфекцыйнай бальніцы. Вярнуўся ў свой раён, стаў загадчыкам аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі, у вёсцы Наваселле атрымаў дом, праз год стварыў сваю сям’ю.

- Урач анестэзіёлаг-рэаніматолаг – гэта прафесія, якая як ні адна іншая павінна падыходзіць па духу. У ёй шмат асаблівасцяў. Дзяжурства можа прайсці адносна спакойна, і неабходна проста назіраць за станам цяжка хворага чалавека. А бываюць такія пацыенты, ад якіх не адысці, і трэба за некалькі хвілін прыняць правільнае рашэнне і дзейнічаць адразу, без прамаруджвання. Часам вельмі няпроста не толькі фізічна, але і эмацыянальна разумець, што ад тваіх канкрэтных дзеянняў у дадзены момант, ад хуткасці, уменняў і навыкаў залежыць жыццё чалавека. Работа ўрача – гэта цяжкая фізічная работа, стрэс, барацьба са смерцю. Але гэта яшчэ і адна з самых неабходных у свеце прафесій, якая актыўна развіваецца, асабліва ў апошнія гады. Развіццё медыцыны немагчыма без сучасных тэхналогій у галіне рэанімацыі і анестэзіялогіі. Уся неабходная апаратура, у адпаведнасці са стандартамі, у Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы ёсць. І ўрач анестэзіёлаг-рэаніматолаг павінен разбірацца не толькі ў фізіялогіі, але і ў тэхніцы і электроніцы.



Па словах Уладзіміра Фёдаравіча, паспяховую работу ў аддзяленні забяспечвае ўвесь дружны, стабільны калектыў медработнікаў, у аснове якога вопытныя супрацоўнікі – урачы, медыцынскія сёстры, малодшы медыцынскі персанал.

- За год праз аддзяленне рэанімацыі Шаркаўшчынскай ЦРБ праходзіць у сярэднім каля 500 чалавек, як правіла, да нас людзі паступаюць у вельмі цяжкім, часта беспрытомным стане, – адзначыў Уладзімір Фёдаравіч. - І калі праз некаторы час бачу сваіх былых пацыентаў, якія прайшлі неабходнае лячэнне і вярнуліся да паўнацэннага жыцця, на вуліцах нашага гарадскога пасёлка, разумею, што сваю прафесію я выбраў не дарэмна.



Станіслаў Стома можа ісці ўверх па службовай лесвіцы, але пікам кар’еры лічыць пасаду галоўнага ўрача райбальніцы.

Вялікае шчасце – жыць і працаваць там, дзе зроблены першыя крокі, дзе “з любой травінкай хочацца сябраваць”. Выпускнік Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Станіслаў Стома ў студэнцкія гады цвёрда вырашыў пасля заканчэння вучобы вярнуцца на родную Шаркаўшчыну. Працаваў рэаніматолагам, загадваў аддзяленнем, быў начмедам цэнтральнай раённай бальніцы. Трынаццаты год узначальвае яе. Патрабавальны да сябе і падначаленых, Станіслаў Тадэвушавіч згуртаваў высокапрафесійны калектыў медыцынскіх работнікаў, якія прызнаны лепшым у вобласці, а галоўны ўрач – Чалавекам года Віцебшчыны.

Заслужанымі аўтарытэтам і павагай сярод калег і пацыентаў карыстаецца намеснік галоўнага ўрача Шаркаўшчынскай ЦРБ Мікалай Манкевіч



Шмат гадоў працуе ўрачом-неўролагам Галіна Эдуардаўна Ткачонак.




*За дасягнутыя поспехі ў працы і за вялікі ўклад у развіццё неўралагічнай службы Віцебскай вобласці Галіне Эдуардаўне Ткачонак было ўручана Падзячнае пісьмо ад Віцебскага аддзялення ГА “Беларуская асацыяцыя лекараў”*

Па выніках працы за 2016 год на выніковым медыка-санітарным савеце па анкалогіі раённы лекар-анколаг Міраслаў Генадзьевіч Рымдзёнак узнагароджаны Дыпломам Міністэрства Аховы здароўя Рэспублікі Беларусь за ўклад у развіццё анкалагічнай службы Віцебскай вобласці.



Маладосць лічыцца самым цудоўным перыядам у жыцці: чалавек поўны сіл і энергіі, яму любая справа па плячы. Вельмі важна, калі юнак ці дзяўчына робяць першыя крокі ў самастойнае жыццё, падтрымаць іх добрым словам, падставіць плячо ў складанай сітуацыі. Шаркаўшчынскія медыкі гэта добра разумеюць і дапамагаюць маладым калегам асвоіцца ў працоўных калектывах, пазнаёміцца з прафесійнымі абавязкамі, перадаюць прафесійныя навыкі, даюць парады.

Цэнтральная раённая бальніца сёлета зноў падтрымала традыцыю – ушаноўваць сваіх маладых спецыялістаў на Дні пасвячэння ў прафесію.



Так, калектыў Шаркаўшчынскай ЦРБ у 2017 годзе папоўніўся 15 маладымі спецыялістамі: двума ўрачамі, адзінаццаццю медыцынскімі сёстрамі, адным фельчарам і адным зубным фельчарам.



Урач-тэрапеўт Аляксандр Рымдзёнак, мясцовы хлопец. Родам з вёскі Балбекі. Скончыў Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт, прайшоў інтэрнатуру. “У школе мне лёгка даваліся натуральныя навукі, таму жаданне стаць лекарам з’явілася ў старэйшых класах. Ужо падчас вучобы абраў тэрапію. Па размеркаванні быў накіраваны ў Шаркаўшчынскую ЦРБ, дзе мяне прынялі ў калектыў як роднага. Хачу адзначыць, што ўсіх маладых спецыялістаў прынялі вельмі цёпла: вопытныя калегі ніколі не адмаўляюць у дапамозе, ёсць усё неабходнае для плённай працы, так што першым рабочым месцам задаволены”.



Працэдурная медсястра дзённага стацыянара тэрапеўтычнага аддзялення Маргарыта Белая, з вёскі Наваселле. Скончыла Аршанскі медыцынскі каледж. “Адразу ў мяне ў райбальніцы была стажыроўка, дзе мне ўсё паказалі, расказалі аб выкарыстоўваемых медыкаментах. Калі нешта незразумела, можна спытаць у больш дасведчаных калег. Яны заўсёды гатовыя дапамагчы. Спачатку было складана, але я хутка ўвайшла ў курс спраў. Мне мая праца падабаецца, а гэта галоўнае”.



Зубны доктар Маргарыта Татаровіч, вырасла ў нашым гарадскім пасёлку. З залатым медалём скончыла сярэднюю школу № 2. Калі прыйшоў час выбіраць, куды пайсці вучыцца, яна доўга не разважала і выбрала медыцыну.

Уступныя экзамены атрымалася здаць добра, пасля чаго Маргарыта была залічана ў вядучую вышэйшую медыцынскую навучальную ўстанову ў рэспубліцы – Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт у Мінску.



У бальніцы пяць аддзяленняў, а медперсаналу – амаль 300 чалавек. Сярод іх ёсць некалькі дынастый. Напрыклад, Генрых Качан, адзін са старэйшых медыкаў, і яго сын Павел. Генрых Мікалаевіч – урач-нарколаг і ўрач ультрагукавога выпраменьвання. Сын Павел – хірург, у гэтай установе працуе першы год. Як малады спецыяліст, ён задаволены, што ёсць магчымасць працаваць на сучасным абсталяванні ва ўмовах, якія нічым не саступаюць узроўню сталічных бальніц.

Сучаснае абсталяванне бальніцы-навасёла сапраўды ўражвае. Вось ужо дзе не пашкадавала дзяржава грошай! Ёсць тут і свой “японскі зонд” – апарат відэафібраскоп. І біяхімічны аналізатар для даследвання крыві, імуна-ферментны, аналізатар глюкозы, два апараты ўльтрагукавога выпраменьвання. А што ўжо казаць пра абсталяванне аперацыйных пакояў, рэанімацыйнага блока, таго ж радзільнага аддзялення! Кабінеты ўсіх спецыялістаў забяспечаны камп’ютарамі і неабходным дыягнастычным абсталяваннем.

Нават у псіхатэрапеўтычным аддзяленні, дзе праходзяць курс лячэння ад алкагалізму, нарказалежнасці і тытуню, кабінет забяспечаны апаратам тэстэрапіі.



*Урач- нарколаг К. В. Галай*



*Асаблівы гонар “маладой” бальніцы – водалячэбніца.*

У межах абласной праграмы падааснашчэнні станцый хуткай медыцынскай дапамогі сучаснымі аўтамабілямі для УАЗ “Шаркаўшчынская ЦРБ” набыты новы аўтамабіль хуткай дапамогі.

Новы аўтамабіль хуткай дапамогі дазволіць абслугоўваць пацыентаў згодна з сучаснымі патрабаваннямі. У ім устаноўлены поўны камплект медыцынскага абсталявання для аказання неадкладнай дапамогі на ўзроўні рэанімацыйнага аддзялення раённай або абласной бальніцы. Будзе выкарыстоўвацца для дзяжурства на масавых мерапрыемствах, святах. Таксама мадыфікаваны ён з такім разлікам, каб забяспечыць максімальна зручную транспартацыю хворых нават у цяжкім становішчы і на вялікія адлегласці, калі, напрыклад, трэба даставіць пацыента ў абласную бальніцу ці ў Полацк.



# В Шарковщинской ЦРБ прошло заседание итогового медико-санитарного совета по итогам 2017 года







# В Царковщинской ЦРБ прошли учения по локализации и ликвидации очага болезни, вызванной вирусом эбола



Изменения условий жизни людей, экологии и климата планеты, сложная политическая обстановка и проведение военных действий в отдельных странах привели к тому, что в мире сложилась непростая ситуация по инфекционной заболеваемости. Географическое положение нашей страны, интенсивные миграционные потоки, расширение спектра туристических услуг, развитие международной торговли и бизнеса, проведение массовых спортивных и культурных мероприятий создают условия для осложнения эпидемической ситуации. Для реализации требований Международных медико-санитарных правил и обеспечения санитарно-эпидемиологического благополучия населения, в целях предотвращения заноса, возникновения и распространения инфекционных и массовых неинфекционных заболеваний, их локализации и ликвидации осуществляется комплекс мероприятий по санитарной охране территории Республики Беларусь.

Для обеспечения постоянной готовности к реагированию на чрезвычайные ситуации в области общественного здравоохранения и по инициативе Министерства здравоохранения Республики Беларусь 14 марта в Шарковщинской ЦРБ были проведены учения по локализации и ликвидации очага болезни, вызванной вирусом Эбола, с привлечением работников Шарковщинского райЦГЭ на случай выявления пациентов с симптомами данной лихорадки.

В учениях был задействован персонал приемного покоя, хозяйственная служба, поликлинических отделений ЦРБ. Согласно сценарию учений, пациент обратился в приемный покой с жалобами на головные и мышечные боли, повышение температуры тела до 39,5 градуса, озноб, покраснение конъюнктивы глаз. Из анамнеза установлено что вчера, он вернулся из туристической поездки в Либерию, где находилась на отдыхе в городе Монровия, почувствовав усталость и обратился к врачу.

В ходе учения была организована эвакуация пациента, проведена заключительная дезинфекция, продемонстрирован изолятор для контактных лиц, организовано разграничение территории на заразную и чистую зону путем закрепления ограничительной ленты, организованы посты на входе и выходе с территории больницы, закрыты дополнительные входы.

После правильного выполнения практических и теоретических заданий пациента должны госпитализировать под охраной Госавтоинспекции Шарковщинского РОВД в город Глубокое для дальнейшего лечения.

За проведением учения наблюдала заведующая отделением эпидемиологии особо опасных инфекций Витебского областного центра гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья Елена Валентиновна Повирахова.

Была создана комиссия для проверки теоретических и практических знаний персонала ЦРБ при выявлении пациентов с подозрением на лихорадку Эбола в составе главного врача Шарковщинской ЦРБ Станислава Тадеушевича Стомы, главного государственного санитарного врача Владимира Леонидовича Гращенко и других.

План противоэпидемиологических мероприятий и схемы оповещения при выявлении пациента с лихорадкой Эбола был четко откорректирован.

Елене Валентиновне Повираховой показали, что в случае заражения вирусом Эбола пациентов разместят в специальном изолированном боксе детского отделения. Все дети будут выписаны из больницы, а тяжелобольных переведут в отделение хирургии.

В ходе учений специалисты шарковщинской больницы продемонстрировали высокий уровень подготовки, знание всех практических и теоретических вопросов, отлаженные действия дежурного врача приемного отделения, сотрудников Шарковщинской ЦРБ и Шарковщинского райЦГЭ, а также порядок взаимодействия заинтересованных при возникновении осложнения эпидемиологической ситуации, связанной с регистрацией случая появления вируса Эбола.

По результатам учения Елена Валентиновна Повирахова дала положительную экспертную оценку порядку взаимодействия всех заинтересованных лиц в рамках проведения мероприятий по локализации и ликвидации очага вируса и отметила, что их действия соответствовали требованиям Международных правовых актов, инструктивно-методических писем Министерства здравоохранения Республики Беларусь по вопросам санитарной охраны территории. Также обратила внимание на слаженную работу всех задействованных в учении, служб четкое знание своих функциональных обязанностей специалистами и умение применить их на практике.






## Спіс літаратуры

1. Барыла, А. Работа ў хірургіі не з лёгкіх / А. Барыла // Кліч Радзімы. – 2008. – 14 чэрв. (№ 47). – С. 2.
2. Богданова, А. Больничный соловей /А. Богданова // Медидинский весник. – 2008. – 12 июля.
3. Латышонак, Л. Галоўнае ў рабоце – прафесіяналізм і спагада /Л. Латышонак // Кліч Радзімы. – 2005. – 18 чэрв. (№ 49). – С. 2.
4. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с, іл.
5. Стома, С. Вам удзячны людзі / С. Стома // Кліч Радзімы. – 2008. – 14 чэрв. (№ 47). – С. 2.
6. Чарняўская, В. Жыву ў згодзе са сваёй душой: [Р. С. Райчонак] / В. Чарняўская // Кліч Радзімы. – 2016. – 18 чэрв. (№ 48). – С. 2.

# Чыгуначная станцыя “Шаркаўшчызна”

У 2014 годзе спаўняецца 77 год, як у нашым гарадскім пасёлку пачала працаваць чыгуначная станцыя “Шаркаўшчызна”. Пабудавана ў далёкім 1937 годзе, калі Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад Польшчы, чыгунка і зараз эфектыўна спраўляецца з асноўнымі сваімі функцыямі – перавозкай пасажыраў і грузаў.

Немалы адрэзак часу, а менавіта 36 гадоў, працуе тут Віктар Аляксандравіч Лабуць, які з 1990 года ўзначальвае станцыю, кіруе калектывам, клапоціцца пра матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне арганізацыі, пільна сочыць за надзейным рухам цягнікоў. Ад зладжанай працы спецыялістаў і рабочых напрамую залежыць бесперабойны рух таварных і пасажырскіх саставаў, якія штодзённа прыбываюць на станцыю “Шаркаўшчызна” і адпраўляюцца з яе ў далёкія шляхі па чыгуначных рэйках краіны.



*Спецыялісты і рабочыя шаркаўшчынскай чыгункі*

Начальнік станцыі Віктар Аляксандравіч Лабуць у 2016 годзе ўзнагароджаны нагрудным знакам "Выдатнік беларускай чыгункі".

Пры выкананні паказчыкаў вялікі вопыт работы, безумоўна, дапамагае, але галоўная – гэта падтрымка калег, - адзначыў начальнік станцыі Шаркаўшчызна В.А. Лабуць. – І атрыманая ўзнагарода – рэзультат агульнай працы. Сумленна і аператыўна выконваюць сваю работу дзяжурныя Яўген Іванавіч Лабуць, Алег Уладзіміравіч Васільеў, Ірына Уладзіміраўна Максімава. Належным чынам свае абавязкі выконвае спецыяліст таварнай канторы Юлія Яўгенаўна Бабчонак. За надзейнасць апаратуры на станцыі нясе адказнасць механік дыстанцыі сігналізацыі і сувязі Павел Раманавіч Палялейка. Паспяхова арганізавана работа прафсаюзнай арганізацыі, якую ўзначальвае Ірына Уладзіміраўна Максімава

Увечары, асабліва ў цёплую пару года, людзі з задавальненнем чакаюць пасажырскі цягнік на тэрыторыі станцыі, дзе заўсёды адчуваецца клапатлівая рука станцыйнай рабочай Наталлі Чаславаўны Буйка. На прыгожых клумбах – вялікая колькасць кветак і дэкаратыўных раслін, кусты і трава акуратна падстрыжаны, дарожкі і платформы падмецены.



# 2017 год



*калектыў Шаркаўшчызненскага вытворчага ўчастка “Віцебскгрузсэрвіс”*

Першая палова месяца для калектыву Шаркаўшчызненскага вытворчага ўчастка “Віцебскгрузсэрвіс” амаль заўсёды – самы напружаны перыяд работы. З Беларусі і Украіны ў наш гарадскі пасёлак практычна кожны дзень па чыгунцы прыходзяць грузы – цяжкавагавыя і сыпучыя матэрыялы, у асноўным прызначаныя для правядзення будаўнічых работ на тэрыторыі нашага і суседніх Міёрскага і Браслаўскага раёнаў.

У вызначаныя тэрміны, згодна з заключанымі з заказчыкамі дамоўленасцямі, вагоны будуць разгружаны, зачышчаны і накіраваны на месца свайго далейшага назначэння, — паведаміў майстар пагрузачна-разгрузачных работ Шаркаўшчызненскага вытворчага ўчастка “Віцебскгрузсэрвіс” Юрый Віктаравіч Грэцкі. Ён не першы год працуе ў калектыве і не сумняваецца ў адказнасці і прафесіяналізме работнікаў. Дзякуючы сумленным адносінам да працы, план пагрузачна-разгрузачных работ, які на сённяшні дзень складае 15 тысяч тон, рэгулярна выконваецца. Толькі ў ліпені было разгружана 133 вагоны. А па выніках работы за першае паўгоддзе бягучага года калектыў Шаркаўшчызненскага вытворчага ўчастка “Віцебскгрузсэрвіс”, які ўваходзіць у склад УП “Віцебскае аддзяленне Беларускай чыгункі “Віцебскгрузсэрвіс”, заваяваў першае месца сярод іншых брыгад сваёй арганізацыі. Імя стропальшчыка Валерыя Анатольевіча Кураша занесена на Дошку гонару прадпрыемства. На добрым рахунку і іншыя работнікі калектыву. Гэта вадзіцель трактарнага пагрузчыка Сяргей Аляксандравіч Дуброўскі, машыніст крана Мікалай Дзмітрыевіч Цітовіч, грузчыкі Аляксандр Аляксандравіч Мацыль і Юрый Мікалаевіч Язёнак. Усе яны ведаюць сваю справу і з вялікай адказнасцю выконваюць ускладзеныя на іх абавязкі. Кожны зацікаўлены ў выкананні даведзеных аб’ёмаў, бо заработная плата здзельная. Прастояў не бывае. Пры неабходнасці брыгада Шаркаўшчызненскага ўчастка накіроўваецца на працу ў іншыя раёны, дзе іх калегі не паспяваюць своечасова завяршыць разгрузку.

# Из истории школ г.п. Шарковщина



В 1863 году открылось Старошарковщинское народное училище Игуменовской волости. Оно помещалось в общественном доме. Школа состояла из трёх отделений. Занятия начались в ноябре и заканчивались в апреле. В дни церковных праздников школа не работала. На содержаниеучилища отпускалось 200 рублей в год из госказны.

В 1886 году в Старой Шарковщине действовало земское народное училище, в котором обучалось 33 мальчика.

После окончания Шарковщинской семилетки лучшие ученики поступали в гимназию (Дисна), носили форму, имели удостоверение.



17 сентября 1939г. Шарковщина была освобождена от бело-польской оккупации. Люди очень ждали этого события. В школе всех учащихся «отсадили» на 1 класс назад. Евреи перегородили школу на 2 части и занимались в одной половине, к ним ходил раввин и работали свои еврейские учителя, к русским и белорусским ученикам священники не ходили. Директором школы был Валериан Кондратьевич Латышенок.

В 1934 г. В Шарковщине по ул.Энгельса (поворот на больницу) была построена новая семилетняя школа. Она была П-образная, деревянная, одноэтажная.

В 1944 году во время войны школа сгорела. Во время войны, заведующим отделом образования был Хвощинский, а его сын Борис Карпович преподавал белорусский язык и литературу, вспоминают, что был он фанатиком своего дела, собирал вместе с учениками белорусский фольклор. Через год здание школы заняли литовцы и немцы, в нем разместился литовский военный корпус, который охранял дорогу от партизан. Школу (4 класса) поместили на втором этаже здания, где сейчас располагается милиция. На первом этаже располагалась немецкая комендатура. Ещё 4 класса занимались около реки в доме, хозяев которого, евреев переселили в гетто. Сейчас напротив этого дома располагается летний амфитеатр. В школе немцы насаждали свою идеологию, вместе с русским и белорусским языком преподавали немецкий, лучшим ученикам дарили фотографии Адольфа Гитлера. Новый учебный год 1944/45 начали в двух зданиях (в настоящее время на этом месте построен костел).



*Здание, в котором была школа после войны*



*Первый послевоенный выпуск*

В 1949 г. началось строительство новой школы, которая была открыта в 1952 г.



*Первым директором стал Мишкутенок Дмитрий Степанович (1952-1961 гг.)*



*Радьков Петр Ильич работал директором до 1966 года*



*Игнатиков Иван Маркович (1966-1968гг.)*



В 1973 г. вступила в действие новая школа – Шарковщинская СШ №1, директор Костюкевич Мария Александровна и часть коллектива учеников и учащихся перешли в здание новой школы. Порог школы тогда переступили 980 учащихся.



**Костюкевич Мария Александровна** – заслуженная учительница БССР, ветеран Великой Отечественной войны, с 1942 по май 1945 года фронтовая медсестра, награждена орденами и медалями, после войны посвятила себя школе. Работала директором, проявила себя как талантливый руководитель и организатор. Большая работа была проведена по озеленению школьной территории, посажена аллея каштанов, лип, разбиты цветники.



**Павлюков Иван Иванович** руководил учительским и ученическим коллективом по благоустройству школьной территории, здания школы, кабинетов. Работала ученическая производственная бригада в колхозе им. Гагарина. Большая работа проводилась по профориентации учащихся на сельхозпрофессии: встречи с ветеранами и передовиками производства, создавались летописи подшефных хозяйств. Значительное внимание уделялось организации походов по местам боевой и трудовой славы, активизировалась экскурсионная работа.



**Бурчик Елена Генриховна** – Отличник Просвещения БССР, хорошо знала перспективу школы, умело руководила ученическим и учительским коллективами. По ее инициативе был создан музей В.И.Ленина, народного творчества, проведено эстетическое оформление школы, открыт гардероб, построена теплица, благоустроена школьная территория. Каждый третий выпускник поступал в ВУЗы, количество хорошистов составляло 40%. Школа заняла первое место по итогам соцсоревнования, одна из лучших школ областии в здание новой школы. Порог школы тогда переступили 980 учащихся.



**Косаревская Лилия Александровна** – Отличник Просвещения РБ. Под ее творческим руководством школа преобразилась, оформлены рекреации 1 и 2 этажей, появилась театральная гостиная, создан художественный салон «Лира», собран богатый краеведческий материал, большое внимание уделялось экологическому воспитанию школьников. Внедрялись новейшие педагогические технологии – Дальтон-технология, французские мастерские, проектные технологии. В 1998 году открыты лицейские классы, родилась традиция – вечер «Посвящение в лицеисты», родился школьный гимн. Педагогический и ученический коллектив работали слажено, творчески, стремились внедрять все новое.



**Кондратьев Александр Авимович** – Отличник Просвещения РБ. Большая работа проводилась по облагораживанию школьной территории, разбиты цветники, созданы малые архитектурные формы, пруды, мостики. Эстетически оформлены школьные этажи. Художник Виктор Крук создал панораму Шарковщинской природы «Черное озеро», картину-иллюминатор «Подводный мир реки «Дисна», панно «Уршуля Радзивилл – основательница белорусского театра». До 2008 года работали лицейские классы, углубленные классы по математике и английскому языку. Высокий процент (до 40%) поступления выпускников в ВУЗы. Ежегодно 2-3 победителя областных олимпиад. Школа участвовала во всех спортивных, туристических, интеллектуальных конкурсах, краеведческих смотрах, художественной самодеятельности – везде занимала призовые места. Кондратьев А.А. избран депутатом районного совета



**Зайцева Мария Александровна** активизировала работу детских общественных организаций; большое внимание уделяла подготовке и проведению родительских собраний, выбору разнообразных форм работы с родителями в классе; акцент делала на индивидуальную работу с учащимися из неполных и многодетных семей, с детьми, находящимися в СОПе. Учащиеся школы успешно выступали на районных, областных и республиканских олимпиадах и конкурсах



Са жніўня 2013 года прызначаны на пасаду дырэктара Шаркаўшчынскай СШ № 1 Сяргей Рафаілавіч Ганебны, свой працоўны шлях пасля заканчэння фізічнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педуніверсітэта карэнны шаркаўчанін пачынаў у Ямненскай школе. Потым была праца у Гуркаўскай школе, інспектарам раённага аддзела адукацыі, больш за 20 гдоў прысвяціў Вялікасельскай школе.

Шаркаўшчынская СШ № 1 – адна з самых вялікіх школ у раёне, педагагічны калектыў якой налічвае 70 чалавек, а колькасць вучняў 670.

У 2014 годзе школа адсвяткавала 40-гадовы юбілей.

# Учительская судьба семьи Игнатиковых





Промчались зимы с веснами,
Давно мы стали взрослыми,
Но помним наши школьные деньки.
Плывут морями грозными,
Летят путями звездными
Любящие Вас ученики.

Недавно в средней школе № 1 горпоселка прошел традиционный вечер встречи выпускников. В празднично оформленном зале не было свободных мест. На мероприятие собрались бывшие одноклассники. Каждый вспоминал свой класс, своего учителя. Очень многие тепло отзывались об учительской семье Игнатиковых — Ивана Марковича и Тамары Григорьевны. И не удивительно. Эта семья — образец преданности учительскому труду. В их трудовых книжках всего одна запись: работа в средней школе № 1.

Иван Маркович после окончания Гомельского высшего учебного заведения, а Тамара Григорьевна — Полоцкого государственного университета по распределению были направлены в первую школу, чтобы учить школьников физике и математике. В нашем районе они соединили свои судьбы, создали крепкую семью. Их дочь Ирина пошла по стопам родителей, закончила факультет прикладной математики Белорусского государственного университета. У своих родителей она научилась трудолюбию, ответственности, добру и справедливости. Главное, что объединяло эту семью — это любовь к своему делу, ответственность за судьбы детей.

Эти эрудированные, грамотные педагоги находились в постоянном поиске, их заботила судьба каждого ученика. Они несли ребятам не только знания по предмету, но и пробуждали в них тягу к духовному росту. Их семья была активна во всем: в художественной самодеятельности, в работе с родителями, в лекционной пропаганде, в спорте и туристических походах.

На школьном вечере выпускница 1966 года Богуслава Василевская вспоминала туристические походы класса с завучем школы Иваном Марковичем, который учил строить шалаш, разжигать костер, спасаться от змей. Она отметила, что Игнатиковы — наставники от Бога и учителя с большой буквы. Они давали прочные знания, проводили исследовательские работы и творческие эксперименты. Так, молодой инициативный математик Иван Маркович стал завучем в СШ № 1 и проработал в этой должности 36 лет. За свой добросовестный труд награжден многочисленными грамотами, медалью «За доблестный труд в ознаменование 100-летия со дня рождения В. И. Ленина», медалью «Ветеран труда», знаком «Отличник просвещения БССР». К сожалению, Иван Маркович ушел из жизни. Но память о нем живет в сердцах у многих выпускников.

Тамара Григорьевна — верная соратница и спутница своего мужа. Ее педагогический стаж насчитывает 35 лет. Редко встретишь человека, который предан своему труду так самоотверженно, как Тамара Григорьевна. Для нее любой урок был как планета, которую нужно открыть и понять. Каждому своему школьному занятию она придавала большое воспитательное значение. Казалось бы, физика — сложный предмет, однако на ее уроках всегда было интересно и никогда не было однообразия. Лекции, диспуты, семинары. Вот лишь немногие формы проведения занятий. Тамара Григорьевна очень любит свой предмет, считает, что лучше профессии учителя на свете ничего нет.

У семьи Игнатиковых немало последователей среди учеников. Многие выпускники работают сегодня учителями математики и физики в разных уголках нашей страны. Об этом свидетельствуют открытки, телефонные звонки, которые приходят в дом Игнатиковых накануне традиционных учительских праздников. Большинство ее учеников стали достойными и уважаемыми людьми. За все годы работы у Тамары Григорьевны было семь выпусков. С особой теплотой она вспоминает выпускников 1974 года Нину Бедрицкую, Людмилу Богович, а из выпуска 1990 года называет своих любознательных учеников Дмитрия Михайлова, Жанну Разводовскую, Валентина Крука, Любовь Минькову, которых она вводила в интересный мир физики.

За свой многолетний и добросовестный труд Тамара Григорьевна награждена почетными грамотами Министерства просвещения. Ей присвоено знание «Старший учитель». Она единственная учительница в нашем районе, которая носит звание «Отличник просвещения СССР».

С огромной благодарностью вспоминают ее учителя школы Тамара Рафаиловна Буко и Сергей Рафаилович Ганебный, которые связали свою жизнь с физикой.

Признательность Тамаре Григорьевне выражают ученики, учителя, выпускники школы, учителя-ветераны Галина Николаевна Стовманенко, Раиса Аркадьевна Лазовик, Ядвига Болеславовна Червинская, которые пронесли чувство дружбы и уважения к Вашей семье через всю свою жизнь.

Ваши ученики уверены, что Вы являетесь образцом верности и преданности своей профессии.

# Паспяхова выступілі юныя фізікі з Шаркаўшчынскай СШ №1 на турніры ў Віцебску




У другой палове зімы Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі праводзіў абласны турнір юных фізікаў. Зборная каманда школьнікаў СШ №1 прайшла перад гэтым адборачны тур і была запрошана на спаборніцтвы. Пра яе паспяховы ўдзел у турніры нам расказаў кіраўнік каманды, настаўнік фізікі СШ №1 Барыс Серафімавіч Лонскі:

– Трэба сказаць, што каманды ў турніры ўдзельнічалі вельмі моцныя: тры Віцебскія гімназіі прыслалі сваіх прадстаўнікоў, дзве школы Віцебска, а таксама прыехала на турнір каманда з Талачына. Конкурс праводзіўся ў некалькі этапаў. Спачатку былі адборачныя туры, дзе ўдзельнікі каманд паказвалі майстэрства у вядзенні дыскусіі, умела абаранялі сваю кропку гледжання, давалі аргументаваныя адказы на пытанні апанентаў і рэцэнзентаў, членаў журы, дэманстравалі графікі і прэзентацыі, відэаролікі з праведзенымі даследаваннямі. Наша каманда тут выступіла ўпэўнена і выйшла ў фінал. Неверагодна! На гэты турнір мы патрапілі ўпершыню і стараліся ўсё рабіць так, каб не быць апошнімі, а тут – фінал. Заключны этап праходзіў вельмі напружана. Кожнае выступленне каманд вызначалася творчым падыходам, няпростымі пытаннямі апанентаў, патрабавальнасцю рэцэнзентаў. А у іншым ніхто і не сумняваўся – гэта ж фінал! І вось, нарэшце, фінал скончаны. Усе ў чаканні рашэння журы. Ура! У нас дыплом ІІ ступені. Гэта вялікі поспех для нашай каманды у турніры такога кшталту. А бясспрэчным лідарам і пераможцай турніру стала зборная юных фізікаў гімназіі №5 г.Віцебска.

Цёпла і шчыра павіншавала нашу каманду адзін з арганізатараў турніру, кіраўнік каманды-пераможцы Ніка Генадзьеўна Цішчанака.

“Шаркаўшчына, вы здзівілі нас усіх!” – сказала яна.

А вось склад нашай “зорнай” каманды: Рыгор Скурат (9 Б), Арцём Данчыкаў (9 А), Дзмітрый Курэц (9 А), Макар Пундзіс (11 Б), Павел Януш (11 Б), Максім Курушка (11 Б). Поспех у інтэлектуальных спаборніцтвах прынесла нам тое, што ў нас была дружная каманда і ўсе цяжкасці мы пераадольвалі разам, падтрымліваючы адзін аднаго.

Сімвалічна, што абласны турнір юных фізікаў праходзіў у Дзень беларускай навукі. Фізіка – навука эксперыментальная. У аснове яе ляжаць назіранні і доследы, і арганізацыя даследчай дзейнасці вучняў пры вывучэнні фізікі – неабходны фактар, які дазваляе павысіць цікаўнасць да фізічнай навукі, зрабіць яе займальнай і карыснай, усвядоміць, што фізіка – гэта не страшна, фізіка – гэта цікава.



# Яе сэрца саграваае звонкі смех дзяцей (пра настаўніцу Шаркаўшчынскай СШ №1 Рамуальду Антонаўну Бацвінёнак)




Што патрэбна нашай школе? Рэформы і новыя праграмы? Камп’ютары і інтэрнет? У першую чаргу добрыя настаўнікі — і гэта, відавочна, галоўны прынцып, па якім мы вызначаем якасць навучання. І ўсё ж якім павінен быць добры настаўнік, часам няпроста адказаць нават самому сабе. Ён можа быць розным: і вопытным харызматычным педагогам з добрым сэрцам, і жвавым, непаседлівым выпускніком універсітэта. Галоўнае, каб гэта быў чалавек на сваім месцы. Кампетэнтны, уважлівы да вучняў і іх інтарэсаў, здольны перадаваць трывалыя веды. Каб жаданне вучыцца не знікала ў дзяцей не толькі да самага заканчэння школы, але і на працягу ўсяго жыцця.

Шаркаўшчынскай сярэдняй школе № 1 заўсёды шанцавала на выдатных педагогаў, — упэўнена настаўніца рускай мовы і літаратуры Рамуальда Антонаўна Бацвінёнак. У старэйшых калег, будучы яшчэ маладым спецыялістам, яна пераймала вопыт, з многімі працавала побач не адзін дзясятак гадоў. Сама ж педагог вось ужо на працягу 28 гадоў выпускае ў дарослае жыццё сваіх самых лепшых вучняў. Такімі словамі ўсіх, каго вучыла, называе сама настаўніца, упэўненая ў тым, што не толькі веды па прадметах, але і ўрокі сумлення, правілы жыцця яе хлопчыкі і дзяўчынкі запомняць надоўга. І сёння ўжо былыя выпускнікі Рамуальды Антонаўны прыводзяць у сярэднюю школу № 1 сваіх дзяцей. І сэрца цудоўнай настаўніцы па-ранейшаму сагравае звонкі дзіцячы смех і сонечныя ўсмешкі хлопчыкаў і дзяўчынак.

Расказваючы пра працу ў школе з асаблівай цеплынёй і гонарам за сваіх вучняў, Рамуальда Антонаўна называе шмат прозвішчаў сваіх выпускнікоў. Сярод іх і былыя вучні — першыя пераможцы абласных прадметных алімпіяд па рускай мове, якіх падрыхтавала настаўніца, Марына Зуй і Яўген Гарбузаў, і вучаніца 8 класа Вера Новікава, якая ў гэтым навучальным годзе прымала ўдзел у раённай прадметнай алімпіядзе за 9 клас і заваявала дыплом другой ступені. Прозвішчы сваіх лепшых вучняў Рамуальда Антонаўна можа называць бясконца — іх і сапраўды вельмі шмат. У 1985 годзе гераіня гэтага матэрыяла ўпершыню пераступіла парог Шаркаўшчынскай СШ № 1, спачатку ў якасці піянерважатай, а потым настаўніцы рускай мовы і літаратуры, і засталася ў школе на ўсё жыццё.

Разам з мужам Юрыем Раманавічам Рамуальда Антонаўна выхавала двух сыноў, Яўгена і Віктара, цяпер яны ўжо дарослыя. Амаль 5 гадоў назад адна з лепшых настаўніц Шаркаўшчынскай сярэдняй школы № 1 упершыню прымерала на сябе і яшчэ адну ролю — бабулі, калі ў сына Яўгена і нявесткі Надзеі нарадзілася маленькая Міраслава — любімая і пакуль што адзіная ўнучка Рамуальды Антонаўны.

Напярэдадні самага доўгачаканага жаночага свята, Дня 8 Сакавіка, Рамуальда Антонаўна праз раённую газету павіншавала ўсіх сваіх калег-настаўніц, маці і сястру, сваіх вучаніц, родных, знаёмых і ўсіх цудоўных жанчын шаркаўшчынскага краю. Нягледзячы на яшчэ зусім зімовае надвор’е, менавіта гэты дзень асвечаны ўсмешкамі мільёнаў жанчын, расквечаны яскравымі колерамі першых вясновых кветак і сагрэты самымі прыгожымі словамі ў адрас чароўнай паловы чалавецтва.

— Ад усёй душы жадаю ўсім нашым жанчынам усяго, што напаўняе іх жыццё шчасцем: узаемнага кахання, дружнай сям’і, вернага сяброўства, здароўя, міру і дабрабыту. А вясна няхай прыносіць з сабою новыя радасці і выдатны настрой, — адзначыла напрыканцы размовы мая суразмоўца. З задавальненнем далучаемся да ўсіх пажаданняў.

# Шарковщинская средняя школа № 2



В 1989 году средняя школа № 2 впервые распахнула свои двери перед новыми учениками. Возглавляла школу Ядвига Болеславовна Червинская. Год 2014 – юбилейный год для педагогов-ветеранов: Анны Фоминичны Полелейко, Олега Филлиповича Струя, Веры Петровны Татарович, Ларисы Васильевны Крук, Елены Ивановны Лукьянёнок, Веры Петровны Мартинкевич.

За все годы существования школы в её стенах среднее образование получили 908 человек. В активе школы 31 золотой и 25 серебряных медалистов.

Сейчас в школе трудятся педагогами два её выпускника: Оксана Леонидовна Терешко, Ирина Альфонсовна Циунель.

Гордостью школы является один из выпускников 1993 года Павел Семёнович Гринчук, который недавно стал носить почётное звание доктора физико-математических наук, является заведующим отделением тепло-физики института тепло и массообмена НАН РБ.

С 2003 по 2016 год возглавляла школу Олеся Ивановна Сикора.





*Новый учебный год 2016-17 стартовал под руководством*
*Андрея Ивановича Татаровича.*

Спіс літаратуры:


1. Бурэц, А. Падзяка за работу:[Я. Б.Чарвінская] / А. Бурэц // Кліч Радзімы. – 2013. – 12 верас. (№ 77). – С. 1.
2. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с., іл.
3. Райчонак, С. Адзначаны прафесіяналы педагагічнай нівы / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2014. – 3 верас. (№ 70). – С.2.
4. Чарняўская, В. Заслужаныя ўзнагароды і кветкі – таленавітым настаўнікам / В. Чарняўская. – 2 верас. (№ 70). – С.1-2.